№ 11 (369) 19 сакавіка 2004 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Аднаўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

Рыгор Барадулін

## БНР!

**БНР –**
**Бог, Народ, Радзіма.**
**БНР –**
**Быць Надзеі Ранішняй!**
**У змаганцаў перад вачыма**
**Беларушчыны сэрца параненае.**

**Разгараецца на суравеях стагодзьдзяў**
**Бел-Чырвона-Белае полымя,**
**Кладкі палячы здрадлівай згодзе.**
**Вернасьць і непахіснасьць супольныя.**

**Рве свабода варожыя сковы,**
**Прэчыць крылы зграяў абскублыя.**
**Санцавеецца воблік вясновы**
**Беларускай Народнай Рэспублікі!**

сакавік 2004

### Беларусь будзе наступнаю

Артыкул Вацлава Гаўла.

старонка 2

### Нэмэзыда або кат?

Канстытуцыйны суд дазволіў не расстрэльваць.

старонка 3

### «NRM» як Багушэвіч, «J_Mors» як Неслухоўскі,

растаманы новага пакаленьня... Новыя музычныя дыскі.

старонка 12

### Латвія абурана «Аскафэнам»

МЗС Латвіі ў сераду накіраваў Беларусі ноту пратэсту ў сувязі з масавым атручаньнем грамадзянаў абязбольвальным прэпаратам «Аскафэн П» вытворчасьці «Белмэдпрэпаратаў». 24 чалавекі, якія прымалі лекі, мелі праблемы са здароўем, а трое трапілі ў кому. У адной з партыяў «Аскафэну П» утрымліваўся глібэнклямід, з дапамогай якога лечаць дыябэтыкаў. А ў здаровых людзей гэта выклікала рэзкае зьніжэньне ўзроўню цукру ў крыві.

### Ярмошын вярнуўся на радзіму

Экс-прэм’ер Уладзімер Ярмошын зьехаў жыць у Маскву, дзе ўладкаваўся намесьнікам гендырэктара па капітальным будаўніцтве тэлезаводу «Рубін». Галоўны будаўнік Масквы, першы намесьнік мэра Ўладзімер Рэсін — ягоны добры знаёмы.

### Лукашэнка ў славенскім замку

Славенскае МЗС пацьвердзіла, што да 16 сакавіка ў краіне неафіцыйна гасьцяваў Аляксандар Лукашэнка. Паводле Люблянскай тэлекампаніі POP TV, яго запрасіў бізнэсовец Янэз Шкрабец — дырэктар люблянскай фірмы «Riko», якая выпускае зборныя дамы. Ён жа арганізаваў сустрэчу Лукашэнкі з былым славенскім прэзыдэнтам Міланам Кучанам. Паводле інфармацыі прэс-сакратара А.Лукашэнкі, размова ішла «пра будучыню Эўразьвязу пасьля ягонага пашырэньня». Жыў Лукашэнка ў прэзыдэнцкім люксе замку Брдо ў ваколіцах гарналыжнага курорту Крваўцу. Ноч у замку каштуе 858 эўра. Славенская апазыцыя скрытыкавала выдачу візы беларускаму лідэру.

### Гамельчукі найздаравейшыя

Прызыўная кампанія засьведчыла, што самае моцнае здароўе маюць прызыўнікі з Гомельшчыны. Там прыдатнымі да службы прызналі 76% хлапцоў. Увогуле ж у краіне мэдкамісіі забракавалі кожнага трэцяга з 13 тыс. навабранцаў.

**СМ; БелаПАН**

# Дзень Волі



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Аўтары даведніка «Беларускі штогоднік’2003» назвалі ліцэістаў «калектыўным тварам году». Старонка 3.**

## Выклікі для нашае нацыі

### Старшыня Рады БНР Івонка Сурвілла адказвае на пытаньні «Нашай Нівы»

**«НН»: Якія заваёвы і дасягненьні, тварэньні й удачы беларусаў за апошні год бачацца Вам найбольш важнымі?**

**Івонка Сурвілла:** Ня так даўно, адказваючы на пытаньні агенцтва БелаПАН, я казала пра тры найважнейшыя нашыя праблемы. Гэта — Расея, Лукашэнка і разьяднаная апазыцыя.

Хаця супрацоўніцтва з Расеяй і надалей патрэбнае саюзьнікам у змаганьні супраць тэрарызму, выглядае, што Захад раптоўна прыгадаў пра Чачэнію, выступіў у падтрымку Грузіі і пачаў нарэшце бачыць «расейскі фактар» у шматлікіх падзеях, якія адбываюцца ў суседніх краінах, у тым ліку і ў Беларусі. Ёсьць падставы меркаваць, што пазыцыя Вашынгтону зьмянілася.

Сапраўдным задавальненьнем была для мяне канфэрэнцыя ў Рызе, у значнай меры прысьвечаная Беларусі. Неўзабаве адбудзецца канфэрэнцыя ў Празе. Дарэчы, зь вялікай прыемнасьцю даведалася, што Вацлаў Гавал перадаў атрыманую ім узнагароду рэдактару «Нашай Нівы».

Што да Лукашэнкі, дык сам той факт, што ён ужывае аргумэнт незалежнасьці, каб абараніць сваю пазыцыю, — паказальны. Хоць у Расеі ўсё яшчэ гавораць пра супольны — расейскі — рубель, думаю, што Лукашэнку ён у гэтым моманце не ў галаве. Безумоўна, няведама, што яшчэ можа стацца за наступныя месяцы. Дый Незалежнасьць для Лукашэнкі — гэта, паўтару, толькі фактар утрыманьня ўлады. Але нават выбары Пуціна ў Расеі могуць аказацца для Беларусі момантам пазытыўным.

Разам з праблемай дастаўкі газу гэта, магчыма, дазволіць нашаму народу пабачыць сапраўдны твар і Расеі, і яе прэзыдэнта.

Апазыцыя, як падаецца, мацнее. Хоць у добразычлівасьць камуністаў у дачыненьні да Незалежнасьці Беларусі неяк цяжка верыць, бо ўся папярэдняя гісторыя кампартыі сьведчыць пра адваротнае. І ўсё ж намер змагацца разам за зьмены — факт пазытыўны. Спадзяюся, што ўся апазыцыя будзе гаварыць адным голасам, у абарону незалежнасьці і дабрабыту Беларусі.

Працяг на старонцы 9.

## Шварцэнэгеры беларускіх Каліфорніяў

**У Амэрыцы менавіта яны найчасьцей становяцца кандыдатамі ў прэзыдэнты. Аднак тамака іх не прызначаюць, а выбіраюць. Нашы вобласьці — ня штаты. У слове «аблвыканкам» галоўная частка — «выканаўчы». Вэртыкальны стрыжань у хрыбце не дае кіраўнікам разагнуцца. Прызначаныя зьверху, яны толькі «верху» падкантрольныя і на папулярнасьць у народзе могуць не зважаць. Інакш ці ўтрымаўся б у Гародні Ўладзімер Саўчанка? І ці лез бы ваўкавыскі Барыс Батура ў Магілёў? У Амэрыцы яны былі б губэрнатарамі. Хто яны ў Беларусі? Постаці кіраўнікоў абласьцей у артыкуле Зьмітра Дрыгайлы — старонкі 4—5.**

### Апошнія дні падпіскі

Падпісны індэкс 63125. Падпіску прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку» ды ў прыватным агенцтве «Эй Бі ПрэсСэрвіс». Цана на месяц — 2580 рублёў на поштах або 1800 рублёў на шапікі «Белсаюздруку». Падпіска на другі квартал прымаецца да 19 сакавіка. Дык падпісвайся!



Вацлаў Гавал

# Беларусь будзе наступнаю

У хуткім часе восем краінаў былога камуністычнага блёку стануць новымі сябрамі Эўрапейскага зьвязу. Адбудзецца падзея, якую да нядаўняга часу амаль ніхто ня мог сабе ўявіць. Краіны, у якіх яшчэ 15 гадоў таму панаваў таталітарны рэжым, што прыціскаў асноўныя правы і свабоды чалавека; краіны, лёсы якіх вызначала вузкае кола людзей пасрэдніцтвам адзінай дзяржаўнай палітычнай партыі, абапертай на ўзброеныя сілы, — гэтыя краіны стануць часткай гістарычна першага наднацыянальнага згуртаваньня, заснаванага на прынцыпах сапраўднае дэмакратыі, вызнаньня адных і тых жа каштоўнасьцяў і ўзаемнай адказнасьці за будучыню ўсяго кантынэнту. Умовай, на аснове якой краіны Цэнтральнае і Ўсходняе Эўропы ўвогуле маглі прэтэндаваць на ўваход у Зьвяз, было прыняцьце прынцыпаў дэмакратыі і прававой дзяржавы.

Усходнім суседам пашыранага Эўразьвязу будзе таксама і Беларусь. 10 гадоў аўтакратычнае ўлады Аляксандра Лукашэнкі прывялі краіну да глыбокае палітычнае ізаляцыі. Аднак гэта не павінна закранаць тых, хто жадае супрацоўнічаць з Эўропай.

Адной з характэрных прыкметаў несвабоднага рэжыму зьяўляецца непрымальнае насельніцтвам грамадзкай актыўнасьці і закрытасьць перад усімі праявамі неабыякавасьці і супольнай адказнасьці за грамадзкія справы. Менавіта гэта й адбываецца сёньня ў Беларусі. Яе грамадзяне штодня сутыкаюцца з парушэньнем сваіх асноўных правоў на свабоду распаўсюду інфармацыі і свабоду выказваньня. Суды над беларускімі вальнадумцамі, перасьлед іх па месцы працы ці навучаньня сталіся звычайнаю зьявао, як і ўнясеньне зьменаў у заканадаўства з мэтаю абмежаваньня свабодаў. Калі ва ўмовах несвабоды рэпрэсіі й карупцыя ўспрымаюцца як грамадзка-палітычная норма, пашыраецца погляд, што кожны мусіць перадусім клапаціцца пра сябе сам, што займацца грамадзкай дзейнасьцю бессэнсоўна і што судовы перасьлед суграмадзянаў ці ўрэшце іх зьнікненьне зьяўляецца вынікам легкадумнасьці саміх гэтых грамадзянаў. Меркаваньне, што Беларусь — гэта супольнасьць грамадзянаў, якія зьмірыліся са сваім лёсам, абвяргаецца дзейнасьцю шэрагу актывістаў і грамадзкіх аб’яднаньняў. Прэзыдэнт Лукашэнка добра ведае, што менавіта апошнія зьяўляюцца найбольшымі праціўнікамі карупцыі і зародкам насамрэч свабоднага волевыяўленьня, якое пазьней можа паступова перарасьці ў свабодныя выбары. Іншымі словамі, свабодная будучыня Беларусі залежыць ад сёньняшняй актыўнасьці незалежных грамадзкіх ініцыятываў.

На першы погляд, Беларусь арыентуецца на традыцыйна шчыльныя сувязі з Расеяй ды мала цікавіцца Эўропай. Аднак вырастае пакаленьне, якое бачыць сваю будучыню менавіта ў Эўразьвязе. Да яго перш за ўсё належаць тыя, хто, ахвяруючы ўласным камфортам, а часта і бясьпекай, імкнецца зьвярнуць увагу грамадзтва на карупцыю, хлусьню ды дэзінфармацыю, якую распаўсюджвае афіцыёз. Як і ў выпадку чэхаславацкіх, польскіх ці вугорскіх дысыдэнтаў, размова ідзе пра меншасьць, уплыў якой, здавалася б, мінімальны, а шанцы на папулярызацыю лепшых ідэяў — мізэрныя. Мабыць, гэтым уражаньнем і сілкуецца няпэўнасьць і скептыцызм эўрапейцаў у ацэнцы пэрспэктываў Беларусі, а таксама і пэўная разгубленасьць перад абліччам новага суседа.

Калі раней на існаваньне лукашэнкаўскага рэжыму Эўропа рэагавала перш за ўсё крытыкай і палітычнай ізаляцыяй яго прадстаўнікоў, дык цяпер надышоў час пайсьці насустрач тым, хто імкнецца да супрацоўніцтва і партнэрства з Эўропаю. У выпадку Беларусі відавочна, што размова ідзе не пра афіцыйнае палітычнае прадстаўніцтва, а хутчэй пра дэмакратычную апазыцыю, незалежныя ініцыятывы, пра студэнтаў і грамадзянаў, для якіх дэмакратычная Беларусь атаесамляецца з эўрапейскай Беларусяй.

Я глыбока перакананы ў тым, што эўрапейцы мусяць ня толькі ізаляваць афіцыйных беларускіх прадстаўнікоў, але перш за ўсё адчыніць як мага болей сваіх праграмаў і фондаў для суб’ектаў, зацікаўленых у супрацоўніцтве, нават калі афіцыйны рэжым будзе гэтаму перашкаджаць. Толькі так мы маем усе шанцы зьмяніць сытуацыю ў Беларусі ды стварыць там умовы для свабодных выбараў. Беларусы самі на іх вырашаць, далучацца ім да Эўропы ці не, гэта будзе іхнай справай. А мы ўсе павінны будзем іх выбар паважаць. Але дзьверы ў Эўропу мусяць застацца адчыненымі.

Я веру, што будучыня Беларусі цесна зьвязана з будучыняй Эўропы, а будучыня Эўропы — з будучыняй дэмакратычнае й незалежнае Беларусі. Я веру, што дзякуючы партнэрству з праэўрапейскай часткай беларускага грамадзтва можа адбыцца тое, што цяпер мала хто можа сабе ўявіць — што Беларусь будзе наступнай краінай былога камуністычнага блёку, дзе пераможа дэмакратыя, наступнай краінай, якая стане часткаю аб’яднанае Эўропы.

19 сакавіка 2004 году артыкул друкуецца адначасова ў газэтах **«Gazeta Wyborcza»** (Польшча), **«Frankfurter allgemeine Zeitung»** (Нямеччына), **«Die Presse»** (Аўстрыя), **«Postimees»** (Эстонія), **«SME»** (Славаччына), **«Romania Libera»** (Румынія), **«Jutarnij List»** (Харватыя), **«Washington Post»** (ЗША), **«Наша Ніва»** (Беларусь), **«Дзеркало тижня»** (Украіна), **«MF Dnes»** (Чэхія)

# Рэакцыя на грошы

**У сераду стала вядома, што Пракуратура ўзбудзіла крымінальную справу супраць старшыні Аб’яднанай грамадзянскай партыі Анатоля Лябедзькі за «распаўсюд заведама непраўдзівых зьвестак аб прэзыдэнту Аляксандру Лукашэнку».**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Нагодаю стала інтэрвію А.Лябедзькі, якое трансьлявалася 21 лютага ў праграме «Люстра» тэлеканалу «Расея» і 22 лютага ў праграме «Надоечы» НТВ. Крымінальная справа ўзбуджаная па арт.367 часткі 2 КК («Паклёп у дачыненьні прэзыдэнта») і перададзеная ў пракуратуру сталіцы. Гэты артыкул прадугледжвае пакараньне на тэрмін да пяці гадоў зьняволеньня.

Праўда, у папярэдніх выпадках перасьледу за «паклёп» на Лукашэнку (гучныя справы Маркевіча, Мажэйкі, Новікавай, Івашкевіча) да такіх жорсткіх пакараньняў не даходзіла. Раней супраць А.Лябедзькі ўжо ўзбуджалі такую справу за артыкул у «Народнай волі», дзе ён абвінавачваў улады ў пераводзе сродкаў ад продажу зброі ў прэзыдэнцкі фонд. Цікава, што газэта «Советская Белоруссия» пасьля выхаду тых інтэрвію пагражала «адказнасьцю» ня толькі А.Лябедзьку, але й Яраславу Раманчуку. Маўляў, «за свае словы трэба адказваць». Імя А.Лябедзькі ўжо даўно значылася ў чорных сьпісах людзей, якія падлягаюць татальнай праверцы на мяжы.

На думку намесьніка А.Лябедзькі ў АГП Аляксандра Дабравольскага, найбольш раззлавала ўлады заява, што прэзыдэнт мае пазабюджэтныя фонды, фактычна «другі бюджэт» краіны, непадкантрольны грамадзтву і парлямэнту, і распараджаецца ім на ўласнае меркаваньне, у прыватнасьці сілкуе грашыма сваё лобі ў Расеі.

А.Лябедзька назваў крок Пракуратуры «нэрвовай рэакцыяй» на дзейнасьць «Пяцёркі+» і лічыць яго «дэманстрацыяй ня сілы, а слабасьці ўлады». Ён гарантуе, што ўзбуджэньне справы ніяк не адаб’ецца на дзейнасьці яго і партыі. Ці не зьбіраецца ён пакінуць краіну перад абліччам перасьледу? «Нават думкі такой ня маю!» — адказвае А.Лябедзька.

**Мікола Бугай**

**Яшчэ адна крымінальная справа ўзбуджаная ў пятніцу супраць старшыні Беларускага Хельсынскага камітэту Тацяны Процькі і бухгалтаркі Тацяны Рудкевіч. Камітэт дзяржкантролю палічыў, што праваабаронцы ўхіляліся ад сплаты падаткаў, парушаючы мытнае заканадаўства. БХК называе справу палітычна матываванай.**

## Караткевіч заваліў Хадановіча

Чацьвёра зь дзевяці кіраўнікоў упраўленьняў КДБ не прайшлі пераатэстацыі, зладжанай Радай бясьпекі. «Нездавальняюча» атрымалі: кіраўнік рэжымна-сакрэтнага ўпраўленьня Ярохін; Шчуркевіч, які адказваў за эканамічную бясьпеку; Мяцеліца, адказны за абарону канстытуцыйнага ладу; і галоўны контрвыведнік Хадановіч, паведамляе «БДГ». Лукашэнка, выступаючы ў КДБ тры месяцы таму, вінаваціў спэцслужбу ў няведаньні «каналаў трапляньня ў краіну тэхнічных сродкаў вядзеньня інфармацыйнай вайны» і «фінансавых плыняў для радыкальнай апазыцыі». Не пераатэставалі й частку начальнікаў аддзелаў. Пераатэстацыя ў Камітэце бывае раз на чатыры гады, яна зазвычай фармальная. Пазачарговасьць пераатэстацыі (у камісіі — Нявыглас, яго намесьнік Караткевіч, якога называюць кандыдатам на старшыню КДБ, Шэйман, Ерын) выклікала пярэпалах у КДБ.

## ШТО Ў СЬВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Купляць газ у Эўропе?

Пасол Беларусі ў Польшчы Павал Латушка не выключае такой магчымасьці. Падчас прэс-канфэрэнцыі ў Варшаве ён заявіў, што Менск будзе весьці перамовы з эўрапейскімі краінамі ў справе дывэрсыфікацыі паставак газу й нафты ў Беларусь. Найбліжэйшыя ад Беларусі радовішчы газу — у Нарвэгіі.

### Кандрусевіч заклікае

Напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў у Расеі каталіцкі арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч назваў удзел у выбарах «хрысьціянскім абавязкам кожнага» і заклікаў вернікаў зрабіць слушны выбар з усьведамленьнем адказнасьці. Аналягічныя звароты выдалі патрыярх Маскоўскі, галоўны рабін і мусульманскія лідэры. Улады Расеі баяліся, што ў выніку грамадзкае апатыі і байкоту, да якога заклікала дэмакратычная апазыцыя, выбары могуць аказацца несапраўднымі.

### Ян Павал II на трэцім месцы

Папа Ян Павал II стаў трэцім пантыфікам у гісторыі Касьцёлу паводле працягласьці пантыфікату. У нядзелю ён адслужыў 9281-ы дзень на пасадзе. Толькі два чалавекі шчыравалі даўжэй: сам сьвяты Пётра — лічыцца, што ён кіраваў ад 34 да 37 гадоў, — і Папа Пій IX (1846—1878).

### Трагедыя на фэхтаваньні

У пятніцу ў Харкаве падчас двубою на спаборніцтвах рапірыстаў здарылася трагедыя: быў сьмяротна паранены 17-гадовы фэхтавальнік. У праціўніка зламалася рапіра, востры аддоламак прапароў юнаку лёгкае.

### Сястра Плютона

Навукоўцы адкрылі нябеснае цела, якое лічаць дзясятай плянэтай Сонечнай сыстэмы. Яна месьціцца ў Поясе Коплера за 10 млрд км ад Зямлі (40 гадоў палёту «шатла»). Назвалі яе Сэднай у гонар эскімоскай марской багіні жывёлаў. Адкрыцьцё выклікала спрэчкі: ці можна лічыць плянэтамі целы Поясу Коплера — у тым ліку і Плютон, за які Сэдна нашмат большая.

**СМ; gazeta.pl**

# Зварот Рады інтэлігенцыі

## За зьмены ў выбарчым заканадаўстве

«Сёлета наша краіна зноў будзе стаяць перад выбарам, — адзначаецца ў звароце Рады. — Дзеля таго каб зрабіць гэты выбар сьвядомым і свабодным, грамадзкая ініцыятыва «Рада беларускай інтэлігенцыі» склікае 25 красавіка ў Менску Другі сход інтэлігенцыі.

Як наш канкрэтны ўнёсак у справу забесьпячэньня справядлівых выбараў, мы прапануем падчас вылучэньня дэлегатаў на Сход сабраць подпісы ў падтрымку заканадаўчай ініцыятывы дэпутацкай групы «Рэспубліка» за зьмены ў выбарчым заканадаўстве. З тым, каб кожны кандыдат змог прывезьці на Сход ня менш за сто подпісаў.

Запрашаем як мага больш шырокія колы інтэлігенцыі далучыцца да выбараў дэлегатаў на Сход. Ад усіх нас залежыць, наколькі пачуюць слова інтэлігенцыі тыя, хто сёньня пры ўладзе», — адзначаецца, у прыватнасьці, у звароце Рады.

Інфармацыю пра Сход можна знайсьці на сайце shod2004.at.tut.by. Сьпісы дэлегатаў, а таксама думкі і пажаданьні можна дасылаць на адрас аргкамітэту: а/с 109, 220002, Менск. E-mail: rada-04@tut.by.

Т.: (029) 629-59-03; (029) 771-01-39.

### Узор ліста для збору подпісаў

*2004 г.*

Палаце прадстаўнікоў нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусі
Савету рэспублікі нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусі
Прэзыдэнту Рэспублікі Беларусі

**Адкрыты зварот грамадзянаў Рэспублікі Беларусі**

ў падтрымку заканадаўчай ініцыятывы дэпутацкай групы «Рэспубліка» палаты прадстаўнікоў нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусі па ўнясеньні зьменаў і дапаўненьняў у Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусі

Мы, ніжэйпадпісаныя грамадзяне Рэспублікі Беларусі, падтрымліваем заканадаўчую ініцыятыву дэпутацкай групы «Рэспубліка» палаты прадстаўнікоў нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусі (дэпутаты Баслык І., Парфяновіч У., Скрабец С., Фралоў В.) пра ўнясеньне дапаўненьняў і зьменаў у Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусі і распрацаваны імі праект адпаведнага Закону, у тым ліку зьмяненьняў і дапаўненьняў па пытаньнях:

зьмена парадку фармаваньня выбарчых камісіяў (удзел партый у іх фармаваньні);
адмена датэрміновага галасаваньня;
пашырэньне паўнамоцтваў назіральнікаў.

| № | прозьвішча, імя, імя па бацьку | месца жыхарства | подпіс | дата подпісу |
|---|---|---|---|---|
| 1 | | | | |
| 2 | | | | |
| 3 | | | | |
| 4 | | | | |
| 5 | | | | |

Лісты з подпісамі можна перадаць з дэпутатамі Сходу інтэлігенцыі ад Вашай мясцовасьці.

# Нэмэзыда альбо кат?

**Рашэньне Канстытуцыйнага суду адносна магчымасьці адмены сьмяротнага пакараньня можна назваць вельмі асьцярожным: суд пастанавіў, што адмена не пярэчыла б Асноўнаму закону. Рашэньне можна назваць ніякім: апошняе слова пакідаецца за прэзыдэнтам і нацыянальным сходам. Але калі ўлічыць, што на рэфэрэндуме 1996 г. за сьмяротнае пакараньне, згодна з афіцыйнымі зьвесткамі, выказаліся 80% удзельнікаў, сам факт разгляду пытаньня Канстытуцыйным судом варты ўвагі.**

Заслугоўвае ўвагі і той факт, што за гэтыя дзевяць з паловаю гадоў дэмакратычная апазыцыя ніколі не вылучала патрабаваньня адмены сьмяротнае кары ў якасьці галоўнага. Між тым яно зьяўляецца адным з чатырох асноўных патрабаваньняў Рады Эўропы да Беларусі. Гэта, калі фармуляваць сьцісла, справядлівыя выбары, моцны парлямэнт, адмена пакараньня сьмерцю і свабода прэсы. Гэтыя прынцыпы беларуская апазыцыя падтрымлівае, так бы мовіць, у пакеце. Але ж пытаньне сьмяротнага пакараньня заўсёды адсоўваецца на самы задні плян. Зразумела, што вырашыць гэтае пытаньне немагчыма ў адрыве ад астатніх трох. Але ж нават усур'ёз абмяркоўваць яго ў апазыцыі, мабыць, не хапае духу. Хай сабе той рэфэрэндум быў кансультацыйны, усё-такі дзвадзіцца лічыцца з грамадзкай думкай.

Тады атрымліваецца, што адмена сьмяротнага пакараньня ў Беларусі патрэбная толькі Эўропе? Мабыць, так і ёсьць. У большасьці амэрыканскіх штатаў гэты від пакараньня ня толькі захоўваецца, але, што называецца, актыўна практыкуецца. У Японіі, якая насуперак геаграфіі таксама лічыцца Захадам, захоўваецца такі найменш цывілізаваны від пакараньня, як павешаньне. У Кітаі асуджаных расстрэльваюць на стадыёнах дзясяткамі. Пра іншыя краіны Азіі, асабліва мусульманскія, няма чаго й казаць.

Застаюцца Расея ды Ўкраіна, дзе ўведзеныя мараторыі на пакараньне сьмерцю. Але ж гэта выклікана чыста палітычнымі меркаваньнямі. Гэта, асабліва калі гаварыць аб Расеі, часовая саступка Эўропе, абумоўленая каньюнктурнымі меркаваньнямі кіраўніцтва краіны.

Між тым, адмена пакараньня сьмерцю ня ёсьць палітычным крокам. Гэта пытаньне маралі.

Успамінаю адну даўнюю спрэчку з маім калегам. Ён даводзіў, што патрабаваньне Эўропы аб адмене сьмяротнага пакараньня трэба выкарыстоўваць як зброю супраць рэжыму Лукашэнкі. Але пры гэтым сам ён катэгарычна выступаў за захаваньне гэтага інстытуту. На ягоную думку, справа ў няўхільнасьці расплаты за ўчыненыя злачынствы — ці будуць гэта нацысцкія злачынцы, ці тэрарыст-самавук з Аклахомы Цімаці Маквэй, ці сябры наваяўленых «эскадронаў сьмерці». Такім чынам, дзяржава выступае ў ролі, так бы мовіць, карніцы-Нэмэзыды.

Аднак ёсьць і іншая думка, якую выказаў некалі апостальскі візытатар беларусаў замежжа айцец Аляксандар Надсан. Паводле айца Надсана, слова «пакараньне» ў спалучэньні са словам «сьмерць» траціць свой сэнс. Бо ў хрысьціянскім значэньні слова «пакараньне» азначае адкупленьне. Калі злачынца асуджаюць на сьмерць, яго тым самым пазбаўляюць магчымасьці пакаяцца, стаць на шлях выпраўленьня і збаўленьня. Аляксандар Надсан падкрэсьліў, дарэчы, што Каталіцкая царква адносна нядаўна стала асуджаць сьмяротнае пакараньне як такое. Рэзка асуджаючы пазбаўленьне жыцьця яшчэ ненароджаных дзяцей (аборты), касьцёл даволі талерантна ставіўся да дзяржаўнай практыкі пакараньня сьмерцю — нават непаўналетніх і жанчын, што да апошняга часу было нярэдкай зьявай у ЗША.

І гэта Каталіцкая царква, якая ўжо шмат стагодзьдзяў аддзеленая ад дзяржавы. Куды больш сэрвілізаваная Расейская праваслаўная царква ня мае акрэсьленай, пасьлядоўнай пазыцыі ў гэтым пытаньні. Паколькі расейская дзяржава праводзіць цяпер палітыку мараторыю на сьмяротнае пакараньне, значыць, і царква ў цэлым не апраўдвае яго. Праўда, асобныя праваслаўныя сьвятары адкрыта выступаюць у тэлеэфіры за вяртаньне гэтага інстытуту. І можна не сумнявацца: калі заканадаўчыя органы Расейскай Фэдэрацыі адновяць у правах пакараньне сьмерцю, царква падтрымае такое рашэньне, як падтрымала да гэтага вайну ў Чачэніі.

Расейскія заканадаўцы ўжо цяпер вельмі актыўна выступаюць за сьмяротнае пакараньне. Цікава было пачуць з вуснаў былога сьпікера Думы, галоўнага інтэгратара Беларусі з Расеяй, а цяпер проста дэпутата Генадзя Селязьнёва такі аргумэнт: тэрарысты-шахіды ніколі б не пайшлі на свае жахлівыя злачынствы, каб ведалі, што іх будуць судзіць і пакараюць сьмерцю. У першы момант гэткае выказваньне можна прыняць за чорны гумар. Але, паразважаўшы, прыходзіш да высновы, што экс-сьпікер меней за ўсё схільны да жартаў. Зь ягонага гледзішча, ня мае права чалавек, хай сабе й шахід, пазбаўляць іншых, у тым ліку сябе, жыцьця. Эксклюзіўнае права на гэта мае толькі дзяржава. Толькі яна, а ня Бог і ня сам чалавек, распараджаюцца чым бы там ні было жыцьцём ад нараджэньня да сьмерці. Дзяржава, ізноў-такі, выступае ў ролі карніцы-Нэмэзыды, жахлівай і непадкупнай.

Праўда, пры гэтым забываюць, што дзяржава — гэта ня нейкая абстракцыя, гэта органы правапарадку, якія часьцяком самі ператвараюцца ў органы арганізаванай злачыннасьці, гэта карумпаваныя суды й пракуратура, у рэшце рэшт, гэта проста людзі з усімі сваімі чалавечымі недахопамі, якім дадзена права вырашаць лёс іншых людзей. Вядома, узаконенае забойства дазволіла б дзяржаўным чыноўнікам закрыць многія складаныя пытаньні. Няма чалавека — няма праблемы. Навошта высьвятляць, у чым карані тэрарызму, фашызму, бандытызму, — прасьцей забіваць тэрарыстаў на месцы, «мачыць у сарціры» (калі, зразумела, удаецца іх злавіць). Навошта вырашаць надакучлівыя праблемы беднасьці, забесьпячэньня людзей гарачай вадой, цяплом і газам — ці ня лепей было б расстраляць тройку-другую алігархаў? Такімі настроямі заражаная, на жаль, немалая частка насельніцтва і ў Беларусі.

Незразумела, як можна патрабаваць ад грамадзянаў спачуваньня й цікавасьці да лёсу зьніклых, калі пераважная большасьць тых самых грамадзянаў падтрымліваюць сьмяротнае пакараньне? Магчыма, гэта гучыць па-кашчунску — як можна параўноўваць вядомых і паважаных палітыкаў са злачынцамі, жорсткімі забойцамі, часам сапраўднымі садыстамі, на сумленьні якіх жыцьці ні ў чым не вінаватых ахвяраў? Але справа ў тым, што ўлада, асабліва неабмежаваная, ня робіць розьніцы паміж бязьвінным і вінаватым. Для яе той, хто замахваецца на яе інтарэсы, нават больш небясьпечны, чым сэрыйны маньяк для грамадзтва.

А ўжо зьнішчаць чалавека ў турэмным падвале стрэлам у патыліцу альбо ў лесе рыдлёўкай па галаве — залежыць ад выбару ката.

Ёсьць рэчы, якія не вырашаюцца на рэфэрэндумах. Гэта родная мова і нацыянальныя сымбалі. А яшчэ — права на жыцьцё.

**Віталь Тарас**




**Старшыня Канстытуцыйнага суду Рыгор Васілевіч дазволіў не расстрэльваць**

# Калектыўны твар году

**Аплата камунальных паслуг вырасла за 11 месяцаў 2003 г. амаль у два разы. Звольненыя восем міністраў, адзін прэм'ер і адзін намесьнік прэм'ера. Вярнуўся агітпроп. Аляксандар Лукашэнка ўзброіўся новым словам — «суверэнітэт». Такія вынікі 2003 г. прэзэнтавалі аўтары даведніка «Беларускі штогоднік'2003».**

«Прычынаў для аптымізму няма, — канстатаваў каардынатар кнігі Аляксандар Фядута. — Аднак залаты запас краіны і адкрыцьцё году — моладзь. Калектыўным тварам году сталі ліцэісты, якія былі больш пасьлядоўныя ў абароне сваіх перакананьняў, чым дарослыя».

Паводле апытаньняў, праведзеных аксіямэтрычнай лябараторыяй «Новак», рэйтынг Лукашэнкі залежыць ад пары году і тэмпэратурных умоваў: нязначна падае зімой і расьце ўлетку. Максымальны быў зафіксаваны ў жніўні (28,8%). На працягу ўсяго году нэгатыўны рэйтынг Лукашэнкі перавышаў пазытыўны.

Патэнцыял пратэсту складае каля траціны дарослага насельніцтва (30—35%). Беларусы не гатовыя ў масе да актыўнага пратэсту, нягледзячы на нізкі ўзровень даверу да ўлады. Цягам году ў той ці іншай ступені давяралі органам улады ад 20 да 50% насельніцтва. У працэнтных адносінах людзей, якія цалкам давяраюць уладзе, менш за тых, хто цалкам не давярае. Адваротная сувязь узроўню даверу з вопытам: чым старэйшыя грамадзяне, тым больш яны давяраюць уладзе. Асабліва заўважна ўзровень даверу падскоквае ў групе ад 55 гадоў. Жанчыны схільныя давяраць уладзе больш за мужчын. Чым больш адукаваны чалавек, тым менш ён давярае дзяржаўным інстытуцыям.

Даведнік выдадзены Інстытутам Беларусі, ГА «Сацыяльныя тэхналёгіі», сайтам «Наша меркаваньне» і «Новакам». Такія даведнікі існуюць у многіх краінах сьвету, і надалей аўтары плянуюць выдаваць яго штогод. Першы ажыятаж ужо паспытаў дэпутат Сяргей Скрабец, прэзэнтаваўшы кнігу лідэрам моладзі ў Лідзе. А прысутныя на прэзэнтацыі актыўна выказвалі свае заўвагі. Валянціну Голубеву не спадабалася акрэсьленьне партыі БНФ як «нацыяналістычнай», а Тацяна Процька паскардзілася, што інфармацыя пра БХК ў кнігу патрапіла з сайту, які не абнаўляецца вось ужо пяць гадоў.

**Вераніка Дзядок**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Сацыёляг Андрэй Вардамацкі: рэйтынг Лукашэнкі залежыць ад пары году і тэмпэратурных умоваў**

# Шварцэнэгеры беларускіх

## Старажыл

Уладзімер Андрэйчанка — унікальны кіраўнік вобласьці. У лістападзе ён, калі чаго ня здарыцца на сенажацях, адсьвяткуе дзесяцігодзьдзе свайго кіраваньня. Рэдкаму чыноўніку вышэйшага рангу ўдалося б прабыць хай сабе й ня побач, але ўсё ж поруч з прэзыдэнтам 10 гадоў.

Тыя, хто працаваў з Андрэйчанкам, гавораць аб яго безыніцыятыўнасьці, аб кіраваньні з пазыцыяў «чаго жадаеце?». «Калі яму загадаюць скінуць бомбу на Смаленск, ён, магчыма, і адмовіцца, але добра падумае, — кажуць у Віцебску. — Адных яго «дасягненьняў» у галіне сельскай гаспадаркі дзесяць разоў хапае для адстаўкі». Тое самае ў вобласьці і з прамысловасьцю. Толькі Наваполацак зь яго нафтахіміяй ратуе.

Іншыя тлумачаць, што ўсё гэта — не віна, а бяда Андрэйчанкі. Маўляў, самая складаная вобласьць. Сярэдні контур гектара поля ў Віцебску — 2,7, што ў перакладзе на звычайную мову значыць «гара на гары, лес на лесе». А Андрэйчанка — праверany чалавек. Рабочы конь. Зорак зь неба не хапае, але патрэбны на сваім месцы менавіта ў гэты час, кажа адзін добры знаёмы віцебскага старшыні. У звадкі ня лезе. Вялікага кола знаёмых за мяжой ня мае. Тут можна прыгадаць хіба падпісанае ў верасьні 2001 г. пагадненьне аб супрацоўніцтве між Віцебскім аблвыканкамам і ўрадам Масквы. Але вынікаў таго супрацоўніцтва ніхто ня бачыў.

Шуму Андрэйчанка пазьбягае, у адрозьненьне ад былога калегі Даўгалёва. Працуе ціха, давярае толькі асабіста падабраным людзям. Таму ў ягоным апараце невялікая цякучка кадраў. Ніхто не пайшоў ад Андрэйчанкі з скандалам. На «Славянскім базары» зьяўляецца, але на трэціх ролях. Такі сабе актор масоўкі. Посьпехаў няма, але і правалаў яўных — таксама. Прыкладна так жа ён працаваў бы на любога іншага начальніка — на Шушкевіча, Пазьняка ці Кебіча.

Калі Андрэйчанку прызначалі, мясцовыя эліты меркавалі, што гэта — часовы чалавек, месяцы на тры. Былі ж тады ў вобласьці мацнейшыя крэатуры — Пётра Драздоў (кіруе Віцебскім гарвыканкамам), Уладзімер Грыгор'еў (пасол Беларусі ў Расеі). Але Андрэйчанка во і да «круглай даты» падбіраецца ціхай сапай.

## «Змагар» за ўраджай

Дамашкевіч кіруе Меншчынай амаль пяць з паловай гадоў. Кіруе апантана. Вось, да прыкладу, дзьве цытаты з інфармацыйных абвестак Менаблвыканкаму, прысьвечаных «бітве за ўраджай». 14 жніўня 2003 г.: «Рэкамэндацыі кіраўніка дзяржавы аб неабходнасьці ўлічваць у ідэалягічнай працы пазытыўны вопыт, назапашаны яшчэ ў гады СССР, у Менскай вобласьці ўспрынятыя як кіраўніцтва да дзеяньня. Для ідэалягічнага абслугоўваньня ўборачнай пары ў вобласьці створаны 22 рэгіянальныя штабы арганізацыйна-ідэалягічнага забесьпячэньня, 127 раённых і 237 сельскіх інфармацыйна-прапагандысцкіх груп. Адроджана і такая форма нагляднай агітацыі і прапаганды ў бітве за ўраджай, як баявыя лісткі, тэматычныя інфармацыйныя бюлетэні, «маланкі». Кіраўнікам выканкамаў рэкамэндавана ў райцэнтрах і на цэнтральных сядзібах калгасаў і саўгасаў у гонар перадавікоў спаборніцтва ўздымаць сьцягі працоўнай славы».

На два тыдні раней, 30 ліпеня: «Пастанову аблвыканкаму з 30 ліпеня для чыноўнікаў усіх рангаў — ад калгаснага да абласнога — роўна на месяц уведзены 16-гадзінны працоўны дзень: з 6.00 раніцы і да 22.00 увечары без выхадных».

А яшчэ за 15 дзён да таго, 15 ліпеня, Дамашкевіч рапартуе Лукашэнку: «Рэакцыяй на Вашу крытыку кіраўніцтва сталічнай вобласьці за нясвоечасовы разьлік са здатчыкамі сельгаспрадукцыі ды прыпіскі сталася пакараньне блізу трох дзясяткаў чыноўнікаў. Вызвалены ад сваіх пасадаў кіраўнікі Клецкага й Лагойскага выканкамаў, атрымалі вымовы старшыні трох райвыканкамаў. Звольненыя дырэктары, галоўныя бухгальтары ды галоўныя эканамісты пяці малаказаводаў».

У гэтым увесь Дамашкевіч: спачатку пазвальняць, пасьля настрашыць, а скончыць справу агітбрыгадамі ды дошкамі гонару. А распачаўся «разгон» пасьля 10 ліпеня, калі Лукашэнка даручыў Дамашкевічу да 1 кастрычніка «навесьці ў вобласьці ідэальны парадак». Прычым дадаў, што гэта — апошні шанец.

Анатолю Малафееву, які кіраваў Меншчынай у 80-я, прыпісваецца клясычная характарыстыка вобласьці: «Меншчына — як прастытутка на скрыжаваньні: куды б начальства ні ехала — абавязкова яе заўважыць».

Дамашкевіч з кагорты непатапляльных. Знаёмыя характарызуюць яго так: «Верна служыць. У кіраваньні нават ня жорсткі, а бязьлітасны. Яго ўлюбёная справа — зьняць ці прызначыць».

На сэлектарнай нарадзе летам 2001 г. Дамашкевіч паабяцаў прэзыдэнту сабраць у вобласьці 2,5 млн тонаў збожжа. Астатнія кіраўнікі казалі пра мільён-паўтара. Лукашэнка зь недаверам: «Ты хоцьбы два мільёны зьбяры». А Дамашкевіч: «Пабачыце, зьбяром два з паловай»… І «сабралі». А дакладней — адрапартавалі. 21 сьнежня Лукашэнка нават уручыў Дамашкевічу ордэн Айчыны трэцяй ступені.

Але потым выявілася, што й гадавы плян продажу малака дзяржаве ў верасьні, і падвышэньне валавога збору збожжа, і ўсё астатняе — міраж... Ну не забіраць жа ордэн назад!

## Інтэлігент

У лістападзе будзе чатыры гады, як Батура кіруе Магілёўшчынай. Будзе, калі да лістапада яго не накіруюць на больш адказны напрамак. Батура мае імідж інтэлектуала і кампэтэнтнага кіраўніка. Яго ўспрынялі дзелавыя колы.

Увесь час праяўляе ініцыятыву, пільна сочыць за выкананьнем запланаванага. З адмоўных рысаў — любіць умешвацца ў працу падначаленых, наглядае за імі, не даючы праявіць «нізавую» ініцыятыву. Яшчэ, кажа Васіль Лявонаў, ягонаму аўтарытэту шкодзіць жонка, якая, бывае, праяўляе бестактоўнасьць у словах.

У Батуры па-майстэрску завязаны гальштук, ягоны імідж — прылюдная мяккасьць, інтэлігентнасьць. Ён добра кантактуе з журналістамі, ня робіць розьніцы паміж «чэснымі» й «нячэснымі». Усімі сваімі паводзінамі дэманструе эўрапейскасьць. І ўсё гэта вельмі кантрастуе з стылем папярэдняга кіраўніка вобласьці Міхаіла Дражына.

Але эўрапейскасьць Батуры адносная. Ён усё ж лукашэнкаўскі чыноўнік. Адсюль і ініцыятывы кшталту выказанай на паседжаньні аблвыканкаму 9 ліпеня 2001 г.: «Мясцовая дзяржаўная газэта плюс адна рэспубліканская павінны быць у кожнай хаце Магілёўскай вобласьці».

Батура мае шмат кантактаў з расейскімі палітыкамі, ён — чалавек адкрыты. А патрыярх Маскоўскі Аляксій II нават узнагародзіў старшыню ордэнам Сьвятога князя Уладзімера III ступені. І яшчэ цікавая акалічнасьць. Прадстаўнікі вышэйшага менскага чынавенства кіруюць рознымі спартовымі галінамі. Адзіны рэгіянал, які ўваходзіць у гэты клюб, — якраз Батура. Другі тэрмін кіруе беларускім валейболам. На першы, у 1999 г., яго абралі яшчэ ў рангу віцэ-прэм'ера. Апошнія выбары «галоўнага валейбаліста» былі безальтэрнатыўныя, за Батуру выказаліся ўсе 48 прысутных. Тут задачы Батуры — удзел жаночай зборнай краіны ў фінальным турніры Алімпіяды'2008 у Кітаі.

Батура — гарадзенец, і ў Магілеве ёсьць групоўкі, якія глядзяць на яго раздражнёна. Ён чалавек жорсткі, прынцыповы, «упаўвока» бачыць сутнасьць таго ці іншага мерапрыемства. Да прыкладу, фэст духоўнай музыкі «Магутны Божа»: Батура зважае на важнасьць гэтага мерапрыемства для вобласьці, адчувае веліч духовага складніку, які прысутнічае ў фэсьце. І неадназначна ставіцца да «Залатога шлягеру», які за Батурам стаў праводзіцца раз на два гады. А «Магутны Божа» — штогод.

Разам з тым за Батуры з вуліцаў Магілёва цалкам зьнікла беларускамоўе. Раз мэр Магілёва Шорыкаў захацеў вярнуць вуліцы Ленінскай гістарычны назоў Ветраная. І атрымаў прачуханку па поўнай праграме, бо «не ўзгадніў». А нядаўна ў Бялынічах на адкрыцьці дому культуры Батура казаў пра слабую прафэсійную дасьведчанасьць мясцовага чынавенства. Уладзімер Канаплёў, што выступаў пасьля, сказаў: «Вы, спадар Батура, ня маеце рацыі». Дык той падняўся і дэманстратыўна выйшаў.

## Бальшавік-зваршчык

У Менску Паўлаў зьявіўся нечакана, у сакавіку 2000 г. Тады модныя былі газэтныя загалоўкі кшталту «Калода вычарпалася». Але пасьлядоўнасьць Паўлава на новай пасадзе, ягоны бальшавізм і фанатычная працаздольнасьць сьведчаць аб тым, што Лукашэнка стрэліў трапна. У апошнія гады сталіца нагадвае вялікую будаўнічую пляцоўку: плошча Незалежнасьці, мэтро, Дом міласэрнасьці, Камароўскі рынак, падсьветка цэнтру, Нацыянальная бібліятэка, водны комплекс «Алімпійскі», жыльлёвае будаўніцтва... Плюс пачатак будаўніцтва гіпэрмаркетаў і



**Віцебшчына: Уладзімер Андрэйчанка**

**Зь сялянаў. Нарадзіўся ў 1949 г. у вёсцы Мар'янава Лёзьненскага раёну. Скончыў Лужасьнянскі саўгас-тэхнікум ды сельскагаспадарчы інстытут у Вялікіх Луках (Расея). Пасьля — Менскую вышэйшую партыйную школу. Працаваў у Верхнядзьвінскім раёне аграномам. Потым — 17 гадоў у Лёзьненскім раёне: на камсамольскай ды партыйнай працы, старшынём калгасу, узначальваў райсельгасупраўленьне. Быў першым сакратаром Верхнядзьвінскага райкаму КПСС, дэпутатам Вярхоўнага Савету XII скліканьня. Да прызначэньня на пасаду старшыні Віцебскага аблвыканкаму (1994) узначальваў камітэт па сельскай гаспадарцы й харчаваньні.**



**Гарадзеншчына: Уладзімер Саўчанка**

**Аднагодак Паўлава (1952 г. нар.). Таксама нарадзіўся на Магілёўшчыне, у Касьцюковіцкім раёне. Скончыў Сельскагаспадарчую акадэмію. Шмат гадоў узначальваў калгас у Круглянскім раёне, потым быў старшынём Круглянскага райвыканкаму, намесьнікам старшыні Магілёўскага аблвыканкаму. Потым — Гарадзенскага. Ва «ўрадзе» Дубка займаўся пытаньнямі сельскай гаспадаркі. Кіруе Гарадзеншчынай ужо тры зь невялікім гады: Лукашэнка прызначыў яго 5 лютага 2001 г., пасьля сьмерці Аляксандра Дубка. Прызначыў «не таму, што ён магілёўскі, а таму, што прыстойны, чаго нельга сказаць аб некаторых іншых кандыдатах».**



**Магілёўшчына: Барыс Батура**

**Нарадзіўся ў Ваўкавыску ў 1947 г. Скончыў Беларускі політэхнічны інстытут па спэцыяльнасьці «інжынэр-мэханік». Кіраваў Ваўкавыскім камбінатам камунальных прадпрыемстваў, потым — упраўленьнем жыльлёва-камунальнай гаспадаркі Гарадзеншчыны. У 1987—90 г. — намесьнік міністра ЖКГ БССР, намесьнік старшыні Гарадзенскага аблвыканкаму. У 1990—1999 г. — міністар жыльлёва-камунальнай гаспадаркі. З чэрвеня 1999 да 13 лістапада 2000 г. — віцэ-прэм'ер ураду.**



**Менск: Міхаіл Паўлаў**

**Паходзіць з Магілёўшчыны. Нарадзіўся ў 1952 г. Скончыў політэхнічны тэхнікум, Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут, Акадэмію народнай гаспадаркі пры ўрадзе Расеі. Інжынэр-мэханік па абсталяваньні ды тэхналёгіі зваркі, спэцыяліст па ўпраўленьні й мэнэджмэнце. Кандыдат тэхнічных навук. Заслужаны работнік прамысловасьці Беларусі. Працаваў на заводзе сянажных вежаў зваршчыкам, даслужыўся да дырэктара. Старшыня Баранавіцкага гарвыканкаму з 1997 да 2000 г.**

# Каліфорніяў

гандлёвах цэнтраў. І гэта толькі вяршыня айсбэргу. Менск — сталіца, тут аб'ектыўна больш вольны дух, падвышаны градус апазыцыйнасьці. Паўлаў спраўляецца з гэтым на «выдатна». Што яму Гуманітарны ліцэй, калі ён трымае ў сваіх руках усю сыстэму адукацыі сталіцы настолькі надзейна, што, здаецца, хутка яна задыхнецца! А беларускія клясы яшчэ ў Баранавічах даводзілася зачыняць. Шапікі нейкія, прадпрымальнікі, перайменаваньні «Ракаўскай» у «Спартовую» і «Плошчы Незалежнасьці» ў «Плошчу Леніна» — што гэта ўсё ў параўнаньні з пэрспэктывай ізноў апынуцца ў Баранавічах!

Дарэчы, Баранавічы, як і Берасьце, добра памятаюць Уладзімера Заламая, калі той яшчэ быў старшынём гаркаму партыі. Да пэрыяду яго кіраваньня (1980—86) горад хутчэй быў падобны на кепскую вёску. Заламай зрабіў тут сапраўдную рэвалюцыю, пры ім забрукавалі вуліцы, навялі чысьціню. Потым былі Лапко, Дзічкоўскі і — Паўлаў. «Зрабіў» вуліцу Камуністычную, таму што побач жыў, даводзілася кожны дзень па ёй езьдзіць. Зрабіў Савецкі праспэкт, бо ён распачынаецца якраз з трасы Берасьце — Масква і вядзе да вайсковага авіязаводу, на які неаднойчы заяжджаў Лукашэнка. Забраў пад мэрыю будынак былога гаркаму, у якім пасьля путчу месьцілася школа мастацтваў.

Сядзіба добрая, але Менгарвыканкам — больш утульны. І Ратуша паблізу. А дзеля чаго ж узводзілася? Для ганаровых гасьцей. А хто іх там будзе прымаць? Натуральна, Паўлаў. Але дзеля гэтага трэба «лякалізаваць палітычную барацьбу ў межах Менску ды ня даць разпаўзьціся гэтай заразе па ўсёй краіне». Гэта — цытата з выступу Лукашэнкі ўлетку 2001 г. А вось — сьвяжэйшае: «Стварылі ўтульнае месца. Менгарвыканкам — уласьнік. Пастваралі нейкія структуркі, аддалі гэтым структуркам гэтыя плошчы, а яны здаюць у арэнду напрапалую». Гэта — з пасланьня прэзыдэнта парлямэнту 16 красавіка 2003 г. Тады Аляксандар Лукашэнка прыгразіў адправіць Паўлава ў адстаўку, калі той тэрмінова ня верне гэтыя прадпрыемствы ў дзяржаўную ўласнасьць.

І гэты вулкан — пэрманэнтны. Плюс выбары, спартовыя мерапрыемствы, гісторыі з гербам ды гімнам сталіцы і шмат чаго яшчэ. Цяжка Паўлаву з намі. І нам зь ім таксама. А як яшчэ «зварыць» безьліч умоваў і тэндэнцыяў у адну сталіцу? Толькі па-бальшавіцку! І бываюць моманты, калі наш бальшавік атрымлівае сьціплыя знакі падзякі за сваю працу. Напрыклад, 5 чэрвеня мінулага году, калі прэзыдэнт узнагародзіў Паўлава ордэнам Пашаны.



### Берасьце: Канстанцін Сумар

**Ён — аднаго, 1949-га, году з Андрэйчанкам і Дамашкевічам. Падобны хутчэй да першага. Паходзіць зь вёскі Вічын Лунінецкага раёну. Скончыў Гарадзенскі сельгасінстытут, потым — ВПШ. Доўгі час працаваў на Лунінеччыне — загадчыкам сельскага клюбу, інжынэрам-мэліяратарам у калгасе, аграномам, намесьнікам старшыні калгасу, старшынём іншага калгасу, начальнікам упраўленьня сельскай гаспадаркі раёну, старшынём Берасьцейскага райсавету дэпутатаў і адначасова — Берасьцейскага райвыканкаму, намесьнікам начальніка Службы кантролю прэзыдэнта. З 1998 г. — першы намесьнік старшыні Менаблвыканкаму. З 31 сакавіка 2000 г. — старшыня Дзяржаўнага падатковага камітэту, пасьля другіх прэзыдэнцкіх выбараў — міністар падаткаў ды збораў.**



### Меншчына: Мікалай Дамашкевіч

**Поўная процілегласьць Андрэйчанку. Хоць і аднагодкі, хоць і скончылі абодва Менскую ВПШ, але такія розныя — ну проста Бах і Гендэль. Адзін — ціхі дамасед, другі — пражэкцёр, якога панасіла па абшарах краіны. Нарадзіўся ў Гомельскай вобласьці. У 1973 г. скончыў Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут. Працаваў аўтасьлесарам у Жыткавічах, галоўным мэханікам ў Мазыры. У 1970 г. абраны першым сакратаром Жыткавіцкага райкаму ЛКСМБ. І далей — да вышыняў: інструктар аргаддзелу Жыткавіцкага райкаму КПБ, першы намесьнік старшыні Сеньненскага райвыканкаму, першы сакратар Сеньненскага райкаму КПБ... У 1992—95 г. — у іншай КПБ: галоўны кантралёр інспэкцыі Кантрольнай палаты Беларусі па Віцебскай вобласьці. З 1995 г. начальнік Службы кантролю прэзыдэнта (зьмяніў на гэтай пасадзе Васіля Даўгалёва), а пасьля — старшыня Камітэту дзяржкантролю.**



### Гомельшчына: Аляксандар Якабсон

**Нарадзіўся ў Гомелі ў 1951 г. Скончыў Беларускі інстытут інжынэраў чыгуначнага транспарту, Менскі інстытут паліталёгіі ды сацыяльнага кіраваньня (1991). Працаваў майстрам трэсту «Кандалакштрансбуд» у Мурманскай вобласьці (Расея), майстрам, прарабам, галоўным інжынэрам «Гомельсельбуду», інструктарам аддзелу будаўніцтва Гомельскага абкаму КПБ, потым 10 гадоў кіраваў Сьветлагорскім гарвыканкамам. У 1997—2001 г. першы намесьнік старшыні Гомельскага аблвыканкаму, старшыня гарвыканкаму. Быў дэпутатам ВС XII і XIII скліканьняў, палаты прадстаўнікоў першага скліканьня. Узнагароджаны ордэнам Пашаны.**

## На кантрасьце

Тое, што Васіль Даўгалёў будзе адпраўлены ў адстаўку, сакрэтам не было. У Берасьцейскай вобласьці самы нізкі паказьнік сярэдняга заробку па краіне, самы высокі ўзровень беспрацоўя — 3,9%. Толькі на 50% была летась выкананая дзяржаўная замова па бульбе. На пачатку году з Даўгалёвым сустракаўся Лукашэнка ды запатрабаваў выправіць усе недахопы да 1 сакавіка. Той ня здолеў.

І 9 сакавіка быў зьняты з пасады, на якую заступіў былы міністар Канстанцін Сумар. «Спачуваем берасьцейцам: ім ізноў не пашчасьціла», — хіталі галовамі Чыгір і Ярашук. Маўляў, пасьля Бурскага й Заламая вобласьць існуе без гаспадара. А між тым, ня факт, што не пашчасьціла. Так, Сумар — чалавек сяранны, непублічны, савецкі. Але ён, у адрозьненьне ад Даўгалёва, — спакойны, не нахабны, не гістэрычны, ня грубы. Тыя ж, хто працаваў зь ім у Берасьці, на раённым узроўні, добра пра яго адгукаюцца. Нават да такога: «Кіраўнік ад Бога».

Асабіста расстаўляе кадры, але можа працаваць і з ужо «расстаўленымі». Галоўнае — давер. Арганізуе працу так: прызначае кожнага падначаленага адказным за невялікі кавалак працы, ажыцьцяўляе з кожным штодзённую камунікацыю. Не прымае пасьпешлівых рашэньняў. Даступны, неганарысты, уважлівы, але патрабавальны. Ведае берасьцейцаў. А галоўнае — ня схільны да напалеонаўскіх плянаў, на што хварэў Даўгалёў. Сумар рухаецца пакрысе, мо таму і мае мэдаль «За працоўную доблесьць». Прыгадайма, як паступова, але няўхільна ўсталёўвалася і мацавалася падатковая машына. З Сумарам за стырном яна амаль забылася на халасты ход.

Уладзімер Ярмошын, калі Сумара прызначалі «на падаткі», адмыслова адзначыў «прынцыповасьць ды скрупулёзнасьць» новага кіраўніка. Даводзіцца і Сумару, натуральна, плаваць з астатнімі «ў адным моры»: Сумар уваходзіў у інфармацыйна-прапагандысцкую групу па Гарадзенскай вобласьці, а таксама зьяўляўся ўпаўнаважаным прадстаўніком прэзыдэнта па Гарадзенскай вобласьці. Затое ён, як і Аляксандар Якабсон з Гомелю, не ўваходзіць у склад савету рэспублікі, можа сканцэнтравацца на праблемах вобласьці. Іх пасьля Даўгалёва засталося безьліч.

## Чужынец

«Гэты чалавек можа на плянэрках крыкнуць матам на жанчынаў. Нейк у размове з адным падначаленым Саўчанка дазволіў сабе выказаць у запале: «Тваёй галавой цьвікі забіваць!» «Саўчанка да гэтай пары ўпэўнены ў тым, што ва ўсім сьвеце страшэнна не хапае харчаваньня», — расказваюць нядобразычліўцы ў Гарадзенскім выканкаме. «Тыповы кіраўнік з комплексам Захаду. Яму тут усё чужое. Вельмі баіцца інтэлігенцыі, а тым больш — Беларушчыны», — гаворыць Аляксандар Мілінкевіч.

Прынцып ратацыі кадраў прыдуманы Лукашэнкам, каб не ствараліся мафіёзныя кланы. Але ў дачыненьні да Горадні — заходняе сталіцы Беларусі — ён мае выгляд перастравуханьне гораду ў правіньцыю. Красамоўная дэталь: з трох мастацкіх галерэяў, якія там існавалі, хутка застанецца адна. І галерэя аб'ядананьня мастакоў, і прыватная галерэя «Ў майстра» вымушаныя зачыніцца праз немагчымасьць заплаціць за сьвятло, цяпло і ваду. Пакуль трымаецца прыватная галерэя «Тызэнгаўз». Саўчанка мяркуе: мастакі павінны самі зарабляць грошы.

У Горадні не засталося ніводнай беларускай клясы. Складана сабе ўявіць, што ў 1994 г. іх у горадзе было 75%.

Саўчанка выйшаў з аграрнікаў. Кіраваў калгасам. Кіраўніком быў сярэднім. Былы міністар сельскай гаспадаркі Васіль Лявонаў кажа, што з 400 старшыняў калгасаў сёньняшні гаспадар Гарадзеншчыны займаў недзе месца двухсотае. Яму б прыкласьці свае веды на новай пасадзе — Гарадзеншчына ж доўгія гады першынствавала ў аграрным кірунку сярод іншых абласьцей. Пераможныя традыцыі былі закладзеныя яшчэ пры Кляцкову, падоўжаныя пры Дубку. Але Гарадзеншчына — чужая зямля для Саўчанкі. І ён для гарадзенцаў чужы.

За апошні час кіраваньня Саўчанка атрымаў дзьве прэзыдэнцкія вымовы. Адну — тым жа ўказам, якім быў адпраўлены ў адстаўку Генадзь Навіцкі, а другую — сёлета, 29 студзеня, разам з астатнімі губэрнатарамі ды віцэ-прэм'ерам Цюцюновым, — за адставаньне ў будаўніцтве жылых дамоў. Саўчанку неспакойна з усіх бакоў. У Адміністрацыі прэзыдэнта ходзяць чуткі, што ён не ўтрымаецца на пасадзе да канца году, як і Дамашкевіч.

## Салдафон, але свой

Якабсон скончыў інстытут інжынэраў чыгуначнага транспарту, які лічыцца ў Беларусі адной з самых вялікіх «кадравых кузьняў». У сёньняшнім Беларускім дзяржаўным унівэрсытэце транспарту вучыліся старшыня КДБ Леанід Ерын, прэм'ер-міністар Сяргей Сідорскі, мэр Гомелю Лявон Барабанаў. Колькі гадоў Якабсон займаўся будаўніцтвам, потым яго сталі «піхаць» па партыйнай лініі і «запіхнулі» ў Сьветлагорск. Сказаць, што там яму было складана, — не сказаць нічога.

Якраз на ягонае кіраваньне прыпадае эпідэмія СНІДу. На пачатку 90-х колькасьць хворых рэзка вырасла, лік пайшоў на тысячы. На загад Якабсона «на вушы» былі пастаўленыя ўсе прытоны. Сытуацыю ўдалося ўзяць пад кантроль.

Пра Якабсона кажуць: жорсткі салдафон безь ніякага творчага пачатку. У параўнаньні зь мінулым кіраўніком вобласьці, Мікалаем Вайцянковым, ён прайграе па ўсіх рубрыкацыях. Вайцянкоў сумняваўся наконт слушнасьці агульнага дзяржаўнага курсу, спрачаўся з начальствам, з падначаленымі быў даволі мяккі, як чалавек — неканфліктны. Плюс добрая адукацыя. Якабсон жа — «верны ленінец» і ўсюды перастрахоўваецца. Немцы, палякі зьвярталіся да Якабсона з ідэямі цікавых інвэстыцыйных праектаў, але ён пазьбягаў сустрэчаў. Раз ён нават заклікаў «набрацца мужнасьці» ды адмовіцца ад пабрацімства Гомелю з гарадамі, якія не прыносяць прыбытку і карысьці, — напрыклад, з кітайскім Хуанем. І разгортваць пабрацімства з гарадамі Нямеччыны: «Ад гэтага кітайскага гораду толькі й карысьці, што на экскурсію туды зьезьдзіць».

Што добрага зрабіў на пасадзе кіраўніка Гомельшчыны? Заасфальтаваў вул.Савецкую. Скончыў рамонт будынку гарвыканкаму. Жартуюць: «Замест «Славы КПСС» надбудавалі «цюбяцейку»». То бок замест дэмантаванага надпісу савецкай эпохі зрабілі неахайную надбудову-нашлёпку.

Летась хадзілі чуткі, што Якабсона прызначаць пасламу ў Японію. Нават казалі аб атрыманьні агрэману, але потым гэтая інфармацыя не знайшла пацьвярджэньня, Якабсон застаўся на сваім месцы.

Наступны выпадак сьведчыць, што гаспадар Гомельшчыны — не гаспадар свайму слову. Паабяцаў ён падараваць кампутар 12-гадоваму хлапчуку Андрэю Толчкаву, чэмпіёну сьвету па шашках. Але потым тэхніка чамусьці заехала на іншы адрас — шахматна-шашачны клюб. Там і стаіць да гэтае пары.

А можа, падначаленыя падвялі? Бо ў старшыні аблвыканкаму столькі клопату: каардынаваць дзейнасьць гар- ды райвыканкамаў, праваахоўных органаў, вайсковых арганізацыяў, фінансавых ды банкаўскіх органаў, кіраваць грамадзянскай абаронай, садзейнічаць у працы КДБ і мытні. Курыраваць структурныя падразьдзеленьні аблвыканкаму: упраўленьне справаў; упраўленьне культуры; упраўленьне ўнутраных справаў; упраўленьне юстыцыі; упраўленьне па каардынацыі дзейнасьці адміністрацыйных органаў і вайскова-мабілізацыйнай працы. Забясьпечваць вынікі выбараў, біцца за ўраджай, вынішчаць апазыцыю…

Таму што вобласьць Беларусі — ня штат ЗША. І яе кіраўнік не выбіраецца, а прызначаецца, мае мінімум правоў і максымум абавязкаў. Калі аднолькава жывуць у Віцебску ды Гомелі — значыць, справа тут не ў старшынях.

**Зьміцер Дрыгайла**

# Шахматная беларусізацыя



ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

Вольф Рубінчык улетку 2003 г. быў звольнены з пасады заснавальнікам часопісу — выдавецтвам «Адукацыя і выхаваньне», бо... работнікам выдавецтва не спадабалася мова выданьня.

## Мова ў электрычках, судах

ТБМ дамаглося чарговай перамогі: у хуткім часе ўсе абвесткі ў электрычках будуць рабіцца па-беларуску. Дзеля гэтага спэцыялісты з Таварыства пераклалі ўсе тэксты — назвы населеных пунктаў, правілы бясьпекі, звароты да пасажыраў. «Мы іх яшчэ і перапрацавалі: уставілі, дзе маглі, словы «калі ласка» і «ласкава просім», якіх проста не было ў зваротах», — кажа намесьнік старшыні ТБМ Сяргей Кручкоў. Начальнік дэпо Беларускай чыгункі Алег Сідаровіч кажа, што справа павінна канчаткова вырашыцца да канца сакавіка: «Трэба толькі агучыць і перадаць у Маскву, дзе рабілася гэтая сыстэма. Там гукавы носьбіт умантуюць у сыстэму агучваньня». Агучваць будзе жанчына. З кандыдатурай пэўнасьці пакуль няма: магчыма, гэта будзе супрацоўніца радыё «Мір», якое рабіла тую ж працу для мэтро.

ТБМ точыць камень, але застаецца сфэра, дзе беларуская мова застаецца практычна па-за законам, — гэта суды. За апошнія гады адзіным працэсам, дзе судзьдзя карысталася беларускай мовай, стаў працэс па ліквідацыі праваабарончага цэнтру «Вясна». Сябар арганізацыі Ўладзімер Лабковіч атрымаў пасьля пратэстаў з нагоды закрыцьця «Вясны» штраф большы, чым іншыя, бо патрабаваў беларускамоўнага перакладчыка.

А часам у судах прадметам разгляду становіцца сама беларуская мова. Рэдактар часопісу «Шахматы» Вольф Рубінчык улетку 2003 г. быў звольнены з пасады заснавальнікам часопісу — выдавецтвам «Адукацыя і выхаваньне», бо... работнікам выдавецтва не спадабалася мова выданьня. Дакладней, не сама мова, а лексыка, якой карыстаўся Рубінчык.

Звольнены рэдактар з такім рашэньнем не пагадзіўся, справа ў лістападзе 2003 г. дайшла да суду. Па аргумэнты абодва бакі зьвярнуліся да мовазнаўцаў з навуковымі ступенямі. Выдавецтва — да выканаўцы абавязкаў дырэктара Інстытуту мовазнаўства НАН доктара філялёгіі, прафэсара Аляксандра Лукашанца, Рубінчык — да дацэнта катэдры гісторыі беларускай мовы БДУ, кандыдата філялёгіі Сяргея Запрудзкага.

Абодва экспэрты пагаджаюцца, што мова «Шахматаў» адхіляецца ад беларускай літаратурнай нормы, бяруць аднолькавыя прыклады, але высновы з гэтых прыкладаў робяць процілеглыя. Так, у словах «насамрэч», «досьвед», «сеціва» Лукашанец убачыў «неапраўданае ўжываньне лексычных адзінак, якія не адпавядаюць сучасным нормам слоўваўжываньня, што замацаваны ў слоўніках», Запрудзкі лічыць іх словамі, якія, «выкарыстоўваючыся ў сучасным друку, (пакуль) не зафіксаваны ў афіцыйных беларускіх слоўніках». Гэтаксама С.Запрудзкі, у адрозьненьне ад А.Лукашанца, ня лічыць памылковым ужываньне формаў і словаў з «размоўным і архаічным адценьнем (файна, тамака, у залі, вакацыі, іхні, раскажэце)», бо гэта робіцца для стварэньня пачуцьця нязмушанасьці, «неказённай» размовы, якую вядзе рэдактар з чытачом. «Тут больш пытаньне схільнасьці й густу, а ня права», — робіць урэшце ён выснову.

Выходзіць, Інстытут мовазнаўства ў асобе свайго кіраўніка вызнае рэпрэсіўную мэтодыку: чаго няма ў слоўніках, няма і ў літаратурнай мове! І дарма што мова — жывы арганізм, які вольна дыхае і разьвіваецца. Дый як даваць сур'ёзнасьці аргумэнтаў Лукашанца пра словы, не «замацаваныя ў слоўніках беларускай мовы», калі сам ён у сваім водгуку ўжывае слова «абложка» (у сэнсе «вокладка») — во ўжо слова, якое дакладна не фіксуецца беларускімі слоўнікамі. І суд, дарэчы, прыняў пазыцыю Лукашанца, а не Запрудзкага.

**Аркадзь Шанскі**

З УСЁЙ КРАІНЫ

### Лятарэя «Пабор»

Ужо завядзёнкай сталі ў нас грашовыя паборы на розныя патрэбы з дапамогай лятарэяў. Лятарэя «Прыдзьвіньне», заснаваная Віцебскім аблвыканкамам, асаблівай папулярнасьцю ў жыхароў вобласьці не карыстаецца. Таму апошняя надзея — на бюджэтнікаў-кантрактнікаў. Цяпер іх прымушаюць набываць лятарэйныя квіткі коштам 2000 руб., дый не па адным. Напрыклад, аддзелу культуры Аршанскага гарвыканкаму загадана распаўсюдзіць 600 квіткоў, прычым ва ўстановах культуры гораду працуе крыху больш за 400 чалавек. Застаецца толькі спадзявацца на ўдачу.

### Гаркам валіцца

Шмат якія ўстановы культуры ў Воршы тэрмінова патрабуюць капітальнага рамонту. Да нядаўняга часу першым прэтэндэнтам на рэканструкцыю была цэнтральная гарадзкая бібліятэка імя Пушкіна, адчыненая ў 1959 г. Хутка праз шчыліны ў сьценах у яе будуць залятаць дробныя птушкі. Але цяпер зь ёй паспрачаецца Дзіцячая школа мастацтваў №1. Яе трохпавярховы будынак быў здадзены ў эксплюатацыю ў сярэдзіне 1980-х. Там месьцілася галоўная ўстанова гораду — гаркам КПБ. У студзені 1992 г. шыкоўны будынак быў перададзены таленавітым дзецям.

Асаблівых зьменаў ні звонку, ні ўсярэдзіне за гэты час не рабілі, хіба ў вэстыбюлі на пастамэнце замест галавы Леніна паставілі гіпсавую галаву мікелянджэлаўскага Давіда. Два тыдні таму цэнтральны ўваход у школу быў зачынены, бо па апорнай бэльцы прайшла вялізная расколіна. Цяпер вучні і выкладчыкі вымушаныя трапляць у будынак праз запасны выхад. Але некалькі дзён таму раптоўна абваліўся бэтонны лесьвічны пралёт. Дзякуй Богу, нікога ў той момант на лесьвіцы не было. Дзе і што абваліцца ў будынку былога гаркаму ў наступны раз, на жаль, невядома.

### З рабінам весялей

Значная і радасная падзея адбылася ў жыцьці аршанскіх габрэяў. Упершыню за апошнія 70 гадоў на вясёлае сьвята Пурым зь імі маліўся рабін. 24-гадовы грамадзянін Ізраілю прыехаў у Воршу разам з жонкай і немаўляткам.

Выхаваныя ў савецкія атэістычныя часы, аршанскія габрэі ня ведаюць ні рэлігійных звычаяў, ні роднай мовы, таму разам з рабінам прыехаў і перакладчык. Цяпер аршанскае культурна-дабрачыннае таварыства «Шалом», якое аб'ядноўвае больш за 300 габрэяў, зьбіраецца набыць будынак пад сынагогу.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

### Будуюць, абы будаваць

У Магілёўскай вобласьці за пэрыяд з 1 студзеня 2000 да 1 сьнежня 2003 г. у сельскай мясцовасьці ўведзена ў эксплюатацыю 4156 кватэраў, ці 67,6% ад заплянаванага праграмай будаўніцтва жыльля. Набытыя 142 пустыя дамы. У выніку палепшыла жыльлёвыя ўмовы 2231 сям'я (33% ад колькасьці сем'яў, што стаяць на ўліку на атрымальне жыльля ў сельскай мясцовасьці).

Але рэальная карціна патрэбаў у будаўніцтве жыльля на вёсцы ў райвыканкамах адсутнічае. І часам назіраюцца сытуацыі, калі жыльлё пабудавана, а жыць няма каму. Так, пасьля ўвядзеньня ў кастрычніку 1999 г. у эксплюатацыю ў вёсцы Баянава Глускага раёну дзьвюхкватэрнага дому туды былі заселеныя дзьве сям'і. Аднак у сувязі зь ліквідацыяй у гэтай вёсцы фэрмы абедзьве сям'і выехалі за межы раёну. У выніку кватэры пустуюць, а гаспадарчыя пабудовы часткова раскрадзеныя.

У 15 гаспадарках Глушчыны не хапае 85 спэцыялістаў, а патрэба ў кадрах на 2004—2005 г. складае 109 чалавек. Пры наяўнасьці даўгабудаў у леташнюю праграму будаўніцтва былі ўключаны 282 новыя аб'екты жыльля.

Спэцыялісты дзяржкантролю выявілі незаселеныя і неразьмеркаваныя, у тым ліку на працягу доўгага часу, жылыя дамы, пабудаваныя ці набытыя за кошт крэдытных рэсурсаў.

**Ігар Кірын, Глуск, паводле газэты «Зямля і людзі»**

### Падселяць да Паўлаўкі і ЛПП

Лясная вёсачка Паўлаўка, дзе пражывае чалавек дванаццаць пэнсіянэраў, у вайну была партызанскай базай. Пазьней паблізу ў лесе атабарылася вайсковая часьць стратэгічнага прызначэньня, строга засакрэчаная. Пасьля распаду СССР вайскоўцы выбраліся ў Расею. А ў апусьцелых казармах і гаспадарчых будынках некалькі гадоў таму адкрылі УЖ 15/25 — калёнію для асуджаных за крымінальныя злачынствы. Частка будынкаў пуставала, і на іх кінула вока Міністэрства ўнутраных справаў — там са згоды аблвыканкаму вырашана адкрыць прафіляхторый для ўтрыманьня хранічных алькаголікаў, дзе яны павінны праходзіць лячэньне і працатэрапію. Будынкі ўжо прыстасоўваюць пад ЛПП. На гэта выдаткаваныя сродкі з абласнога і раённага бюджэтаў.

Установа разлічана на адначасовае знаходжаньне 250 чалавек. Мясцовыя ўлады маюць надзею выкарыстоўваць іх у пік палявых работ у найбліжэйшых калгасах як падсобную сілу. Суседзтва з заалькаголеным «лягерам» не прыбавіць настрою састарэлым жыхарам вёскі, што ад жылі свой век у цішы ў атачэньні дрымучага бору.

**Міхась Кутнявецкі, Слуцак**




ХРОНІКА АПАЗЫЦЫІ

11 сакавіка Калегія Вярхоўнага суду адмовіла ў задавальненьні касацыйнай скаргі **ГА «Незалежнае таварыства прававых дасьледаваньняў»**, ліквідаванага 29 студзеня 2004 г. Актывіст «Зубра» Іван Васікаў быў затрыманы ў Менску 11 сакавіка падчас раздачы нумару газэты «Супраціў»: у РУУС Цэнтральнага раёну на яго склалі пратакол за распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных зьвестак. У Барысаве 11 сакавіка пасьля акцыі «Стоп лукамол» затрымалі актывіста кааліцыі «Свабодная Беларусь» **Зьмітра Бародку**, грамадзкага дзеяча **Ігара Ледніка**, а таксама лідэра мясцовага «Зубра» **Алеся Моніча**: у пастарунку на ўсіх склалі пратаколы за несанкцыяваную вулічную акцыю. А.Моніча 12 сакавіка звольнілі з Барысаўскага заводу агрэгатаў, дзе ён працаваў кандытарам. 12 сакавіка Наваполацкі гарвыканкам чарговы раз прыняў рашэньне аб адтэрміноўцы рэгістрацыі аргструктураў **Свабоднага прафсаюзу Беларускага** — СПБ змагаецца за рэгістрацыю ўжо некалькі месяцаў. 15 сакавіка ў Віцебску падчас вулічнай акцыі былі затрыманыя актывісты КХП-БНФ **Уладзімер Плешчанка** і **Аляксандар Салаўян**, у той самы дзень іх асудзілі ў Чыгуначным раённым судзе, абвясьціўшы судовае папярэджаньне. 15 сакавіка ў Баранавічах мусілі адбыцца суды над актывістамі «Зубра» **Настай Васіленкай**, **Аляксеем Ляўковічам** і **Мікітам Сасімам**, якіх міліцыянты затрымалі 8 сакавіка за нашэньне значкаў зь лягатыпам «Зубра»: маладых людзей абвінавацілі ў дзейнасьці ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Судзьдзя Мікалай Кміта, які 10 сакавіка асудзіў М.Сасіма на 10 сутак, адправіў пратаколы ў міліцыю на дапрацоўку. Актывістцы «Зубра» **Кацярыне Банкевіч** з Баранавічаў, затрыманай падчас раздачы ўлётак 9 сакавіка, камісія ў справах непаўналетніх 15 сакавіка прысудзіла штраф 17.500 руб. 16 сакавіка ў Баранавіцкую камісію ў справах непаўналетніх выклікалі актывіста Баранавіцкай філіі «Зубра» **Сяргея Палішчука**: у ноч на 15 сакавіка яго затрымалі міліцыянты па падозраньні ў нанясеньні графіці. Пры затрыманьні яму далі пару кухталёў, але пратаколу аб правапарушэньні не складалі. На паседжаньні камісіі хлопца папярэдзілі, што ён будзе несьці адказнасьць за ўсе дзеяньні «Зубра» ў Баранавічах. 16 сакавіка ў Баранавічах падчас раздачы бюлетэню «Зубр-Баранавічы» былі затрыманыя актывісты «Зубра» **Наста Васіленка** і **Зьміцер Шчэпаў**. На іх склалі пратаколы за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі і ў той самы дзень асудзілі на 10 базавых адзінак кожнага.

**АШ**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Гаспадар фэрмы ў Смургонях забясьпечвае горад мясам і працай, адраджае вытворчасьць на спадчынных землях Міхала Клеафаса Агінскага і пасьмейваецца са сталіцы.**

# Спадар са Смургоняў

Смургоні — адзін з тых беларускіх гарадкоў, пра якія ня скажаш, што «тут застыла жыцьцё». Цэнтар зіхаціць сьвежым «эўрарамонтам», на галоўным «праспэкце» вісяць рэклямныя банэры апэратараў мабільнай сувязі, а на бакавых вулічках час ад часу ўбачыш, як новая «іншамарка» абганяе нясьпешныя калёсы. Нават непахісны маналіт раённай дошкі гонару ўспрымаецца па-новаму. Цяпер у перадавіках вытворчасьці — Віктар Валадзько, прадпрымальнік, уладальнік фэрмэрскай гаспадаркі «Спадар».

Да самога спадара Валадзька было не датэлефанавацца. Як пазьней высьветлілася, ён папросту забыўся свой «Alcatel» у машыне. Яно й зразумела: Валадзько — не кабінэтны работнік. Ён кіруе працай не праз тэлефон, а адразу на месцы. «Больш газу — менш ямаў!» — камандуе Валадзько, і ягоны «Мэрсэдэс» паслухмяна нясе нас па засьнежанай дарозе за горад.

Пад'яжджаем да фэрмы. «Гэта цяпер зіма, а летам тут прыгожа, сьцягі вывешваем, усюды клюмбы, ружы квітнеюць. Усюды чыста і дагледжана, гэта дысцыплінуе людзей», — гаворыць гаспадар. Каля варотаў валун з надпісам «Спадар» — як сьведчаньне таго, што гаспадарка, заснаваная сем гадоў таму, задумана сур'ёзна і надоўга.

## Нараджэньне «Спадара»

Пачалося ўсё ў 1988 г., калі Валадзько скончыў наргас і прыйшоў на працу ў «Сельгасхімію». Патроху заняўся арганізацыяй падсобнай швейнай вытворчасьці, захапіўся і ў хуткім часе заснаваў фірму «Вікор». Для таго каб падтрымаць швейны бізнэс, прыйшлося гандляваць прадуктамі. У першую чаргу мукой і цукрам. Цэны ставілі мінімальныя, затое прадавалі не кіляграмамі, а мяхамі.

Тады ж Валадзько прыкмеціў напаўразваленыя будынкі саўгасу «Смургонскі» на ўскраіне гораду. Нядоўга думаючы, прадпрымальнік пераабсталяваў безгаспадарныя развалюхі пад фэрмы, закупіў 200 сьвіней. Так «Вікор» стаў «Спадаром».

Сёньня ў «Спадары» гадуюць 2,5 тыс. галоў сьвіней у год. «Штогадова нам патрэбна 3,5—4 тысячы галоў, таму будзем далей разьвівацца», — абяцае Валадзько. «Спадар» адчыніў у горадзе дзьве ўласныя мясныя крамы. Стары гандлёвы шапік ператварыўся ў крыты мінірынак, які «дасьць фору» многім сталічным па чысьціні і сучаснасьці. Побач пабудавалі аўтастаянку на 200 месцаў. Міні-рынак і паркоўку здалі летась увосень. На гэта пайшло 115 млн рублёў. Акрамя таго, «Спадар» атрымаў ліцэнзію на нарыхтоўку лісічак і пабудаваў лядоўню для грыбоў.

## Спадкаемца Агінскага

Заўважыўшы посьпехі Валадзька, раённая гаспадарка ўхапілася за яго як за выратавальнае кола. Тры гады ўладальніка «Спадара» ўпрошвалі ўзяць пад сваё крыло адну са шматлікіх бядотных гаспадарак Смургоншчыны. «Мне й самому было неяк крыўдна: у нас усё разьвіваецца, а там на ходу ўсё разvальваецца», — дзівіцца Валадзько.

Урэшце ўгаварылі: год таму фэрмэру дастаўся калгас імя Леніна, раённы рэкардсмэн па плошчах і стратнасьці. Прыкладна 60% земляў былога калгасу некалі належалі Міхалу Агінскаму, таму створаную фэрмэрскую гаспадарку назвалі «Агінскае».

Новаму гаспадару прыйшлося замяняць практычна ўсё — ад стрэхаў на фэрмах да «дворнікаў» на трактарах. Усё гэта ў асноўным за грошы «Спадара». Комплекс калгасу імя Леніна разьлічваўся на 4,5 тыс. галоў сьвінак і на дойны статак у 700—800 кароў. У «Агінскім» пакуль вырошчваюць 2000 галоў на адкорм і 600 галоў дойнага статку. Запусьцілі фэрму матачнага пагалоўя — 160 сьвінаматак штомесяц прыносяць па 250 парасятаў.

Практычна ўсё, што вырабляецца ў «Агінскім», здаецца дзяржаве: малако — на малаказаводы, жывёла — на мясакамбінаты. А вось прадукцыя «Спадара» ідзе ня толькі на продаж закупачным фірмам, але і на ўнутраны рынак — у Смургоні. Аматараў мяса ад «Спадара» дастаткова. Раніцай, калі новую прадукцыю завозяць у крамы і на міні-рынак, па яе нават чэргі выстройваюцца. Праўда, на кілбасах і пакунках з фаршам пакуль што няма фірменных этыкетак: продажы яшчэ не такія вялікія, каб весьці іх пад уласнай маркай. Аднак Валадзько ўпэўнены, што з часам «Спадар» прыйдзе й да гэтага. Тым больш што патэнцыял для росту ёсьць. Сёньня «Спадар» вырабляе 250 т мяса штогод. А магчымасьці рэалізацыі — 350—400 т.

Самая галоўная праблема — пазыкі. На «Спадары» да гэтага часу «вісяць» крэдыты пяцігадовай даўніны. Аддаваць прыходзіцца і запазычанасьці, і працэнты, і судовыя выдаткі, — агульная пазыка «Спадара» роўная 1,5 млрд рублёў. «Пагасілі 440 мільёнаў, а яно нават не заўважна. Выходзіць, год адпрацавалі — і зноў пачынаем з нуля», — разводзіць рукамі Валадзько.

## «Ня цягнуць»

«Спадар» і «Агінскае» даюць працу тром сотням чалавек. Карпаратыўная культура па-смургонску — значыць вітацца з усімі за руку, лічыць гаспадар. З ангару выходзіць хлопец у пыльнай ватоўцы.

«Талковы хлапец, — кажа нам Валадзько. — Будучы кіраўнік. У Германію пашлю досьведу набірацца». Зрэшты, Аляксей Сяргееў, які вывучае вэтэрынарную мэдыцыну ў Віцебску, у Нямеччыне ўжо пабываў. «Бачыў там на фэрме ўстаноўку: кампутар фіксуе тэмпэратуру і, калі яна занізкая, паветра падаграецца гарэлкамі аўтаматычна. Сюды б яе паставіць», — марыць ён.

Аднак па тэхналёгіі езьдзяць і да нас. У «Спадары» гасьцявалі фэрмэры з Баварыі, цікавіліся апілкавым утрыманьнем сьвіней. Подсьціл зь пілавіньня добра грэе і абыходзіцца нашмат таньней за высокатэхналягічныя «штучкі».

Спосаб арыентацыі на мясцовасьці па паху ў «Спадары» не праходзіць. Чысьціня ідэальная. Цёпла. Над паілкамі — яловыя галінкі. «Яны выдзяляюць фітанцыды, якія забіваюць бактэрыі, а яшчэ ідуць на падкормку сьвіньням — дадатковыя вітаміны», — тлумачыць Аляксей.

Плаціць Валадзько працаўнікам ня больш і ня менш, чым у сярэднім па Смургонях. Чым большая прыбаўка ў вазе па гаспадарцы, тым вышэйшы заробак. Ад 8-й да 17-й працоўны дзень, два выходныя. «Ня цягнуць?» — пытаемся ў Аляксея. «Такога няма. Тут усе ведаюць, за што атрымліваюць грошы. Калі што ня так, заўсёды ясна, з каго спытацца», — адказвае ён.

## Смачна есьці!

«За мінулы год у мяне пайшло каля 20 мільёнаў на добраўпарадкаваньне гораду да 500-годзьдзя. Цяпер Смургоні — эўрапейскі горад, — гаворыць Валадзько. — А яшчэ горад у нас вельмі камэрцыйны, тут больш за 40 фэрмэрскіх гаспадарак». Аднак гаспадару «Спадара» і «Агінскага» гэта не замінае. Здаровая канкурэнцыя павінна быць, гэта заахвочвае, лічыць ён.

Паспытаць плёну нялёгкай працы можна ў кавярні-бары «Спадар». Каштуе гэта паводле сталічных мерак нядорага. 1-ы комплексны абед — таньнейшы. Салата «Нясьвіская», боршч са сьвежай капусты, сьвініна па-француску, бульба-фры, гарбата і хлеб. Для гурманаў — бліны па-смургонску (сьвініна ў драніках па 2950 руб. за порцыю вагою пад траціну кіляграму).

«У кавярні ў нас усё сваё, — тлумачыць Валадзько. — Робім кілбасу, салца, паўфабрыкаты, усё сваімі сіламі. Адзін бычок ідзе на два дні, 3—5 парсюкоў. Бульбу, капусту, моркву — усё самі вырошчваем».

VIP-заля кавярні ўпрыгожаная воўчымі футрамі. Праўда, у цэлым атмасфэра тут не элітарная, а дэмакратычная. Сам гаспадар часьцей абедае ў агульнай залі, куды заходзяць перакусіць і мясцовыя бізнэсоўцы ў кажушках, і стомленыя даяркі.

Апошні штрых: бар пасьпяхова праходзіць тэст на наяўнасьць у прыбіральні вадкага мыла, туалетнай паперы і сушылкі для рук на фотаэлемэнтах. «Нават у Менску так ня скрозь», — дзівімся мы. «Дык хіба Менск — гэта крытэр?» — жартоўна абураецца Валадзько. Мы моўчкі згаджаемся, тым больш што пах сьвініны па-француску запрашае перайсьці ад слоў да справы.

**Алесь Кудрыцкі, «Лідэр»**

# Праект БНР

**Нават калі на маім стале застанецца адзін толькі гэты праект Будслаўскае беларускае гімназіі, я застануся грамадзянінам БНР. Бо гэта прыгожа.**

У чым найвялікшая заслуга творцаў Беларускай Народнай Рэспублікі? Першы адказ, што напрошваецца: яны справакавалі стварэньне БССР і, урэшце, сёньняшняй беларускай дзяржаўнасьці. Нехта бачыць у самім факце існаваньня БНР і яе ўраду на выгнаньні сымбаль несавецкае Беларушчыны. Але перадусім традыцыя БНР — гэта традыцыя маральнасьці.

Людзі, якія стаялі ля яе вытокаў, не выкарыстоўвалі крайніх сродкаў, не распальвалі міжэтнічнае варожасьці, нават пра «разрыў» сувязяў між Беларусяй і Расеяй заявілі толькі пасьля ратыфікацыі Берасьцейскага міру на Ўсерасейскім зьезьдзе саветаў.

Айцы беларускае незалежнасьці імкнуліся дамовіцца з усімі бакамі, з нацыянальнымі меншынямі. Ня здолелі. Ня іхная ў тым віна.

Наагул, peралічваць, што і як маглі б зрабіць дзеячы БНР у 1918 г., — справа марная. Урэшце, у іх была толькі адна альтэрнатыва: абвяшчаць на цэлы сьвет, што край наш жывы й прагне быць «вольнай і незалежнаю» дзяржаваю, альбо... не рабіць нічога. Можна было прыняць як належнае «аб'ектыўную» сытуацыю, у якой нам не было месца на мапе сьвету. Альбо рабіць усё магчымае зь нічога.

Для параўнаньня: калі за царом не было ніводнае беларускае школы, дык пасьля абвяшчэньня БНР адчыніліся сотні беларускіх школаў, 4 гімназіі, настаўніцкая сэмінарыя,




а ўрэшце й уласны Пэдагагічны інстытут у Менску. За лічаныя месяцы!

Ажно сьцiскае горла, калі сёньняшнія палітыкі, нашыя сучасьнікі, узалежніваюць культурныя праекты ад імгненнае палітычнае аддачы.

Калі гляджу на праект пабудовы Будслаўскай беларускай гімназіі Лява Вітан-Дубейкаўскага, датаваны «VI.1918», думаю зусім не пра тое, хто й дзе прызнаваў БНР, ці былі ў яе мытня й армія. Я думаю пра тое, як верылі гэтыя людзі ў справядлівасьць і маральнасьць сваёй працы. Нават ва ўмовах ваеннага часу яны перадусім дбалі пра школьніцтва, асьвету, культуру, друк. Яны былі верныя сваім хлапечым марам. Рыхтык як у раманах. Яны не зьбіраліся найперш кагосьці «паражаць» у правох ці квітацца з ворагамі.

Шляхетна й годна Леў Вітан-Дубейкаўскі ў аксамітным барэце прыступае да выкананьня «заданьня» — стварыць праект першае ў сьвеце беларускае гімназіі. Праект выходзіць ахайны й прыгожы. Дынамічная кампазыцыя з чатырох даховачных стрэшак, шмат-шмат сьвятла ды акуратненькія ўваходы-ганачкі з калёнкамі. Я, прынамсі, хацеў бы, каб мае дзеткі хадзілі ў гэткую школку. Нават калі на маім стале застанецца адзін толькі гэты праект Будслаўскае беларускае гімназіі, я застануся грамадзянінам БНР. Бо гэта прыгожа.

Дубейкаўскаму ў чэрвені 1918 году было калі не 48, дык 50 гадоў. Нямала для бізнэсоўца, чалавека з рэпутацыяй, уласнымі бюро й фундамэнтальнай адукацыяй.

Ня быў падлеткам-«мушкетэрам» і галоўны рэдактар праекту дзяржавы Іван Луцкевіч. Яму было 37 гадоў. І ён зьдзейсьніў гэта. На сваім нядоўгім вяку ён на ўласныя вочы пабачыў узьлёт «сакалінае сям'і» да зьзяючых даляглядаў нашае будучыні.

Натуральна, ім тады хацелася як мага хутчэй *ствараць*. Не пазіраць з плюгкаю ўсьмешкаю скрозь бароды, мовячы: «Колькі нам разбураць... Болей раз-з-збураць!» Ня кідацца ў пошукі тых самых, якія — «о-о-о, якія вы наіўныя!...» — нас вось гэтым і гэтым зьнішчаюць. Не прыцягваць да адказу тых, што...

Не, яны закасалі рукавы й селі за сталы. Праектуючы, выдумляючы, творачы тое, у што шчыра верылі ўсе гады. Бясконца доўгія, марныя й бясплённыя гады. Да 25 сакавіка 1918 году. Толькі тое нам і засталося. І нават будынак гімназіі. У тым самым Будславе.

**Сяргей Харэўскі**

# Выклікі для нашае нацыі

Працяг са старонкі 1.

Да гэтых задавальненьняў трэба дадаць штораз большую ўпэўненасьць нашай моладзі ў слушнасьці незалежніцкіх пазыцыяў, штораз большую веру яе ў ідэалы 25 Сакавіка, дэмакратыі і правоў чалавека. Хачу тут сказаць ліцэістам, новым «зубрам» у Баранавічах і ўсім Алегам Шэлеставым і Мікітам Сасімам у Беларусі, што я заўсёды пакладала на іх надзею і што веру ў іхнюю канчатковую перамогу.

Усе гэтыя фактары ўважаю важнымі. Бо яны паказваюць, што Беларусь адродзіцца сваімі сіламі, калі сьвет ёй паспрые.

**«НН»: Якія страты і няўдачы за апошні год засмуцілі вас найболей?**

**І.С.:** Вельмі засмуцілі сьмерці Васіля Быкава, выдатных беларускіх патрыётаў, сяброў Рады БНР Міхася Наўмовіча і Віталя Кажана. Перажываю штодзённыя атакі рэжыму супраць усяго беларускага, як у выпадку з Нацыянальным ліцэем.

Затое, як выглядае, штораз болей людзей выступае ў абарону Беларушчыны. Магчыма, з нашай традыцыйнай пасіўнасьцю і талерантнасьцю яны ня бачылі б патрэбы гэта рабіць, каб не адчувалі такой несправядлівасьці і такога зьдзеку з усяго, што ім дарагое. Выглядае, улада забылася пра эфэкт бумэранга.

**«НН»: Мы жывём у час, калі некаторыя суседнія краіны перажываюць пэрыяд палітычнае стабільнасьці і эканамічнага пад'ёму ды ад рашэньня ўнутраных праблемаў пераходзяць да пашырэньня сваіх палітычных ды эканамічных уплываў на суседзяў, ставяць сабе такія задачы. А Беларусь застаецца ў міжнароднай ізаляцыі, унутрана расколатаю. Якія небясьпекі для нацыі здаюцца сёньня Вам найбольшымі? Што магла б процiпаставіць ім Беларусь?**

**І.С.:** Найбольшай небясьпекай уважаю ўцяпер закрыцьцё межаў між Беларусяй і яе найбліжэйшымі суседзямі, якія далучаюцца да Эўразьвязу. Пра гэта я казала ў Вільні ў ліпені 2002 г. кіраўнікам Літвы. Трэба бачыць розьніцу паміж Лукашэнкам і беларускім народам, нельга людзей адсякаць ад Эўропы ўзмоцненым візавым рэжымам. Праўда, апошнім часам Польшча і балтыйскія краіны праняліся лёсам Беларусі. Магчыма, ня столькі ў імя нейкай справядлівасьці, а таму, што для іх папросту выгадней, каб Беларусь заставалася незалежнай. Каб межаваць зь Беларусяй, а не з Расеяй.

А нашай мэтай мусіць быць дэмакратыя і ўваход у Эўразьвяз.

Пазбыцца дыктатуры, заняць тое пачэснае месца, якое беларускаму народу належыцца між дэмакратыямі Эўропы, і ёсьць тым выклікам для нашае нацыі, на які мы мусім адказаць. Мадэрнізацыя прамысловасьці, рэформа адукацыі, рэформа сыстэмы аховы здароўя, аднаўленьне зьнішчанай прыроды, ліквідацыя наступстваў Чарнобылю — усё гэта будзе на парадку дня вольнай, незалежнай Беларусі.

**«НН»: Увосень краіну чакае выбарчая кампанія. Розныя палітычныя сілы адстойваюць розныя формы ўдзелу ці байкатуюць яе. Якая пазыцыя Рады БНР у гэтым прынцыповым для палітычных працэсаў пытаньні?**

**І.С.:** Рада БНР не прызнае «палаты» за легітымны парлямэнт, а «канстытуцыю», паводле якой яна ўтвораная, — за легітымную Канстытуцыю Беларусі. Новая «палата» ня мусіць быць скарыстаная ў мэтах узмацненьня аўтарытарызму ды ліквідацыі Незалежнасьці Беларусі.

Адзінае, што магу дадаць: будзем вымагаць ад урадаў сьвету максымальна шчыльнага нагляду за працэдурай агітацыі і галасаваньня.

**«НН»: Гэты год будзе годам 80-годзьдзя з Дня нараджэньня Васіля Быкава. Раскажэце, калі ласка, як беларусы сьвету будуць ушаноўваць гэтага выдатнага беларускага пісьменьніка.**

**І.С.:** Рада БНР, і наагул дыяспара, дапамагала спадару Васілю пры жыцьці. У мяне засталіся надзвычайныя ўражаньні ад асобы Васіля Быкава, гэта адзін з найвыбітнейшых людзей, зь якімі мне пашчасьціла быць знаёмай. Сьмерць Васіля Быкава ўсьведамляецца беларускай дыяспарай як вялікая страта. Мне падаецца, што ўшанаваньне ягонай памяці не павінна мець характар «кампаніі» і прымяркоўвацца да нейкай канкрэтнай даты. Цяпер мы абавязаныя данесьці да людзей быкаўскае слова, бо, як мы ведаем, гэтаму ў лукашэнкаўскай Беларусі ёсьць вялікія перашкоды. У Канадзе выходзіць кніга інтэрвію прафэсаркі Зінаіды Гімпелевіч з Васілём Быкавым. У Празе пад рэдакцыяй Сяргея Навумчыка падрыхтаваная кніга «Быкаў на «Свабодзе». Гэта, я думаю, толькі пачатак. Вядома, у чэрвені юбілей Васіля Быкава будзе адзначацца ў беларускіх асяродках як у Эўропе, гэтак і ў Паўночнай Амэрыцы.




Мы заўсёды будзем памятаць, што Васіль Быкаў лічыў Акт 25 Сакавіка 1918 г. найважнейшай падзеяй у гісторыі краіны. Ягонае жыцьцё застанецца прыкладам вернасьці і адданасьці Бацькаўшчыне для кожнага беларуса.

**Гутарыў Андрэй Дынько**

# Праграма сьвяткаваньня

Сьвяткаваньне Дня Волі сёлета расьцягнецца на цэлы тыдзень — з 20 да 27 сакавіка. Прычым самая першая імпрэза адбудзецца **ў Маскве**. 20 сакавіка а 13-й у памяшканьні аддзелу нацыянальных літаратураў Някрасаўскай бібліятэкі (каля мэтро «Прафсаюзная», Нахімаўскі праспэкт, 49) для Грамады беларускай культуры будзе сьпяваць бард Зьміцер Бартосік.

У нядзелю, 21-га, а 16-й на сядзібе Партыі БНФ (**Менск**, вул.Варвашэні, 8) адбудзецца адкрыцьцё выставы дзьвюх мастачак — старшыні Рады БНР Івонкі Сурвіллы й дачкі народнага паэта Беларусі Ілоны Барадулінай.

**У Слоніме** 21-га ж з 11-й да 13-й гарадзкой суполкай Партыі БНФ заплянаваны мітынг (ля рынку на вул.Берасьцейскай), а таксама ўскладаньне кветак да помніка Міхалу Валовічу ў вёсцы Парэчча. 24 сакавіка маладафронтаўцы мяркуюць усталяваць крыж у гонар паўстанцаў Тадэвуша Касьцюшкі ў Косаве (па дарозе на Сынкавічы).

**У Беластоку** сьвяткаваньне чарговай гадавіны БНР арганізуе Беларускі саюз у Польшчы. Імпрэза пачнецца 21-га а 13-й у верхняй залі кавярні «Цэхова» (вул.Варшаўская, 4/6).

Найбольшыя сьвяткаваньні, натуральна, прыпадуць на 25-га. У Менску вялікіх вулічных акцыяў ня будзе. Дзень Волі **ў сталіцы** вяртаецца ў напаўзабытыя формы сярэдзіны 90-х: канцэрты ў залях, ускладаньне кветак да помнікаў. Толькі ня прыйдуць на гэтыя ўрачыстасьці ні кіраўнік дзяржавы, ні старшынька Рады БНР, як гэта было, напрыклад, у 1993 г. падчас 75-гадовага юбілею абвяшчэньня БНР.

А 17-й пачнуцца «народныя гуляньні» каля Ратушы (плошча Свабоды). Адтуль удзельнікі сьвяткаваньня пройдуць да помніка Янку Купалу ў аднайменны сквэр, дзе а 18-й ускладуць кветкі.

Імпрэзаў будзе ажно дзьве — у Доме літаратара і Доме вэтэранаў. У Доме літаратара ў 18.30 зьбяруцца паэты, празаікі, барды. Вечарына, якую рыхтуе Мазынскі, мае быць больш «музычнай» — з ансамблем «Харошкі», дуэтам «Аляксандра і Канстанцін», гуртом «Стары Ольса», Лявонам Барткевічам.

Кансэрватыўна-хрысьціянская партыя БНФ заплянавала традыцыйную навуковую канфэрэнцыю, прысьвечаную гадавіне БНР. Што праўда, пакуль партыя мае цяжкасьці з памяшканьнем.

Дзеля сымбалічнасьці сьвята Рада беларускай інтэлігенцыі прапанавала менавіта 25-га палітычным партыям падпісаць пагадненьне па каардынацыі намаганьняў у барацьбе за парлямэнцкія месцы.

А Беларускі ПЭН-Цэнтар у гэты дзень падвядзе вынікі першага туру конкурсу маладых літаратараў «Твор пра каханьне», прысьвечанага юбілею Пэтраркі.

Правінцыя, у адрозьненьне ад сталіцы, аддае перавагу вулічным акцыям. Так, **у Баранавічах** 25-га адбудзецца ўскладаньне кветак да крыжа «Ахвярам гвалту» — палітрэпрэсаваным XX ст.

**У Віцебску** актывісты «Пяцёркі+» арганізуюць раздачу віншавальняў і ўлётак жыхарам гораду, моладзь рыхтуе сваю віншавальную акцыю а 14-й на пляцы Волі.

**У Гомелі** сьвяткаваньне мае адбыцца а 12-й на плошчы Леніна.

Гарадзенская маладафронтаўская суполка едзе ў Зэльву, да магілы Генiюш. У самой жа **Гародні** адбудзецца раздача віншавальных улётак і ўскладаньне кветак да будынку, у якім месьціўся ўрад БНР да ад'езду за мяжу (цяпер вул.Горкага, 2).

Як заўсёды, шырока будуць адзначаць Дзень Волі ў дыяспары. «Выязную сэсію» пляную «Малады фронт» — **у Вільні.** Актывісты арганізацыі разам зь беларускімі студэнтамі Віленскага пэдуніверсытэту маюць пікетаваць беларускае і расейскае пасольствы.

Пікет каля беларускага пасольства **ў Брусэлі** (Бэльгія) 25-га з 10-й да 11-й ладзіць тамтэйшы Беларускі цэнтар.

Вялікія ўрачыстасьці маюць адбыцца **ў Празе**. А 9-й сябры Зьвязу Беларусаў замежжа ўшануюць памяць прэзыдэнта БНР Васіля Захаркі на Альшанскіх могілках, а 13-й у сядзібе аб'яднаньня адбудзецца прэзэнтацыя партрэту Кастуся Каліноўскага (аўтар — Адась Каліта), а 19-й — прэсканфэрэнцыя, прысьвечаная Дню Волі.

Дзень Волі сьвяткуюць і над Балтыкай. Беларускае культурнае таварыства «Хатка» 26 сакавіка арганізуе **ў Гданьску** ўскладаньне кветак на магіле Дзекуць-Малея, а ў **Сопаце** — прэзэнтацыю кніжкі Алены Глагоўскай пра беларусаў на Гданьскім Памор'і і канцэрт Віктара Шалкевіча «Вялікае Княства».

Заключны акорд сьвяткаваньня прагучыць 27 сакавіка. У Менску ў канцэртнай зале «Менск» адбудзецца канцэрт «Я нарадзіўся тут» з удзелам гурту «Крыві», Аляксандра Памідорава, «NRM».

**У Берасьці** а 12-й «Пяцёрка+» ладзіць мітынг на стадыёне «Будаўнік». А ў Празе ў той самы дзень з ініцыятывы суполкі «Скарына» ў Люстраной залі Нацыянальнай бібліятэкі з 12-й да 15-й адбудзецца ўрачыстае паседжаньне з удзелам старшынькі Рады БНР Івонкі Сурвіллы.

**Аркадзь Шанскі**

Сяргей Дубавец

# Апраўданьне Луцкевіча

**Куды мы ідзём, якую краіну будуем? На гэтыя пытаньні павінна адказваць дзяржаўная ідэалёгія, вакол якой сёньня столькі гвалту. Але не адказвае. Стройнай сыстэмы гістарычнага шляху нацыі зь мінуўшчыны ў будучыню няма. Між тым дзяржаўная ідэалёгія нічым не адрозьніваецца ад матэматыкі. У тым сэнсе, што нельга прыдумаць новую матэматыку. Нельга прыдумаць і новую дзяржаўную ідэалёгію. Варта проста зьвярнуцца да першакрыніцаў — напрыклад, да працаў стваральніка беларускае дзяржаўнае ідэалёгіі Антона Луцкевіча. Створаная на пачатку XX ст., яна перадвызначыла ўсю наступную гісторыю дзяржаўнасьці Беларусі, піша Сяргей Дубавец.**

Нямала людзей задаюцца пытаньнем: куды мы ідзём або дзе знаходзімся, якую краіну будуем або мусілі б будаваць, які ў нас цяпер лад? Па ідэі, ясна адказаць на гэтыя пытаньні павінна дзяржаўная ідэалёгія, вакол якой сёньня столькі гвалту ў прэсе, у школе, на заводзе. Кіраўнік краіны патрабуе ўзмацніць ідэалягічную работу, падначаленыя рапартуюць, пішуцца падручнікі, але ніхто толкам не разумее, што гэта і пра што. Эклектычная мяшанка зь вернападданскай выпраўкі, абрыўкаў савецкіх слоганаў і падвышаных тонаў. У задуманай ідэалёгіі няма пэўнай дактрыны беларускае дзяржаўнасьці, незалежнай ад таго, хто пэрсанальна кіруе краінай. Стройнай сыстэмы гістарычнага шляху нацыі зь мінуўшчыны ў будучыню не стварылі. І не маглі стварыць. Чаму? Таму што такая сыстэма ўжо ёсьць.

Створаная на пачатку XX ст., яна перадвызначыла ўсю наступную гісторыю дзяржаўнасьці Беларусі аж да сёньняшняга дня і далей у будучыню. Мы можам колькі заўгодна адмаўляць яе стваральнікаў, але мы ня можам выйсьці за яе межы. Мы ўсе — чынавенства, і люд паспаліты, і нацыяналісты і камуністы — даўно і надзейна павязаныя ёю. Урок дзяржаўнай ідэалёгіі ў гэтым сэнсе нічым не адрозьніваецца ад уроку матэматыкі. Як нельга прыдумаць новую матэматыку, нельга прыдумаць і новую дзяржаўную ідэалёгію. Каб зразумець гэта, варта зьвярнуцца да першакрыніцы — да працаў пачынальніка і стваральніка сучаснае беларускае дзяржаўнае ідэалёгіі Антона Луцкевіча.

Імя гэтага чалавека было забароненае ў БССР. Калі й згадвалі, дык эпітэты ўзводзілі ў ступень максымальнае нянавісьці. Інакш як фашыстам не называлі. Пра гэтую ніяк не адэкватную што да асобы Луцкевіча зацятасьць мы яшчэ скажам ніжэй, але сьпярша — пра кнігу.

Арыштаваны НКВД у 1939 г., Антон Луцкевіч памёр у турме пад Саратавам. Зборнік ягоных твораў «Да гісторыі беларускага руху», які летась выйшаў у выдавецтве «Беларускі кнігазбор», — першае пасьля сьмерці кніжнае перавыданьне Луцкевіча.

Укладальнік і камэнтатар кнігі Анатоль Сідарэвіч сабраў толькі тыя творы, што непасрэдна тычацца гісторыі і тэорыі беларускае дзяржаўнасьці. Гэта толькі невялікая частка агромністае спадчыны Луцкевіча.

Пытаньні пра Беларусь, якія ў сучасных кампіляцыях застаюцца без адказу, у Луцкевіча сфармуляваныя з усім магчымым досьведам, палітычнай культурай, разуменьнем і адказнасьцю за лёс нацыі. Луцкевіч гэта зрабіў першы і ўпершыню. Усё, што адбылося з краінай пасьля, так ці інакш выходзіла зь ягоных тэзаў, спрачалася зь імі, але заўсёды было пасьля. Урэшце яно й не змагло, і цяпер ня можа вырабіцца ў нешта першаснае, як і БССР не магла стаць нейкім самастойным праектам, бо другога першаснага не бывае.

У БССР, кажа Луцкевіч, ідэал 25 сакавіка 1918 г. рэалізаваўся часткова. Маецца на ўвазе ідэал дзяржаўнае незалежнасьці. Прычым тыя частковасьць і недаробленасьць захоўваюцца і ў сёньняшняй РБ, якая хоча быць ідэйнай пераемніцай БССР, а менавіта — тым утварэньнем, у якім дзяржаўны ідэал рэалізуецца часткова.

> Няма і ня можа быць ніякага «трэцяга шляху» разьвіцьця для Беларусі. Тое, што ў нас называюць «трэцім шляхам», — усяго толькі шлях няпоўнае, частковае рэалізацыі дзяржаўнага ідэалу.

З гледзішча палітычнае схемы Луцкевіча, няма і ня можа быць ніякага «трэцяга шляху» разьвіцьця для Беларусі, а тое, што ў нас называюць «трэцім шляхам», — усяго толькі шлях няпоўнае, частковае рэалізацыі дзяржаўнага ідэалу. Вось чаму мы такія, чаму не такія, як іншыя, і чаму ўсё ў нас так, як ёсьць.

Луцкевіч сфармуляваў беларускую дзяржаўную ідэю яшчэ на пачатку мінулага стагодзьдзя. І менавіта ягонымі вучнямі і наступнікамі былі стваральнікі БССР. Яны маглі ігнараваць ягоныя працы, але яны ўжо не маглі выйсьці зь ягонага кола.

Ствараючы «праект Беларусь», Антон Луцкевіч ня браў за пачатак Полацкае княства ці ВКЛ. Ён мысьліў катэгорыямі сучаснай геапалітыкі і дыпляматыі, быў рэалістам і бачыў, што дзяржаўнае станаўленьне Беларусі будзе адбывацца такім самым чынам, як і ў суседзяў.

Мадэрны беларускі нацыянальны рух пачаўся ў 1903 г., з утварэньня першай палітычнай партыі — Беларускай сацыялістычнай грамады. Тады ўвесь рух быў сацыялістычны, заўважае Анатоль Сідарэвіч. БСГ ня дзейнічала ў полі расейскай або польскай культуры, як усе яе папярэднікі ў XIX ст. Яна была чыста беларускай. Яна стварыла газэту «Наша Ніва», зь яе ініцыятывы ўзьнікалі беларускія школы, яна вяла перамовы з суседзямі з думкай пра будучае дзяржаўнае ўладкаваньне Беларусі. Урэшце, яна і прывяла да абвяшчэньня Акту 25 Сакавіка 1918 г.

Гадаванцы БСГ, якія перайшлі ў лягер бальшавікоў, дамагліся стварэньня БССР. БССР і стала той дзяржавай, у якой дзяржаўны ідэал увасобіўся часткова. Але гэта быў той самы дзяржаўны ідэал. Той самы ён і сёньня. Гэта значыць, увасоблены часткова. Пры поўным увасабленьні сучасная беларуская дзяржава была б больш падобная да Чэхіі або Літвы.

Важна зразумець, што Беларусь, гісторыю якой бальшавіцкія дый сёньняшнія ідэолягі пачынаюць з 1917 г., ня ўпала зь неба, не была прыхамацьцю Леніна, які раптам убачыў самастойны беларускі народ і падпісаў указ пра тое, што быць нам асобнай рэспублікай. Ні Ленін, ні тым больш Мясьнікоў з Кнорыным, колькі б ні ўглядаліся ў тагачасны наш «цёмны і забіты», кажучы словамі паэта, народ і край, нічога б тут ня ўбачылі, калі б не было рэальнага беларускага руху — культурніцкага і палітычнага, калі б не было выступаў у друку і інтэнсіўнай дыпляматычнай працы. А за ўсім гэтым якраз і стаяў Антон Луцкевіч.

Ніхто па-за ягоным колам у царскай Расеі і ва ўсім белым сьвеце ня думаў, не плянаваў і не ствараў беларускай дзяржаўнасьці. У праекту асобнай беларускай рэспублікі было мноства праціўнікаў. І калі БССР усё ж стварылася, гэта значыць, што аргумэнты беларускага руху (а ніякіх іншых не было ў прыродзе) аказаліся мацнейшымі і перамаглі. Але ж і гэтыя аргумэнты ня ўпалі зь неба.

Лягічна дапусьціць, што стварэньне Савецкай Беларусі было справакаванае абвяшчэньнем БНР. У сваю чаргу, абвяшчэньню БНР папярэднічала шматгадовая праца. У прадмове да зборніка Анатоль Сідарэвіч узнаўляе схему гэтых пошукаў: «А.Луцкевіч паказвае, што да ідэі дзяржаўнае незалежнасьці Беларусі... ішлі паволі. Самаю першаю была старая... ідэя народнікаў пра аўтаномію Беларусі ў складзе будучае Расейскае дэмакратычнае фэдэратыўнае рэспублікі. Прапрацоўвалася й ідэя аўтаноміі ў складзе Расеі ўсяго Беларуска-Літоўскага краю як аднаго суцэльнага гаспадарчага мэханізму. Задумваліся таксама і пра беларуска-літоўска-ўкраінскую фэдэрацыю. Усьведамлялася й значэньне латвійскіх партоў для эканомікі Беларусі».

Аднак падзеі першай сусьветнай вайны, непрадказальнасьць сытуацыі ў Расеі і хуткае сасьпяваньне незалежніцкіх настрояў ва ўсёй Усходняй Эўропе схілілі Луцкевіча і ягоных аднадумцаў да распрацоўкі самастойнага шляху.

Усе тагачасныя канцэпцыі не былі кабінэтнай гульнёй, а бясконца дыскутаваліся ў друку, а таксама на перамовах зь літоўцамі, украінцамі, расейцамі.

Артадаксальны сацыял-дэмакрат, як называе Луцкевіча Сідарэвіч, ад пачатку руху, як і ягоныя паплечнікі, быў марксістам, а гэта значыць чалавекам, які шмат у чым падзяляў погляды расейскіх рэвалюцыяністаў. І стварэньне БССР ён вітаў, бо ў немалой ступені гэта было ягонае дзецішча, бо на ягоных працах вырасьлі айцы Савецкай Беларусі. І ленінскі нэп, і бальшавіцкую беларусізацыю Луцкевіч вітаў таксама. І ў БССР 20-х гадоў яго лічылі прызнаным ідэолягам беларускае дзяржаўнасьці. Паразуменьне скончылася ў 1929-м.



**Антон Луцкевіч**

Гэта быў абвал. Ляснуў нэп. Пачалася прымусовая калектывізацыя, масавыя рэпрэсіі, паляцелі галовы айцоў БССР, рэформа 1933 г. адкрыла шлюзы татальнай русіфікацыі, беларуская дзяржаўнасьць была ператвораная ў карыкатуру. Луцкевіч рашуча асудзіў сталіншчыну і з гэтага моманту ў савецкім друку згадваўся толькі зь нянавісьцю.

Тут самы час зьвярнуцца да ягонае пэрсоны. Дакладней, да таго, чаму стаўленьне да Луцкевіча ў Беларусі ніколі не было нэўтральным. Кажучы проста, Луцкевіч апярэдзіў ня толькі свой час і сваю нацыю, але найперш — эліту нацыі. Высокаадукаваны, па-чалавечаму прыстойны, надзелены палітычнай культурай і калясальным досьведам, ён, мабыць, быў моцным кантрастам да такіх пашыраных у міжваенны час характарыстык масавага беларускага руху, як гнятлівая любоў да ўласнага сярмяжнага паходжаньня, пралетаршчына і ганарыстая неадукаванасьць. Акурат у 30-я гады на першыя месцы ў Беларусі, як усходняй, так і заходняй, узьбіваецца так званая чвэрцьінтэлігенцыя. Гэтая хваля недавучаных настаўнікаў захлынула тады ўсю Эўропу. Гэта яны стануць галоўнымі праваднікамі фашыстоўскай палітыкі і сталінскіх рэпрэсіяў.

Луцкевіч сярод іх і для іх быў чалавекам іншай фармацыі. Ён быў тым люстэркам, у якім новапаклікаsuccessful ныя бачылі сваю крывату. Яны папросту не маглі зразумець таго высокага духу, што ішоў ад гэтага адукаванага дыплямата, няяснага для іх арыстакрата-марксіста, пачынальніка той справы і той сфэры, у якой яны апынуліся і ў прысутнасьці якога ну ніяк не маглі рэалізаваць сваё прыроднае памкненьне — быць гаспадарамі сытуацыі. Сідарэвіч піша: «Ні бальшавікам, ні правым не ўдалося ўпісаць А.Луцкевіча ў ідэалягічныя схемы, зразумець, чаму ён мог гутарыць і дамаўляцца і з Карлам Каўцкім, і з Томашам Масарыкам, і з Ігнацым Падарэўскім, і зь Сяргеем Сазонавым, і зь мітрапалітам Андрэем Шаптыцкім... Думаецца, глыбей загадку асобы А.Луцкевіча спасьціг былы вучань Віленскае беларускае гімназіі Марыян Пецюкевіч. Ён пісаў: «...Гэта быў чалавек вялікай і глыбокай культуры, якая праменявала ад яго на асяродзьдзе, у якім ён знаходзіўся. Ён, у поўным значэньні гэтага слова, быў вэрсальчык. Яго нейкая «паглынальная» натура прыняла для сябе ўсё ўзьнёслае і лепшае з культуры Захаду, дзе ён пабываў. І гэта, мабыць, не аднаго хамуйлу цьвеліла і разіла, і пры нагодзе яны за культурнасьць яго ўпікалі».

«Пан Луцкевіч, гаў-гаў», — пісаў Кандрат Крапіва ў вершы «З фашысцкай падваротні». Зрэшты, такой лаянкай літаральна напханая бээсэсэраўская прэса 30-х. Луцкевіча не выносілі і, калі ў 39-м дабраліся да Вільні, адпомсьцілі яму напоўніцу...

Аднак гаворка не пра тое.

Матыў апраўданьня Луцкевіча прысутнічае і ў прадмове Сідарэвіча. Аўтар прыводзіць цытаты з апраўдальных артыкулаў сваіх папярэднікаў. Таму гаворка ідзе пра вось гэты комплекс — апраўданьня Луцкевіча.

**Працяг на старонцы 11.**

# Чыя ідэалёгія?

**З тэлеэкранаў гучыць: «Дзяржаўная ідэалёгія — гэта калі своечасова выплачваюцца пэнсіі і заробкі, калі ў лютую сьцюжу цёпла ў хаце» і г.д.** Аднак пэнсіі, заробкі, электрычнасьць, хакейныя палацы — гэта сацыяльная палітыка, а не ідэалёгія. Калі грунтавацца на азначэньнях паняткаў «ідэалёгія» і «дзяржава» ў Беларускай энцыкляпэдыі, дык дзяржаўная ідэалёгія — гэта сыстэматызаванае тэарэтычнае абгрунтаваньне інтарэсаў сацыяльнай групы, якая мае палітычную ўладу.

Калі Беларусь атрымала незалежнасьць, у краіне самай вялікай была супольнасьць з назвай «савецкі народ». Характэрнымі рысамі гэтай сацыяльнай групы ёсьць радыкалізм (што да ўзяцьця ўлады), таталітарызм (як мэтад утрыманьня ўлады), валюнтарызм у эканоміцы, атэізм у рэлігійнай сфэры, расейскамоўнасьць (як выразьнік «інтэрнацыянальных» памкненьняў). Яна мае свае традыцыйныя сьвяты (7 лістапада, 23 лютага) і культуру, абмежаваную ў прасторы-часе гісторыі савецкага народу.

Гэтая супольнасьць ня здольная была ўспрыняць незалежнасьць. Менавіта таму ў Беларусі захаваліся зь неістотнымі зьменамі сьцяг, герб, гімн часоў БССР, расейская мова атрымала статус дзяржаўнай; цэнтрам прыцягненьня засталася Масква.

Але савецкі народ у сувэрэннай Беларусі ўжо ня мае ў якасьці адзінай марксісцка-ленінскую ідэалёгію, прадуктам якой ён зьяўляецца. Таму мы бачым рэгрэс гэтай супольнасьці і страту ёю ўлады. Затое адбываецца прагрэс дзьвюх іншых самых буйных сацыяльных групаў — расейскай і беларускай. Першая падмацоўваецца духоўна і матэрыяльна з боку Масквы, а другая мусіць спадзявацца толькі на сваю дзяржаву.

Гэтыя групы складаюцца не на аснове нацыянальнай прыналежнасьці, але адпаведна бачаньню нашай краіны беларускай альбо расейскай паводле зьместу. «Савецкі народ» зьяўляецца базай для пашырэньня расейскай сацыяльнай групы і адпаведнага пераходу ўлады да яе.

Ня дзіва, што дзяржаўная ідэалёгія ў Беларусі мае расейскую скіраванасьць ды чакае свайго выданьня ў навукова абгрунтаваным выглядзе. Думаю, зь яго мы даведаемся аб «расейскай чысьціні» беларусаў, аб нашых «чыста расейскіх» і іхніх нячыста маскоўскіх інтарэсах. Пра тое, што мы ўрэшце змацуем наша расейскае адзінства шлюбам у супольнай расейскай праваслаўнай царкве, і г.д. Такая дзяржаўная ідэалёгія вырашае лёс беларускай нацыі не на яе карысьць.

**Ігар Хаменка, Менск**

# Пашпарты па «жыроўках»

**1 ліпеня сканчаецца дзеяньне пашпартоў узору 1974 г. і нацыянальных пашпартоў узору 1993 г. (з «Пагоняй»).** Нягледзячы на тое што ўлады ўсяляк заахвочваюць мяняць пашпарты, у Магілёве багата хто адкладае гэта на апошні момант.

Адны ня маюць прапіскі й сталага месца жыхарства, другія — грошай на новы пашпарт, трэція — на выплату запазычанасьцяў па камунальных плацяжах. А ў большасьці ЖЭСаў гэта зьвяўляецца галоўнай умовай зьмены пашпарта. Калі запазычанасьць маецца хаця б за месяц, домакіраўніцтва не заверыць заявы.

Добра тым, каму пашпарт штодня не патрэбны, але як быць жанчыне, што сядзіць у дэкрэтным адпачынку і ў якой муж працуе за мяжой ды зьяўляецца раз на 3—4 месяцы, а то й на паўгоду? Як ёй атрымліваць дапамогу на дзяцей, калі яна не памяняла пашпарта? Ці беспрацоўнаму? У такіх сем'ях звычайна й найвялікшая хранічная запазычанасьць. Калі сям'я й дастае нейкі заслік, то глядзіць, каб пракарміць сябе й дзяцей, а не зрабіць пашпарты. Другая катэгорыя — інваліды, якім сацыяльнай пэнсіі хапае толькі на ежу. Яны ў чаканьні палёгкаў цягнуць з пашпартамі да апошняга.

У большасьць краінаў цяпер бязь візы ня ўедзеш. А ў амбасадах пашпарты трымаюць месяц і болей. Тым часам чалавек аказваецца зьвязаным па руках і нагах. Бо без пашпарта нельга нічога аформіць ці ўзяць нейкія дакумэнты. Каб ажаніцца, аформіць крэдыт ці прыватнае прадпрымальніцтва, трэба пашпарт, прайсьці абсьледаваньні ў бальніцы таксама можна толькі па пашпарце.

Тэарэтычна існуе магчымасьць афармленьня другога пашпарта, але гэта складаная працэдура й патрабуе асабістай згоды начальніка УУС. Другі пашпарт выдаецца абмежаваным катэгорыям грамадзянаў, чыя праца зьвязаная з частымі выездамі за мяжу.

Каб пазьбегнуць ціску з боку розных ЖРЭУ й ЖЭСаў, трэба зрабіць цэнтралізаваныя пашпартныя бюро, незалежныя ад вышэйзгаданых установаў. Каб спагнаць запазычанасьці за кватэру, ёсьць іншыя спосабы. Чалавек не павінен заставацца без дакумэнтаў толькі таму, што вінен за камунальныя паслугі. Інакш у Беларусі ёсьць усе шанцы стацца краінай зь вялікаю колькасьцю людзей бяз пэўнага месца жыхарства.

**Сяржук Гіркін, Магілёў**

# Лепш за «Фабрыку зорак»

**На канцэрце «Крамбамбулі» ў перапынку падышоў паглядзець на «сувэнірную» прадукцыю ад БМА.** Мой позірк прыцягнула чырвоная скрыначка з надпісам «Я люблю ліцэй». «Бярыце — беларуская «Фабрыка зорак», — прапанаваў гандляр. Ён памыліўся: гэта было значна лепш за тое, што цэлымі днямі круцілі па тэлевізіі й радыё.

Восем музычных кампазыцый кружэлкі слухаюцца як адна, бо ўсе працятыя тэмай любові да свайго другога Дому. На дыску зьмешчаны таксама відэаматэрыял ды візуальная інфармацыя пра Ліцэй. Я зразумеў, чаму быў такі супраціў, калі ліцэістам казалі: «Ды што вы так хвалюецеся, пойдзеце ў звычайную школу». З дыску я ўпершыню даведаўся пра вучнёўскае самакіраваньне, Статут, Сойм і Раду Ліцэю — рэчы, пра якія ў школе ніколі ня чуў. За дзесяць гадоў навучаньня ў нас ніводнага разу ня гралі беларускія музыкі, ня ставіліся п'есы нашых народных песьняроў, ніколі мы ня чулі выступаў славутых пісьменьнікаў, мастакоў. Апроч банальных дыскатэк для падлеткаў зь півам ды травой і прыгадаць няма чаго.

Я пашкадаваў, што ня чуў лекцый Лявона Баршчэўскага, ня ўдзельнічаў у выпуску ліцэйскай газэты, не сыграў ролі ў «Паўлінцы». Не гаворачы ўжо пра запіс дыску! Сам Лявон Вольскі не пашкадаваў дзеля такой справы сваёй гітары.




Вестка пра хуткае зьяўленьне другога ліцэйскага дыску проста не магла мяне ня ўсьцешыць. Зьявіліся надзеі на тое, што хутка гэта загучыць па радыё.

**Алесь Квіткевіч, Менск**

# Пра Каліноўскага і ідэалёгію



**Канстытуцыя нашай краіны гарантуе свабоду слова кожнаму яе грамадзяніну, незалежна ад яго сьветапогляду.** А таму прашу надрукаваць мой артыкул.

Гартаючы лісткі адзінага ў краіне беларускамоўнага календара «Наш край», можна знайсьці любыя зьвесткі пра незьлічоных замежных сьпевакоў, артыстаў, нейкіх там іхніх герояў і г.д., якія аніякага дачыненьня да Беларусі ня маюць. А вось пра тое, што сто сорак гадоў таму, 22 сакавіка 1864 г., прыняў пакутніцкую сьмерць ад рук захопнікаў 26-гадовы Кастусь Каліноўскі, чамусьці замоўчвае нават і гэты каляндар.

Часта бачыш, як моладзь, беручы шлюб, ідзе класьці кветкі «ідалам». У кожным калгасе і горадзе абавязкова будуць на пастамэнтах стаяць «ідалы». А вось помніку Каліноўскаму не знайшлося месца. Мы шукаем мітычную дзяржаўную ідэалёгію, а сапраўдную, сьвятую, топчам нагамі — такога грэху Бог не даруе. Выхаваньне патрыятызму, павагі, добразычлівасьці можа быць толькі на праўдзівай гісторыі і толькі на роднай мове, а не на мітычнай хлусьні.

Таму я заклікаю ўсіх беларусаў 22 сакавіка ўвечары на некалькі хвілінаў у сваіх кватэрах запаліць сьвечку і памаліцца за пакутніка так, як мы молімся за сваіх родных, што сышлі ў іншы сьвет. І вы абавязкова адчуеце прыліў станоўчай энэргіі ў вашыя душы. Бо Кастусь Каліноўскі прыняў сьмерць за нашу свабоду — найвялікшы Боскі дар.

**Мікола Канаховіч, Пружаны**

# Сьцежка беларуская

**Калісь рамантавалі менскую плошчу Якуба Коласа.** Нарабілі файных дарожак, плітачка такая зручная. Але падсьвядома вольналюбівыя менчукі працягвалі хадзіць па старых, ненармаваных сьцежках, «як ногі прывыклі». Тады я зьдзівіўся разумнаму рашэньню нейкіх там уладаў: дарожкі разабралі ды перанесьлі на «народныя» маршруты.

Мінулы год адзначыўся «аблагароджваньнем» Саборнага пляцу ў Менску. Зьявіліся незразумелыя мармуровыя парэнчы, дзясяткі ліхтароў на пагорку натыканы, мабыць, згодна з прынцыпам «вунь туды, туды ды туды». Самыя эксцэнтрычныя менчукі выступалі з публічнымі прамовамі пра спадзеў, што ў людзей, якія гэта рабілі, адсохнуць рукі, галовы ці яшчэ што.

Днямі я йшоў тою дарогаю дахаты. Цяпер гэта здараецца радзей, бо балюча глядзець на гэтую «эўропу». Насуперак усім сучасным бэтонным дарожкам, упоперак іх да ўваходу ў мэтро цягнецца сьцежка. Праз клюмбы, проста па цаліне. Сьляды на ворыве — таксама сымбаль Беларусі. Цяперака буду хадзіць тэю сьцежкаю. Сьцежкаю Беларускаю.

**Раман Тумашык, Менск**

# КунцаўЩына

**У менскім мэтро ў дадатак да «Плошчы Леніна» і «Спартыўнай»** зьявілася яшчэ адна цікавая станцыя: «Кунцаўщына». Гэтак напісалі на схемах ля касаў.

**Kryw, tut.by**

# Пазналіся праз «НН»

**Піша вам Стрыгунова Алена з Бабруйску, сталая чытачка «першай беларускай» з 2000 году.** Вось ужо чацьверты год я знаёмая з цудоўным хлопцам Раманам. Даведаліся мы пра існаваньне адно аднаго менавіта дзякуючы «НН». Я давала абвестку, і ён адгукнуўся. Усе гэтыя гады лістуемся не спыняючыся, і я ўжо не ўяўляю жыцьця бяз гэтага слаўнага маладога чалавека. Мой ліст прысьвечаны менавіта яму.

Акрамя таго што Раман — будучы настаўнік гісторыі (пайшоў вучыцца на гістфак МДПУ імя А.Куляшова, бо захоплены мінулым Радзімы), пан Раман (так я яго клічу) цудоўна малюе і складае вершы.

Спадзяюся, вы зразумееце маё жаданьне, каб творчасьць сябра «пабачыла вялікі свет», прачытаўшы дасланы мне верш. Твор прысьвечаны Вільні.

Раман ЯРАШЭНЯ

Гэта мара, бо выпала з рук.
І надзеяй на гэта зьбыцьцё
Я хварэю на віленскі брук,
Стук абцасаў — сэнсу жыцьцё.
Чуеш, шэпт казыча мой твар?
Гэта падае віленскі сьнег.
Абганяючы подыхам пар,
Я малюю на сьнезе празь сьмех,
Як вар'ят, без прытулку,
Працiскаю далоні праз муры,
Прыпыняюся ў кожным завулку
І лічу, быццам шнары на скуры.
Гэты горад — прыпынак жаданы,
Мой апошні паход прызямлёны.
Тут загояцца даўнія раны,
Атрыманыя брудам калёным.
У любові табе прызнаюся,
Узаемнасьць чакаю праз згоду.
Ты — сталіца маёй Беларусі,
Адарванае сэрца народу!

# Галасуй целам

**Выбары ў Гішпаніі яшчэ раз прадэманстравалі,** што асноўны фактар, якім кіруецца выбаршчык, — уласная бясьпека. Дзякуючы кансэрватарам адносна спакойная Гішпанія апынулася ў эпіцэнтры сусьветнай вайны, выбаршчыкі ёй гэтага не даравалі.

**Андрэй Дзьмітранок, tut.by**

ВОДГУКІ

# Падпіска, байкот, фонды...

**Хачу падтрымаць прапанову сп.Трусава ў «НН» ад 6 лютага наконт падпіскі на незалежныя газэты для маламаёмных грамадзянаў.** У тым асяродзьдзі, дзе я жыву, большасьць жыхароў — жабракі, якія ня ў стане выпісваць газэты, для іх адзіная крыніца ведаў — тэлевізійная скрынка. І газэты ім патрэбны толькі дзеля праграмы ТБ. А паколькі ў Менску распаўсюджваюцца «Ва-банк» і «Минск на ладонях», дык нічога іншага ім і ня трэба. «Рэспубліка», «СБ» калі-нікалі праз грамадзкія аб'яднаньні выпісваюцца са значнай зьніжкай або наагул бясплатна. Вельмі слушная прапанова лідэрам «пяцёркі», каб яны аб'явілі збор сродкаў на падпіску на незалежныя газэты. А я і такія, як я, зможам распаўсюдзіць квіткі сярод бедных людзей.

У тым жа артыкуле ёсьць высновы, зь якімі я ня згодная. А.Трусаў піша: «Як зьмяніліся паводзіны Мечыслава Грыба, Сямёна Шарэцкага, Міхаіла Чыгіра, калі яны сталі актыўна карыстацца беларускай мовай». Сп.Трусаў блытае прычыну з вынікам. Спачатку гэтыя палітыкі зьмянілі свае паводзіны, і ўжо гэта прывяло іх да актыўнага карыстаньня беларускай мовай.

Яшчэ хачу падзяліцца сваімі думкамі наконт байкоту выбараў. Я для сябе ўжо даўно вырашыла, што ў гэтыя напарсткавыя гульні не гуляю. Большая частка насельніцтва пойдзе на выбары, але, як бы людзі ні галасавалі, усё роўна пройдуць у «палатку» тыя, якіх вызначыць «вэртыкаль». Пакуль ва ўсіх выбарчых камісіях ня будзе прадстаўнікоў апазыцыі, пакуль будуць двухтыднёвыя папярэднія выбары, ня будзе паралельнага падліку галасоў, усе надзеі на справядлівасьць марныя. Толькі пасьля выбараў дзяржаўныя СМІ будуць зьдзекліва пісаць, што «народ не падтрымаў апазыцыі».

Я вельмі паважаю сп. Баршчэўскага і згодна, што трэба карыстацца замежнымі фондамі, каб падтрымаць беларускую культуру і асабліва тых «беларускамоўных у Беларусі, што аказаліся без магчымасьці ўладкавацца на прыстойную працу». Пераважная большасьць апазыцыянэраў — гэта бедныя людзі, і зусім ня сорамна ім карыстацца падтрымкай, у тым ліку і грашовай.

Я вельмі рада, што чытаю вашу газэту. Як добра, што ў нас шмат вельмі разумных і адукаваных людзей. Чытаю іх лісты — і настрой падымаецца.

**Інэса Касьцюк, Менск**

# Пра Плешчанку

**«Сяброў Віцебскай філіі КХП-БНФ Уладзімера Плешчанку і Аляксандра Салаўяна затрымалі 24 лютага за несанкцыянаванае пікетаваньне каля Віцебскага райвыканкаму»** — гэта інфармацыя «НН» за 24 лютага. І вы лічыце, што гэтая інфармацыя адлюстроўвае змагарную працу У.Плешчанкі? Ён ня робіць пікетаў! Ён не парушае законаў! Ён зьбірае подпісы за скасаваньне дамовы аб саюзнай дзяржаве.

**Віктар Ф., Вольга К., Менск**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

# Прэміі на сьвята

Маладая пісьменьніца Аксана Бязьлепкіна (на фота) стала ляўрэаткай першай «суб'ектыўнай літаратурнай прэміі». Менавіта так называе прэмію яе заснавальнік — Адам Глёбус. Уганараваная Аксана за літаратуразнаўчае дасьледаваньне «Разам і паасобку. Таварыства «Тутэйшыя» («Беларускі кнігазбор», 2003). Узнагароджаньне пераможцы адбудзецца ў камэрнай абстаноўцы 25 сакавіка ў кавярні «Стары Менск».

Ідэя «Залатой літары» была агучаная на сайце Літара.net год таму. З аморфнай ідэі «найлепшай кнігі году» на апошнім этапе выкрышталізаваўся сьпіс намінантаў. У фінал выйшлі восем выданьняў: акадэмічная «Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя», дзьве кнігі Ўладзімера Арлова — «Адкусі галаву вароне» і «Краіна Беларусь» (у суаўтарстве зь Зьмітром Герасімовічам), дзьве анталёгіі — вершаваная «Краса і сіла» Міхася Скоблы і «Сучасная беларуская проза» Ўладзімера Сіўчыкава, а таксама кнігі Ганны Кісьліцынай «>blonde attack<», Вячаслава Рагойшы «На шляху да Парнасу» і згаданае дасьледаваньне А.Бязьлепкінай.

Чаму менавіта Бязьлепкіна? «Яна зрабіла першы калектыўны партрэт «Тутэйшых». І гэта навуковая праца, хай сабе студэнцкая», — адзначае Глёбус.

Толькі прэміі ПЭН-цэнтру ды «Гліняны Вялес», заснаваны Таварыствам вольных літаратараў, існуюць ужо працяглы час. Спробы заснаваньня прэміяў былі ў 90-я ва Ўладзімера Дамашэвіча ды ў часопісу «Arche». Ці надоўга хопіць імпэту «Залатой літары»? Глёбус кажа: «Калі і наважуся на працяг, дык хіба што буду даваць прэмію раз у два гады».

**Адам Воршыч**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Прэмія Багушэвіча

**У той жа дзень, 25 сакавіка, Беларускі ПЭН-цэнтар уручыць сваю прэмію імя Францішка Багушэвіча. Гэтая ўзнагарода прызначаецца за творы гістарычнага жанру. Сёлета на яе быў толькі адзін прэтэндэнт, і камісія па прэміі прагаласавала за ягоную кандыдатуру аднагалосна. Гэта Захар Шыбека са сваім «Нарысам гісторыі Беларусі 1795—2002». Урачыстая цырымонія адбудзецца ў Гістарычных майстэрнях (вул.Сухая, 25; мэтро «Фрунзэнская») а 13-й гадзіне.**

## Прэмія «Залаты апостраф»

**25 сакавіка ў Доме літаратара а 18.30 адбудзецца прэзэнтацыя 8-га нумару часопісу «Дзеяслоў» з удзелам Ніла Гілевіча, Генадзя Бураўкіна, Вольгі Іпатавай, Пятра Краўчанкі. Адначасова будуць уручаныя першыя прэміі «Дзеяслова» «Залаты апостраф» у галіне прозы, паэзіі, а таксама за найлепшы дэбют. Імёны ляўрэатаў трымаюцца ў сакрэце і стануць вядомыя толькі на вечарыне.**

## «Тутэйшыя» паасобку

Бязьлепкіна А. Разам і паасобку: Таварыства «Тутэйшыя»: Гісторыя, асобы, жанры. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2003. — 164 с. 150 ас.




Таварыства «Тутэйшыя» — літаратурная легенда. Бяз новых імёнаў, што ўпершыню прагучалі пад брэндам «Тутэйшых», неўяўляльная беларуская літаратура.

Грунтуючыся на матэрыялах анкеты, прапанаванай Адаму Глёбусу, Сяргею Дубаўцу, Сяргею Кавалёву й Андрэю Федарэнку, на ўспамінах Алеся Аркуша й пэрыёдыцы, маладая дасьледчыца складае «хроніку» Таварыства. Аўтарка не абмінае ўвагаю разнароднасьць поглядаў сяброў суполкі, паказвае закулісныя канфлікты, выкліканыя катэгарычнасьцю пераканальнаў, эпатажныя выступы літаратурных «нефармалаў». Кніга багатая на факты і на прабелы. Шмат істотнага лунае ў паветры, але так і не «прапісваецца». Фразы пра «новую эстэтыку» так і не раскрытыя. Таму кніга падае «Тутэйшых» хутчэй паасобку, чым разам.

**Тацяна Вабішчэвіч**

# Апраўданьне Луцкевіча

**Працяг са старонкі 9.**

У 1983 г. у беластоцкай «Ніве» ў адным зь першых «рэабілітацыйных» артыкулаў гістарыца Аляксандра Бэргман цытавала зь ліста да яе Мар'яна Пецюкевіча: «...ня трэба сьпяшацца з канчатковым прысудам яго палітычнай дзейнасьці... Ягоныя заслугі такія аграмадныя, што могуць засьціць прыкрыя памылкі». У чым былі прыкрыя памылкі пачынальніка беларускага руху, не ўдакладнялася.

Некалі на гэты кручок — апраўдваць Луцкевіча — патрапіў і я. Гэта быў нейкі падсьведамы покліч. Апраўдваць за «верхнюю палату» ў «Нашай Ніве», закінутую яму ва ўспамінах Ластоўскага, апраўдваць за бэзэнэраўскае прэм'ерства, за той жа грамадоўскі працэс... Цяпер я разумею, што ўсе гэтыя апраўданьні былі патрэбныя зусім не Луцкевічу. Яны сталі патрэбаю нацыянальнага адраджэньня.

Яно, якое «вечна цярпела» са сваёй няшчаснаю доляй, вечна ж і апраўдвалася — перад акупантамі, перад начальствам, перад сабою. Апраўдваньне стала яго галоўнай самаідэнтыфікацыйнай адзнакай. І сёньня адраджэнства яшчэ не адмовілася ад гэткага самапрыніжэньня. Гэта своеасаблівая падмена нацыянальнага пакаяньня, якога мы, беларусы, ня зналі. Мы сапраўды самыя рахманыя, гасьцінныя і працавітыя ў сьвеце людзі, а ўсе нас толькі душылі ды душылі, плакаць не давалі. А за што нам каяцца? За Курапаты? Дык гэта НКВД хай каецца. За зьнішчаную мову і спадчыну? Дык гэта прафэсары ў Акадэміі навук ці там Машэраў. За пастаўленую на карту незалежнасьць і будучыню дзяцей? Дык гэта Лукашэнка...

Замест пакаяньня, такой ачышчальнай здольнасьці чалавечае душы, у нас — апраўданьне. Трэба, каб мінуў час, каб вырасьлі новыя пакаленьні нармальных, а ня самых талерантных і самых пакрыўджаных пры тым людзей.

Натуральна, апраўдваюць толькі тады, калі прызнаюць, што было за што лаяць. У гісторыі з Луцкевічам гэта даўно набыло анталягічны выгляд. Але справа ня толькі ў гісторыі.

Комплекс апраўданьня кагосьці або чагосьці напоўніцу выяўляецца і сёньня — у гаворках, прэсе або Інтэрнэце. Паказальны прыклад — апраўдваньне Ўладзімера Коласа, які нібыта падставіў створаны ім ліцэй дзеля ўласных палітычных амбіцыяў. Хоць ясна, што пры любых іншых паводзінах Коласа ад ліцэю не засталося б ужо і сьледу, тады як цяпер ён жывы, хоць і ў падпольных умовах. Альбо ўзяць прыклад з апраўдваньнем цяперашняе апазыцыі, якая гуртуецца да восеньскіх выбараў.

Варта задумацца, што мы тут апраўдваем. А менавіта — высакародны ўчынак, палітычную культуру, парлямэнтарызм. Мы нармальныя і пазытыўныя зьявы біромся апраўдваць. А гэта значыць, што яшчэ не ўспрымаюцца яны ў нас як нармальныя і пазытыўныя. Інакш на зьвінавачваньне Антона Луцкевіча ў фашызьме папросту ніхто не зьвяртаў бы ўвагі, як на непаразуменьне або глупства.

Зборнік твораў пачынальніка беларускае дзяржаўнасьці падрыхтаваны сапраўды прафэсійна, па-навуковаму. А выдадзены надзвычай сьціпла. Па вялікім рахунку, гэта сьведчыць пра тое, што беларускі дзяржаўны ідэал па-ранейшаму рэалізаваны толькі часткова. Тым ня менш, адказы на пытаньні, якімі пачынаецца тэкст, тут даюцца вычарпальныя. Бадай, больш вычарпальнае кнігі на гэтую тэму папросту не існуе.

**Антон Луцкевіч. Да гісторыі беларускага руху. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2003.**

Юры Хадыка

# Попел Кляаса



## Да 140-годзьдзя з дня сьмяротнага пакараньня Канстанціна Каліноўскага

Ёсьць героі аднаго дня, месяца, году. Ёсьць героі цэлай эпохі. І ёсьць эпічныя героі — людзі, памяць аб справах якіх жыве стагодзьдзямі. Каб стаць эпічным героем, трэба пакінуць у гісторыі народу яркі і глыбокі след. Такі след у гісторыі Францыі, напрыклад, пакінула Жанна д'Арк. У шэрагу нацыянальных герояў яе імя — побач з імёнамі славутых ваяводаў ды імпэратараў Напалеона Банапарта й Карла Вялікага. Але менавіта гэтая маладая дзяўчына стала сымбалем вольналюбівай Францыі. Таму што яна ў цяжкія часы Стогадовай вайны апранула рыцарскія латы і ўзначаліла збройны супраціў інтэрвэнтам. Вельмі хутка трапіла ў палон і была спаленая на вогнішчы як вядзьмарка. Трагічны канец кароткага і бліскучага жыцьця зрабіў яе імя несьмяротным.

Гэткім жа героем для Беларусі зьяўляецца Кастусь Каліноўскі. Сын беднага шляхціча з Гарадзеншчыны, выпускнік Пецярбурскага ўнівэрсытэту, ён толькі вясной 1861 г. вярнуўся на радзіму. Тры наступныя гады яго жыцьця былі прысьвечаныя нацыянальна-вызвольнаму паўстаньню 1863—64 г., якое ён рыхтаваў, у якіх удзельнічаў і якім, нарэшце, кіраваў.

Гэта была цяжкая, няроўная барацьба. Царскі ўрад кінуў на разгром «польскага мяцяжу» больш за 300 тыс. жаўнераў і казакоў, падтрыманых больш чым трыма сотнямі гармат. А паўстанцы часта былі ўзброеныя толькі косамі, пераробленымі ў дзіды. З Францыі і Англіі так і не паступіла абяцаная зброя. Патокі крыві маладых змагароў залівалі полымя паўстаньня.

29 студзеня 1864 г. у Вільні быў схоплены і Кастусь Каліноўскі. Пасьля кароткага «дазнаньня» 22 сакавіка ён быў публічна павешаны на Рынкавым пляцы. Яму ішоў дваццаць сёмы год жыцьця. Агулам да сьмяротнага пакараньня было прыгаворана каля тысячы паўстанцаў. Дзясяткі тысяч былі высланыя ў Сібір.

Ідэямі нацыянальнага самавызначэньня, сацыяльнай справядлівасьці была насычаная грамадзкая атмасфэра Эўропы ў 60-я гады XIX ст. У 1861 г. завяршылася палітычнае ўзьяднаньне Італіі ў выніку гераічнага паходу «тысячы Гарыбальдзі». У гэтым жа годзе выбухнула грамадзянская вайна ў Паўночнай Амэрыцы за ліквідацыю рабства. На такім тле палавіністы маніфэст Аляксандра II аб адмене прыгоннай залежнасьці толькі ўзмацняў пачуцьцё незадаволенасьці нацыянальным і сацыяльным прыгнётам у заходніх рэгіёнах Расейскай імпэрыі. Бязьлітасная расправа над паўстанцамі спарадзіла новыя праблемы. Яна справакавала тэрор «Народнай волі». Бомбай, якую кінуў зямляк Каліноўскага Ігнат Грынявіцкі, быў урэшце забіты і кат паўстаньня 1863 г. Аляксандар II.

Доўгатэрміновыя наступствы паўстаньня прымушаюць уважліва паставіцца да невялікай, але ідэйна багатай спадчыны К.Каліноўскага, адлюстраванай у яго «Мужыцкай праўдзе». Ён быў першым беларускім рэвалюцыйным дэмакратам, які імкнуўся пераўтварыць клясава абмежаванае шляхецкае паўстаньне ў агульнанароднае. Ён горача выступаў за правы мужыкоў на волю, зямлю і нацыянальную самабытнасьць. Ён стаўся вешчуном нацыянальнага сувэрэнітэту Беларусі, хоць і называў яе яшчэ Літвою. Менавіта таму пасьля саракагадовае забароны на ўсё нацыянальнае — мову, дзяржаву, рэлігію, — як полымя з-пад попелу, вырвалася і разгарэлася першае беларускае Адраджэньне.

Ёсьць нешта містычнае ў тым, што дзьве даты — пакараньня К.Каліноўскага і абвяшчэньня незалежнасьці БНР — стаяць побач. Толькі ў 1991 г. спраўдзілася мара Каліноўскага аб аднаўленьні дзяржаўнага сувэрэнітэту ягонай Бацькаўшчыны. Але ня спраўдзілася цалкам яго прароцтва: «Бо я табе з-пад шыбеніцы кажу, Народзе, што тагды толькі зажывеш шчасьліва, калі над табою Маскаля ўжэ ня будзе». Умацоўваючы сувэрэнітэт Беларусі, не павінны мы забыць імя чалавека, які паклаў на ахвярнік нашай свабоды сваё палымянае сэрца 140 гадоў таму.

Словы зь вядомай кнігі пра барацьбу за незалежнасьць Нідэрляндаў — «Попел Кляаса грукае ў маё сэрца» — сталі парафразай неўміручай памяці аб нацыянальных героях кожнага народу.

**Міжнародны Ратэрдамскі кінафэстываль вызначаецца сваёй дзёрзкасьцю, нязмушанасьцю і пасьпяховым адкрыцьцём новых рэжысэрскіх імёнаў. У 1997 г. адсюль з «Фаервэркам» стартаваў Такешы Кітана, а ў 1999 г. публіку шакаваў кінахуліган Такасі Мііке. Сёлета ў Ратэрдаме ўпершыню адбылася сусьветная прэм’ера беларускага фільму. Як прымалі карціну «Акупацыя. Містэрыі»? Што сьцьвярджае кіно, якое разбурае стэрэатыпы? На пытаньні карэспандэнта «НН» адказвае рэжысэр Андрэй Кудзіненка.**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Нашых актораў палічылі за вяскоўцаў

## Гутарка з Андрэем Кудзіненкам

**«НН»: Як замежныя гледачы ўспрынялі карціну, «завязаную» на спэцыфічныя беларускія праблемы?**

**А. К.:** Простыя гледачы ня ведаюць пра Беларусь, шукаюць яе між Іранам і Іракам. Але рэакцыя публікі была даволі адэкватная. Сьмяяліся там, дзе ў нас сьмяюцца. Прагляды для публікі прайшлі з аншлягам. І шмат пытаньняў потым задавалі.

**«НН»: А пра што пыталіся?**

**А.К.:** Чаму, напрыклад, вы здымаеце пра вайну? Я кажу — вы ня ведаеце, што такое вайна для беларусаў, для беларускай культуры. На кожным праглядзе пыталіся: як вы так працуеце са звычайнымі сялянамі, зь непрафэсіяналамі? Нашых актораў палічылі за сапраўдных вяскоўцаў. А ў нас усе акторы — прафэсіяналы. Яны проста так у фільме выглядаюць — як сяляне, як партызаны. І гледачы палічылі, што акторы сапраўды там і жывуць. Вось такое рэальнае пераўвасабленьне. Так што ўсе зьдзіўляліся акторскай гульні.

**«НН»: Што ўспрымаецца ў беларускім кіно, а што не?**

**А.К.:** Фабула ім зразумелая адразу. А вось нюансы гумару, зьвязаныя з савецкай культурай, гульня з савецкімі стэрэатыпамі — гэта не ўспрымаецца. Фільм чамусьці больш падабаецца гледачам з Усходняй Эўропы. Тым з галяндцаў, хто быў у Беларусі, — падабаецца ўвогуле адразу. Немцам падабаецца гісторыя зь немцам, мо кранула. Палякі крыўдуюць за Эву. Кажуць — як курва, дык полька.

Было шмат людзей, якія ці то працуюць там, ці то эміґравалі зь Беларусі. І яны зьдзіўленыя, хоць ішлі на фільм зь перасьцярогай. Думалі, маўляў, ізноў беларускае, ізноў пра вайну. Пасьля фільму нават банкет нам наладзілі: фільм крануў. Быў там лідэр рок-гурту «Ruble Zone» — дык ён прапанаваў бясплатна музыку пісаць да любога з нашых фільмаў.

**«НН»: А што казала прафэсійная крытыка?**

**А.К.:** Калі быў паказ для сінэфілаў, яны ўсё казалі: чаму такая незаўважная раскрутка фільму? Яны былі ў шоку — першы беларускі фільм, які там зьявіўся. Дактары, мастацтвазнаўцы, прадусары. Я спытаў там пры канцы сустрэчы: «Што яшчэ?» А яны ў адказ: «Брава!» — і пачалі ў далоні пляскаць

Нам яшчэ да фэстывалю казалі, што калі б фільм быў на стужцы, то мы былі б прэтэндэнтамі на галоўныя прызы. А так на відэа, і таму па-за конкурсам.

**«НН»: Фільм параўновалі з карцінай Элема Клімава «Ідзі і глядзі»…**

**А.К.:** Гэта самы вядомы фільм, зьвязаны зь Беларусяй. Яго ўсе ведаюць, усе бачылі. Фільм Клімава лічыцца альтэрнатыўным савецкай традыцыі. І вось іншы погляд, таксама несавецкі. На ваенную тэму таксама... Мо праз гэта.

Але я не лічу, што наш фільм такі жорскі і цяжкі, як клімаўскі. У нас больш сэнтымэнтальны, цнатлівы. І ў Клімава фільм у адной танальнасьці — як стрэл са зброі, ён б’е ў адну кропку. Ня так у нас.

**«НН»: Папярэдні фільм Ваш — «Бітва пяці воінстваў» — дзіцячы, «Акупацыя» — партызанскае кіно. Працяг традыцый «Беларусьфільму»?**

**А.К.:** Абсалютна. Як вучань Турава, як сябар клясыкаў, якіх пасьпеў застаць. Да таго ж, на зьдзіўленьне, падчас вучобы паглядзеў 90% фільмаў, якіх ніколі ня бачыў, хоць жыў у Беларусі: Шульман, Вінаградаў, Корш-Саблін, Тарыч — для мяне былі адкрыцьцём.

Так што традыцыі, безумоўна. Але, як мы паўсюль кажам з Сашам Качанам, сцэнарыстам, каб зрабіць новае кіно, трэба выказацца на старую тэму. На самую традыцыйную беларускую тэму — партызанскую.

І яшчэ. Фільм рабіўся на тле такіх карцінаў, як «У жніўні 44-га», «Настасься Слуцкая», і тых павеваў у расейскім кіно, калі ідзе паразытаваньне на старым савецкім міце. «Зорка», «У жніўні 44-га» — гэта несучасны падыход да тэмы. Ды нават фільм «Зязюля» — усё роўна.

Груба кажучы, гэта «Старыя песьні пра галоўнае». Калі цынічна, канкрэтна бярэцца савецкі кіч. І гэта людзям падабаецца. Ідзе нейкая няпраўда — няпраўда ня столькі гістарычная, колькі аўтарская, няпраўда ў сваёй танальнасьці, у стаўленьні да гледача. У прынцыпе так працуюць «Старыя песьні пра галоўнае» — яны працуюць як рэкляма: бярэцца стэрэатып і на ім паразытуюць.

А кіно ж мусіць разбураць стэрэатып. Мяняць пункты гледжаньня, мяняць падыходы.

**«НН»: Калі кіно толькі разбурае стэрэатыпы, то што яно тады сьцьвярджае?**

**А.К.:** Яно вяртае гледача… Гэта даўняя гісторыя — спрэчка Эйзэнштэйна, Брэхта, «новая хваля». Ёсьць міт, галівудзкае кіно, якое маніпулюе сьвядомасьцю. Эйзэнштэйн таксама навязваў свой пункт погляду.

А кіно «новай хвалі» Гадара вяртала гледача да разбурэньня міту і да суўдзелу. Глядач не ідзе за канвой сюжэту альбо за навязанай ідэалёгіяй, ён спрабуе разважаць… Гэта, у прынцыпе, вяртаньне да Арыстотэля. Да катарсысу, развазжаньня, дыскамфорту, калі чалавек вымушаны думаць, пакутаваць, вымушаны саўдзельнічаць у творы. А гэтага не жадаюць…

Зварот да кіно, як да суўдзелу, як да руху… а ня так, як у Галівудзе: прыйшоў, расслабіўся, а потым выйшаў — і нічога не засталося.

**«НН»: Так што, беларускае кіно пазнаецца перш-наперш па партызанскай тэме? Ці ёсьць у яго свае стылёвыя, атмасфэрычныя моманты, калі мы можам па адным кадры пазнаць, як пазнаём кіно японскае, іранскае, сэрбскае, — гэта кіно беларускае?**

> Такія фільмы, як «Зорка», «У жніўні 44-га», — цынічны савецкі кіч. Няпраўда — ня столькі гістарычная, колькі аўтарская, у танальнасьці, у стаўленьні да гледача.

**А.К.:** Самая вялікая бяда беларускага кіно — што яно ня стала, сапраўды, як грузінскае, ці як літоўскае, ці нат як украінскае. Якое мае свой стыль. На жаль, тыя рысы, якія прабіваліся ў творчасьці Рыбарава, Турава, не разьвіліся ў нацыянальны стыль. Як ва ўкраінскім кіно — ёсьць паэтычнае кіно Параджанава, Даўжэнкі, і сапраўднае ўкраінскае кіно — гэта кіно паэтычнае. А вось у беларускім кіно…

Самы аўтэнтычны аўтар, я думаю, Тураў. «Людзі на балоце» — там ёсьць — і ў нашым кіно гэта таксама ёсьць — архетып беларуса. Такі чалавек трансцэндэнтальны абсалютна, у нечым надломлены, зламаны, а працягвае жыць.

І шмат якія беларускія фільмы інтанацыяй падобныя. Гэта абсалютная нейкая такая неагрэсіўнасьць. Скажам, сэрбскае кіно — гэта экстатычнасьць, жарсьць ірвецца вонкі. А беларускае кіно — трансцэндэнтальнае, цнатлівае.

**«НН»: Вы кажаце пра неагрэсіўнасьць. Але ж Ваш фільм успрынялі менавіта як агрэсіўны, як «доўгачакана антыпалітка-рэктны». Палякі ўжо крыўдавалі за Эву, мусульмане будуць абражаныя за вобраз НКВДыста. Пра расейцаў я маўчу — Штыркін некаторых зь іх ужо шакаваў…**

**А.К.:** Не, вось у якім сэнсе неагрэсіўнасьць: няма выпячваньня кагосьці аднаго, вось мы, маўляў, ад яго ў захапленьні. Ідзе такая пазыцыя: няма добрых і дрэнных. Няма сваіх і чужых. Няма нашых і нянашых — як у дзяцінстве мы глядзелі. Тут нават беларусы крыўдуюць. Так, кажуць, нельга беларусаў паказваць. Але фільм і не за расейцаў, і ня супраць расейцаў. Такая пацыфісцкая, касмапалітычная карціна.

**«НН»: Раней гэта яшчэ называлі «абстрактным гуманізмам». Пасьля прэм’еры Вы казалі, што, здымаючы фільм, арыентаваліся на позьняга Быкава, на ягоныя прыпавесьці?**

**А.К.:** Калі пісалі сцэнар, была крыху канкурэнцыя Быкаву. Я ў той час лічыў, што Быкаў — ён усё ж такі архаічны, нават сучасны Быкаў. І такая была з Быкавым нібы палеміка. А калі фільм быў у працэсе мантажу і гуку, я адчуў, што ёсьць у падыходзе, у інтанацыі супольныя рэчы — калі перачытаў быкаўскія прыпавесьці. А Качан іх не чытаў, я ўжо пасьля фільму падараваў яму гэтую кніжку…

Спачатку ў нас не было арыенціру. Гэта потым супала інтанацыйна, як гэта бывае, калі ў адным кірунку людзі думаюць. У першай навэле была арыентацыя ў духу братоў Коэнаў. Потым, дзякуй Богу, Коэны адпалі. Тут, магчыма, бліжэйшы Пазаліні.

**«НН»: Калі беларускія гледачы змогуць убачыць Ваш фільм?**

**А.К.:** Мы імкнёмся зрабіць прэзэнтацыю ў кінатэатры «Перамога». На што я спадзяюся. Таксама я спадзяюся, што нашы распаўсюднікі будуць practykаваць наш фільм і выпускаць яго на відэакасэтах.

Тым болей што ў Маскве была ўжо прэм’ера і на іхніх касэтах фільм будзе. На Захадзе — калі перагнаць карціну на стужку — то ўжо і замовы былі. Хацелася б, каб гэтым займаліся і нашы распаўсюднікі.

**Гутарыў Андрэй Расінскі**

## Памяці Трацьцякова

16 сакавіка ў к/з «Менск» адбудзецца канцэрт памяці паэта Мікалая Трацьцякова. Грошы пойдуць на помнік творцу. З сваякоў Трацьцякова жывая адна пляменьніца. Будуць сьпяваць Яраслаў Еўдакімаў, Валер Дайнэка, Ядвіга Паплаўская і Аляксандар Ціхановіч, «Песьняры». Удзел у канцэрце возьмуць кампазытары Валер Іваноў, Леанід Захлеўны і Эдуард Зарыцкі.

Трацьцякова многія запомнілі па песьні памяці зьніклых палітыкаў і сьпевах на мітынгу прыхільнікаў апазыцыі 9 верасьня 2001 г.

## Новы альбом «Ляпісаў»

Гурт «Ляпіс Трубяцкі» рыхтуе новы альбом, які выйдзе ў продаж у красавіку. Пакуль што ў этэр запусьцілі першую песьню зь яго — «Раіньку».

## Пісьменьнікі пазбаўляюцца раскольнікаў

Старшыню утворанай уладамі пры «холдынгу» Менскай пісьменьніцкай арганізацыі Паўла Вераб'ёва выключылі з Саюзу пісьменьнікаў. Такое рашэньне 10 сакавіка прыняла Рада СП. Астатнія паўтара дзясятка сяброў структуры атрымалі прапанову ад Рады СП за месяц вызначыцца са сваім сяброўствам у адной зь дзьвюх арганізацыяў.

За выключэньне прагаласавалі 27 з прысутных на паседжаньні трыццаці радных. Трое ўстрымаліся, супраць не галасаваў ніхто. А Рыгор Барадулін, які ў свой час ускладаў надзеі на маладога паэта, адклікаў сваю рэкамэндацыю на ўступленьне Вераб'ёва ў пісьменьніцкі саюз.

## Успаміны Васіля Супруна

Кнігу «Штрыхі з успамінаў» 78-гадовага паэта, колішняга сябра падпольнай моладзевай антысавецкай арганізацыі «Чайка» Васіля Супруна выдала слонімскае аб'яднаньне «Ветразь». Ілюстраванае (фатаздымкі з архіву аўтара) 130-старонкавае выданьне распаўсюджваецца бясплатна. Электронны варыянт мэмуараў Супруна можна замовіць праз электронную пошту (slonim_vetraz@tut.by).

## «Аляксандра і Канстанцін» у аварыі

У панядзелак а 7-й ранку каля Жодзіна аўтамабіль, у якім ехалі Аляксандра Кірсанава і Канстанцін Драпеза, сутыкнуўся з «Фордам-Сіера». Музыканты ехалі з Барысава на здымкі кліпу да песьні «My Galilleo» — беларускай візытоўкі на «Эўрабачаньне». Было сьлізка, і кіроўца «Форда» не ўтрымаў машыны на паласе. Абодва аўто аднаўленьню не падлягаюць. Моцна пабіліся пасажыр «Форда» і кіроўца музыкаў. Канстанцін і Аляксандра выйшлі толькі зь нязначнымі траўмамі.

## Сьпевакі й БТ

Натальля Падольская хоча разарваць дамову аб супрацы з БТ. Пры скасаваньні дамовы Н.Падольская не паедзе ў Турцыю на «Эўрабачаньне» дублёркай. Сьпявачка гэтак пракамэнтавала сваё рашэньне агенцтву БелаПАН: «Хачу праявіць салідарнасьць з усімі ўдзельнікамі конкурсу, якія рыхтаваліся да сумленнага спаборніцтва, а ў выніку ўзялі ўдзел у спэктаклі, разыграным купкай чыноўнікаў ад культуры».

Тым часам дамову пра супрацоўніцтва БТ заключыць з групай «J_Морс». БТ бярэ на сябе абавязак па бясплатнай здымцы кліпаў.



Уладзімер Пугач, саліст групы J_Морс

## Фэнтэзі паводле Льюіса

Кінастудыя Ўолта Дыснэя выйграла права на экранізацыю казачнага цыклу аповесьцяў Клайва Стэплза Льюіса «Хронікі Нарніі». Першы зь фільмаў у жанры фэнтэзі мае зьявіцца пры канцы 2005 г. Кіраўніцтва кінакампаніі спадзяецца на посьпех на хвалі папулярнасьці «Валадара пярсьцёнкаў» і «Гары Потэра».

**Аркадзь Шанскі, С Б**

## Тэатар імя Янкі Купалы

**18 сакавіка** (чц) — «Тутэйшыя».
**20 сакавіка** (сб) — «К'еджаўскія пе рабрэхі».
**24 сакавіка** (ср) — «Каханьне ў стылі барока».
**25 сакавіка** (чц) — творчая вечарына з нагоды 50-годзьдзя Ўладзімера Кур'яна, кіраўніка музычнай часткі тэатру, аўтара музыкі да «Тутэйшых» і «Ідыліі».

## Малая сцэна Купалаўскага тэатру

**20 сакавіка** (сб) — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях».
**21 сакавіка** (ндз) — «Падступства і каханьне».
**23 сакавіка** (аўт) — «Муж для паэтэсы».

## Раман Вікцюк

**20 сакавіка** ў к/з «Менск» Тэатар Рамана Вікцюка паказвае гульню-камэдыю «Маю жонку завуць Морыс». Т.: 206-64-92, (029) 601-00-44

## Балет

**19 сакавіка** (пт) — «Карміна Бурана» і «Кармэн-сюіта».
**21 сакавіка** (ндз) — «Прыгажуня ў сонным лесе».
**24 сакавіка** (ср) — «Шчаўкунок».
**26 сакавіка** (пт) — «Чыпаліна» (11.30) і «Макбэт» (19.00).

## Опэра

**18 сакавіка** (чц) — «Рыгалета».
**20 сакавіка** (сб) — «Іяланта».
**21 сакавіка** (ндз) — прэм'ера опэры Г.Гладкова «Горад майстроў» (аб 11.30).
**23 сакавіка** (аўт) — «Князь Ігар».
**25 сакавіка** (чц) — «Травіята».

## Індустрыя забаваў

**З 16 да 18 сакавіка** ў рамках міжнароднай выставы «Індустрыя забаваў-2004» у выстаўным цэнтры «Белэкспа» (Янкі Купалы, 27) пройдуць супэр-шоў «Партыя» (фокусы, клаўнады, інтуітыўная пластыка), танцы гурту «ФМ-студыё», паказы калекцый вопраткі. 18 сакавіка там жа пройдзе гала-канцэрт з удзелам гуртоў «Ляпіс Трубяцкі» і «J_Mors».

## Тэатар беларускай драматургіі (Крапоткіна, 44)

**18 сакавіка** (чц) — «Жанчыны Бэргмана».
**23 сакавіка** (аўт) — «Чорны квадрат».
**25сакавіка** (чц) — «Чарнобыльская малітва» (паводле твору Сьвятланы Алексіевіч, супольны беларуска-французскі праект).

## «Плястылін», дубль

**21 і 22 сакавіка** на сцэне Купалаўскага тэатру — спэктакль Маскоўскага цэнтру драматургіі і рэжысуры «Плястылін» (паводле п'есы Васіля Сігарова). Гэты спэктакль мусіў дэманстравацца 29 лістапада падчас «Адкрытага фармату», але быў спынены: загарэўся сафіт і ўсчаўся пажар. Зарэгістраваць лістападаўскія квіткі можна праз т.: 227-17-17 і 223-31-82.

**23 сакавіка** тамсама — яшчэ адзін спэктакль Маскоўскага цэнтру драматургіі і рэжысуры: «Не пра гаворанае» Міхаіла Покраса. П'еса — ляўрэат літаратурнай прэміі «Дэбют», дзьвюх тэатральных міжнародных прэмій.

## Канцэрты

**27 сакавіка** ў к/з «Менск» «Я нарадзіўся тут».

У гэты ж дзень у клюбе «NC» (вул.Кастрычніцкая, 17) — першы ўсебеларускі фэст «Хіп Хоп Session» (пачатак а 17-й).

**21 сакавіка** ў ДК МТЗ фэст «Рок-ін'екцыя» з удзелам «Крамы», «Мадэра Хард Блюз», «Greensnake», гурту «Сястра». Вядзе канцэрт Аляксей Шадзько. Пачатак а 18-й.

## Выставы

**17 сакавіка** ў Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва (Менск, прасп.Скарыны, 47) адкрылася выстава твораў скульптара Канстанціна Селіханава «Супастаўленьні». Апроч скульптураў, на выставе паказаныя графічныя работы мастака. К.Селіханаў прытрымліваецца такіх мастацкіх напрамкаў, як канструктывізм і мінімалізм.

**20 сакавіка** Алесь Родзін прэзэнтуе сваю выставу жывапісу ў Палацы мастацтва (Казлова, 3).

## Аўкцыён

**31 сакавіка** а 14-й антыкварна-аўкцыённы дом «Paradig» праводзіць аўкцыён твораў сучаснага мастацтва (жывапіс, графіка, скульптура, фатаграфія). Перадаўкцыённая выстава пройдзе ў мастацкай галерэі Палацу рэспублікі з 16 да 30 сакавіка.

ДЗІЦЯЧЫЯ ІМПРЭЗЫ

## Сакавічок

**19—26 сакавіка** ў сталіцы адбудзецца першы гарадзкі фэстываль дзіцячых і юнацкіх фільмаў «Сакавічок». Фэстывальная праграма разьлічаная на дзяцей рознага веку. Пакажуць розныя стужкі, адбудуцца сустрэчы з акторкай Сьвятланай Зелянкоўскай (к/т «Камсамолец»), рэжысэркай Маргарытай Касымавай (к/т «Кіеў»), мультыплікатарамі Натальляй Хаткевіч, Аленай Туравай, Аляксандрам Ленкіным (к/т «Электрон»), акторам і каскадзёрам Генадзем Чацьверыковым (к/т «Партызан»).

## Спэктаклі

**18 і 19 сакавіка** ў Тэатры юнага гледача — прэм'ера спэктаклю Сяргея Кавалёва «Тарас на Парнасе». Тэл. 226-12-43.

**28 сакавіка** тэатральны праект «Беларускія сэзоны» прэзэнтуе мюзыкл для дзяцей і дарослых «Сьнежная каралева». Пачатак а 13-й у Доме літаратара (вул. Фрунзэ, 5). Т.: 285-81-04, 245-07-06.

## Юнаму гледачу

**«Аўрора»**
«Карлсан, які жыве на даху»: **19** (пт) 12.30, 14.30; **20, 21** (сб, ндз) 12.30.
«Кевін у краіне драконаў» (прэм'ера, «Сакавічок»): **19** (пт) 12.00.
«Блізард» (прэм'ера, «Сакавічок»): **20, 21** (сб, ндз) 14.30.

**«Берасьце»**
«Дзеці шпіёнаў-2»: **19** (пт) 15.00.
«У пошуках Нэма» («Сакавічок»): **19** (пт) 12.00, 16.00.
«Кевін у краіне драконаў» (прэм'ера, «Сакавічок»): **20, 21** (сб, ндз) 11.50.

**«Кастрычнік»**
«Гонар маю» (прэм'ера, «Сакавічок»): **19** (пт) 14.30.

**«Мір»**
«Фанфан-Цюльпан»: **20, 21** (сб, ндз) 12.00.
«Гуляй як Бэкхем» (прэм'ера, «Сакавічок»): **19** (пт) 15.00.
«Кашэчыя лісты» (прэм'ера, «Сакавічок»): **20, 21** (сб, ндз) 14.00.

**«Піянер»**
«Блізард»: **19** (пт) 10.15, 12.00, 14.00.
«У пошуках Нэма»: **20, 21** (сб, ндз) 10.15, 12.00, 14.00.

КІНААФІША

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Дзень Хамячка»: **19—21** (пт—ндз) 17.00.
«Апошні самурай» («Оскар-2004»): **19** (пт) 15.00, 18.00, 20.50; **20, 21** (сб, ндз) 12.00, 15.00, 18.00, 20.50.
*Кінафармат 4х4:*
«Малышка Лілі»: **19** (пт) 19.00, 21.00.
«Адчужэньне»: **20** (сб) 19.00, 21.00.
«Таксыдэрміст»: **21** (ндз) 19.00, 21.00.

**«Бярэсьце»** (272-87-91)
«Іншы бок ложка»***: **19** (пт) 18.40; **20, 21** (сб, ндз) 16.30, 18.40.
«Апошні самурай» («Оскар-2004»): **19** (пт) 20.45; **20, 21** (сб, ндз) 13.40 (іл), 20.45.

**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Буйная рыба» (прэм'ера, «Оскар-2004»): **19** (пт) 18.40, 21.00; **20, 21** (сб, ндз) 14.00 (іл), 16.20, 18.40, 21.00.

**«Масква»** (223-27-10)
«Скарбы Амазонкі» (прэм'ера): **19** (пт) 19.00; **20, 21** (сб, ндз) 15.00, 19.00.
«Цяжкасьці перакладу» («Оскар-2004»): **19** (пт) 17.00, 21.00; **20** (сб) 13.00, 17.00, 21.00; **21** (ндз) 13.00 (іл), 17.00, 21.00.

**«Мір»** (284-37-71)
«Гаспадар мораў: на ўскрайку Зямлі» («Оскар-2004»): **19** (пт) 20.30; **20, 21** (сб, ндз) 16.00 (іл), 20.30.
*Кінафармат 4х4:*
«Адчужэньне»: **19** (пт) 17.00, 19.00, 21.10.
«Тайныя жарсьці»: **20** (сб) 15.00, 17.00, 19.00, 21.10.
«Маленькая Лілі»: **21** (ндз) 15.00, 17.00, 19.00, 21.10.

**«Перамога»** (223-77-66)
«Чумавая пятніца»: **19—21** (пт—ндз) 15.00.
*Фэстываль «Франкафонія»:*
«Суседка»: **21** (ндз) 10.45.
«Апошняе мэтро» **21** (ндз) 12.40.
*Кінафармат 4х4:*
«Таксыдэрміст»: **19** (пт) 16.50, 19.00, 21.00.
«Маленькая Лілі»: **20** (сб) 16.50 (іл), 19.50, 21.00.
«Тайныя жарсьці»: **21** (ндз) 16.50 (іл), 19.50, 21.00.

**«Піянэр»** (227-64-87)
«Рэальнае каханьне»: **19—21** (пт—ндз) 18.40.
«Іншы сьвет»***: **19—21** (пт—ндз) 16.30, 21.00.

**«Цэнтральны»** (220-34-16)
«S.W.A.T.: спэцназ гораду анёлаў»: **19** (пт) 11.30, 13.40; **20** (сб) 12.00 (іл), 21.00; **21** (ндз) 12.00 (іл), 14.30, 21.00.
*Кінафармат 4х4:*
«Тайныя жарсьці»: **19** (пт) 15.50, 18.20, 21.00.
«Таксыдэрміст»: **20** (сб) 14.30, 16.40, 18.50.
«Адчужэньне»: **21** (ндз) 16.40, 18.50.

(іл) — ільготны сэанс (зьніжка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

МЕНСКАЯ КІНАПРЭМ'ЕРА

# Цяжкасьці ўспрыманьня



Гэты фільм сабраў паўсотні намінацыяў на розных кінафэстах. Але лепей бы гэтага перад праглядам не ведаць. Бо «Цяжкасьці перакладу» рэжысэркі Сафіі Копала (дачкі таго самага, а «той самы» — Фрэнсыс Форд Копала — выступіў выканаўчым прадусарам) ня варта ўспрымаць праз прызму ўзнагарод і вядомых імёнаў, каб не расчаравацца.

Сюжэт — караценькі раманчык былой кіназоркі Боба Гарыса (Біл Мюрэй) з маладой жанчынай (Скарлет Ёхансан). Абое маюць сем'і й знаходзяцца па сваіх справах у Токіё, чужым горадзе з чужой культурай, звычаямі й зусім незразумелай мовай.

Няма ў фільме ні драйву, ні мудрагелістых сюжэтных паваротаў. Дзея разгортваецца запаволена, дыялёгі актораў ляканічныя. У цэнтры тыя двое: дзівак перадпэнсійнага веку і сумнаватая загадкавая прыгажуня. А яшчэ — вялікі каменны Горад, з шэрымі гмахамі, бліскучымі рэклямамі, з басэйнамі і стрыптыз-барамі. Ня їхны горад. У сваім яны б наўрад ці зьвярнулі ўвагу адно на аднаго. Героі не будуюць свайго сусьвету, не змагаюцца супраць усталяваных парадкаў. Яны нават і ня думаюць бунтаваць. Проста пачуваюцца бездапаможнымі, ім тут няўтульна. Ператрываць разам неяк лягчэй...

Таму лепей ня ведаць пра тое, што амэрыканцы прызналі «Цяжкасьці перакладу» клясыкай: фільм займае 153-е месца ў сьпісе 250 фільмаў усіх часоў у апытаньні аўтарытэтнага кінасайту imdb.com. Пра тое, што фільм Сафіі Капалянкі атрымаў «Залаты Глёбус» за найлепшы сцэнар, найлепшую камэдыю і найлепшую акторскую гульню. Ня варта шукаць тут нечага звышгеніяльнага. Проста глядзіце.

**Сяргей Будкін**

## Montevideo



J_Mors (C) & (P) 2001—2004

Альбому чакаў я з пэўнай асьцярогай. Катавала-дратавала неадчэпная думка: ці здолеюць спадарочкі Пугач і Арлоў датрымаць у поўнафарматніку (пасьля двух сынглавых выданьняў!) хоць бы які моўны баланс. Як выявілася, ня здолелі. На стылёва аздобленай плытцы «Montevideo», складзенай зь дзесяці трэкаў (+1 «схаваны»), па-беларуску гучыць толькі кавэр NRM-аўскай «Катуй-ратуй» і нічога зь белмоўнага даробку саміх «морсаў». Сяк-так яшчэ можна зразумець, што з агульнага канцэпту выпадала зацяжная «Прапанова». Аднак адсутнасьць «Глядзі» і «Маё дзяўчо» выглядае дзіўна. Ня спраўдзіліся надзеі прыхільнікаў гурту пачуць на кружэлцы беларускую вэрсію супэргіту «Монтевідео». Але нават па-расейску творчасьць «J_Mors» выглядае больш шчырай і цёплай, чым у той лявіны пеюноў, што запаланілі тутэйшыя «гіт-парады», малпуючы «золатаграмафонных» маскалёў. Слухачы «J_Mors» параўноўваюць яго з «A-ha» (песьні «Календарём», «Айсберги»), «БИ-2» («Монтевидео»), «Океаном Ельзи» («Смотри»). Мне ж на розум прыходзіць іншая асацыяцыя: «NRM» — Багушэвіч, а «J_Mors» — Неслухоўскі нашага часу. Але мовы, панове, не пакідайце.

## За сто крокаў ад Вострае Брамы, альбо Геаграфія ВКЛ і ваколіцаў



Віктар Шалкевіч (C) & (P) 2003

Альбом алюзіяў і паралеляў, пачынаючы з назвы. Першая частка нагадала эпізод з «Аповесьці бяз назвы» Юзафа Крашэўскага. Другая частка назвы нагадала пра рыцараў і мэцэнатаў, Статуты і Мэтрыку, бітвы і наезды... Альбом разам — быццам словы «апошняга ліцьвіна» Чэслава Мілаша. Слухаючы Шалкевіча, заўсёды зьдзяйсьняеш падарожжа ў нейкую краіну — такую родную, але мройную, няісную. Мілашава ВКЛ гучыць у песьнях Шалкевіча. І пры гэтым зусім няважна, аб чым бард сьпявае: пра анёлаў, што наклікалі ў Горадню дождж, пра электрычку, што выпускае ў Койданаве незнаёмку, ці пра час, які ў рытмах блюзу на «Запарожцы» ўцякае па былым Ленінскім праспэкце ад лірычнага героя. Альбом стварае адметную пачуцьцёвую атмасфэру, якая нечым нагадвае «Народны альбом». Паралелі так і просяцца на язык. У «Народным альбоме» — блакітнавокі кантрабандыст, у «Геаграфіі» — пераапрануты польскім паручнікам агент ГПУ Мэнахем Вольфсан; вызваліцелі, што патрабуюць ад вызваленых гарэлкі й сала для супольнага сьвяткаваньня «вызваленьня»; «дарагія мае масквічы, уважаемые ленінградцы» — «расьцьвіталі яблыні і сьлівы, ў некаторых месцах алыча»... Той самы сум і сьмех. Шкада, што ў шырокім продажы кружэлку знайсьці немагчыма. Шукайце ў незалежных распаўсюднікаў!

## Spravazdača 1994—2004



NRM (C), (P) 1994, 1995, 1996, 1997, 1998, 2000, 2002, 2004

Музыкі надта рызыкавалі, даверыўшы вызначаць склад свайго the best'у фанатам. Галасаваньне заўсёды рэч суб'ектыўная. Таму і маем на плытцы гушчу нечаканасьцяў, кшталту «Юра, ёлкі-палкі, Коля», што аніяк не адлюстроўваюць настрою адпаведных NRM-аўскіх альбомаў. Аднак галасаваньне адбылося, справа ўчынена, лёсы кінуты — у руках пазалочаны (пазалаці ручку!) дыск з 19 трэкамі 1994—2004 г. Кампіляцыя ўкладзена ў адваротным храналягічным парадку, і мы паступова, нібыта на машыне часу самай настаяшчай, вяртаем свае вушы й душы ў далёкі год электаральнай рэвалюцыі.

Як фанаты ні стараліся, у складанцы ўсё адно бальшыня зь лепшага прысутнічае («Песьня падземных жыхароў», «Паветраны шар», «Катуй-ратуй», «Лёгкія-лёгкія»). Дзьве новыя песьні на самым пачатку кружэлкі, як спадар Вольскі і абяцаў, змрочна-дэпрэсіўныя. Кампазыцыя «10» (нагадала шэраг песьняў з альбому «Absolution» гурту «Muse») прысьвечана дзесяцігодзьдзю нашага супольнага быцьця ў палоне, запоі, застоі (патрэбнае падкрэсьліць). Але нават пасьля гэтых дзесяці «беспрасьветна калгасных» гадоў застаецца спадзеў: «Дзесьці, калісьці, напэўна, можа быць, дзеці заменяць. Для гэтага трэба жыць». Ня меней гаючага пэсімізму ў «Рок-н-рол не ўратуе» пра парадкі нашага гораду, дзе «панкі слухаюць фанкі, байкеры слухаюць байкі», а зь нябачных скалаў апусьцілася сьнегавая навала.

**Сяргей Балахонаў**

## Не як усе



Нестандартны варыянт, 2004

Рэп-трыё, што арыгінальна перарабіла «Паветраны шар» «NRM», нарадзіла гэты альбом пяць гадоў. За той час, дзякуючы актыўным гастролям, яны вырасьлі з «тых, хто падае надзею», у лідэраў свайго кірунку. Густоўная музыка, шчырыя тэксты. Нават ня тэксты, а плынь сьвядомасьці, у якой побач і расчараваньне, што аўтобус не прыехаў, і просьбы да Ўсёмагутнага, «каб баця ня піў ды мамку ня біў». Незважаючы на выкарыстаньне «народнай лексыкі», песьні ў беларускіх рэпэраў не зласьлівыя. Альбом для Шлага, Базыля й Мікса этапны ня толькі ў музычным пляне. З дапамогай яго яны разьвітваюцца з «пад'ездным» юнацтвам ды выпраўляюцца ў дарослае жыцьцё.

Ледзь ня ў кожным трэку выкарыстоўваюцца музычныя цытаты (Алан Парсан, Нік Кейв, нават са «Службовага раману» і «Сабакі на сене» запазычылі). Часам даходзіць да нагрувашчаньня цытатаў — музыка з кінафільму «Амэлі» пераходзіць у «Where The Wild Roses Grow» Кейва, але, зрэшты, у такіх песьнях перадусім настрой і рытм. Тым больш амаль усе адрасы запазычаньняў пазначаныя.

Альбом мае ўсе шанцы ўвайсьці ў кнігу рэкордаў па «колькасьці падзякаў» — іх на вокладцы блізу 500. Адрасаты — ад таямнічых ГПЗ і ЖПТ да «Айца, Сына і Духа Сьвятога».

**Сяргей Будкін**

## Растаманы новага пакаленьня

### Першы беларускі рэгі-фэст, 2004

Першая ў Беларусі складанка, прысьвечаная «сонечнай музыцы». Шмат для каго станецца адкрыцьцём, што йснуе такі кірунак у краіне, «дзе забараняюць паліць ганджу і сьмяяцца». Актуальнасьць і зьмястоўнасьць рэгі ў свой час заўважылі «супольнікі» й падаравалі нам песьню «Я нарадзіўся тут». Тут жа цэлых 15 песень, прэзэнтаваных гуртамі зь Менску, Гомелю, Віцебску. Яшчэ на дыску можна паслухаць маскоўскія каманды «Джа дывіжн» і «Пасіянары Джа». Альбом пісаўся «ўжывую» ў адным зь менскіх клюбаў пры канцы мінулага году.

Думка айчынных растаманаў новага пакаленьня сягае ў асноўным да пошукаў свабоды: «Мы жадаем у свабодным горадзе жыць, у свабодным горадзе сьпяваць», — пяюць «Калахары». Агульнае ж пасланьне ўкладаецца ў ёмістую назву трэку «Адыс-Абэбы» — «Весела, але змрочна». У часе праслухоўваньня зьяўляецца думка: ці не архіўны гэта запіс, зроблены ў сутарэньнях якога-небудзь інстытуту ў сярэдзіне 80-х? Тая ж атмасфэра андэргравунду, тыя ж матывы ў творчасьці: «Я хачу любіць Радзіму, толькі вось не выходзіць» («Алмазны фронт» зь Віцебску).



На гэтым канцэрце выступіў і «Вірус Ліха» — піянеры айчыннага рэгі, адзін з самых яркіх маладых гуртоў апошніх год. Іх дзьве адвязаныя песьні — у падарунак таму, хто здолее даслухаць да канца гэтую вясёлую і змрочную, арыгінальную і другасную, беларускую і расейскую растаманскую мяшанку.

## На марозе!!

Дай darogу, 2002—04

ДД запісалі даволі якасны альбом, зрабілі аж тры кліпы. Адзін зь іх — «На Ямайцы» — доўга трымаўся ў «Кліп-абойме». Некалькі год таму яны гралі выключна панк, цяпер іх музыка больш разнастайная — ёсьць і гардкор, і панк, і клясычны рок. Адзінае, на што яшчэ не перахварэлі ДД, — ненарматыўная лексыка.



Блізкасьць да Польшчы і Ўкраіны адыграла сваю ролю. ДД аддаюць даніну павагі суседзям у песьнях «Баба Гром» і «Chłopaki z Terespolu». Толькі па-беларуску пакуль не сьпяваюць.

**Сяргей Будкін**

## Музыка XVI—XVIII ст.

Western-European and Belarusian music of XVI—XVIII c.

Заходнеэўрапейская і беларуская музыка XVI—XVIII ст., 2004

Дыск прысьвечаны 450-годзьдзю Рэфармацыі ў Беларусі. Запісы зроблены на канцэртах XII фэстывалю «Адраджэньне беларускай капэлы», які прайшоў у сьнежні 2003 г. У праграму ўвайшлі творы рэфармацкай традыцыі, сьвецкая музыка тае эпохі. Большасьць твораў запісана на CD упершыню: танцы й канцоны з Полацкага і Віленскага «Сшыткаў», творы Войцаха Длугарая і Валянціна Бакфарка. Кальвініцкая музычная традыцыя рэпрэзэнтавана нясьвіска-берасьцейскімі «Песьнямі хвалы Боскай» Вацлава з Шамотул і слыннай Жэнэўскай псальмай «Наша хвала Табе, Божа». На дыску таксама музыка Гайнрыха Шуца, Самуэля Шайта, Андрэаса Хамэршміта (XVII ст.) і вялікага Ёгана Сэбасьцьяна Баха. Выканалі гэтую праграму ансамбль салістаў «Клясык-Авангард» і Дзяржаўны камэрны хор, а таксама салісты Валеры Жывалеўскі (гітара), Віктар Скорабагатаў, Янаш Нялепа, Раіса Шытава і інш. Знайсьці кампакт-дыск «Беларускае — Эўрапейскае» можна на сядзібах БНФ і ТБМ.

**АФ**



## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Акулін Э. Непрычалены човен:** Вершы й баляды. — Менск, 2003. — 80 с. 500 ас.

Паэт і бард, папярэдняя кніга якога так і не дайшла да чытача — увесь наклад пайшоў пад нож, — выдаў новы зборнік. Сюды ўключаныя разьдзелы «Зрэбнае рэха», «З чужога неба» (пераклады зь літоўскай і ўкраінскай паэзіі) і «Пакуль ляцім». Пытайцеся на кніжнай выставе ў ТБМ.

**Беларуская дзіцячая літаратура:** Хрэстаматыя: Вуч. дапам. для навучэнцаў пэдаг. каледжаў і вучэльняў / Склад. М.Яфімава, В.Ляшук. — 2-е выд., перапр. і дап. — Менск: Вышэйшая школа, 2003. — 637 с. 3000 ас.

Пацешыць дашкалятаў, адначасна далучаючы іх да беларускіх літаратурных скарбаў, дапамогуць фальклёрныя й аўтарскія творы (Я.Купалы, М.Багдановіча, В.Ластоўскага, Ф.Аляхновіча, У.Дубоўкі, Л.Геніюш, У.Караткевіча й інш.), сабраныя пад адною вокладкаю. Цана блізу 12500 руб.

**Беларуская міталёгія:** Энцыкл. слоўнік / С.Санько, Т.Валодзіна, У.Васілевіч і інш. — Менск: Беларусь, 2004. — 592 с. 3000 ас.

Цана ў кнігарнях 9500 руб.

**Беларусь:** Фотаальбом / Аўт.-склад. Дз.Раманюк. — 2003. — 64 с. 3200 ас.

Зграбны альбомчык склалі 56 здымкаў — нацыянальныя строі, вышываныя ручнікі, прыродныя замалёўкі, мінулае й сучаснасьць — Беларусь у малым фармаце. Цана каля 17000 руб.

**Зарэцкі М. Вязьмо:** Раман. — Менск: Сталія, 2003. — 304 с. 1000 ас.

Пад мяккай вокладкай — знакаміты раман пра падзеі 1920—1930-х гадоў.

**Карызна У. Выбранае** / Прадм. В.Гардзея. — Менск: Харвест, 2003. — 384 с. 1000 ас.

Кніга выбранага ўключае вершы й песьні з зборнікаў «Край мой сінявокі», «Жураўліны досьвітак», «Сьвятло ліўня» і інш.

**Лепешаў І.** Этымалягічны слоўнік фразэалягізмаў. — Менск: БелЭн, 2004. — 448 с. 2000 ас.

Пашыранае й дапоўненае перавыданьне дзьвюх ранейшых кніжак дасьледчыка. Аўтар прасачыў паходжаньне каля 1750 фразэалягічных адзінак і праілюстраваў іх ужываньне прыкладамі. У «Акадэмкнізе» выданьне каштуе 5620 руб.

**Напярэймы: ад Буга да Варты:** Анталёгія польскай паэзіі XX ст.: У 2 т. / Перакл. А.Лойкі. — Менск: Энцыклапэдыкс, 2003. 1000 ас.

Упершыню ў Беларусі выходзіць анталёгія польскай паэзіі такога аб'ёму: у двух тамах зьмясьціліся каля 180 аўтараў. Сярод перакладзеных Алегам Лойкам твораў — вершы Цыпрыяна Норвіда, Марыі Канапніцкай, Чэслава Мілаша. Цана ў «Акадэмкнізе» 18410 руб.

**Жанчыны Беларусі.** — Менск, 2003. — 224 с. 5000 ас.

Гераіні кнігі — дзяржаўныя, палітычныя, грамадзкія дзяячкі, дыпляматкі, дзяячкі навукі й культуры, кіраўніцы прадпрыемстваў, фірмаў, калгасаў, прадстаўніцы сфэраў адукацыі й аховы здароўя. З ужо надрукаванай кнігі была выкрасьлена Галіна Жураўкова.

**Тацяна Вабішчэвіч, АВ**




КАЛЯЖ АНДРЭЯ ЧЫКА

# Консул Некрашэвіч

Адэса, жнівень 1919. Летнім надвячоркам па Садовай вуліцы, разпораз азіраючыся, ішоў чалавек у капелюшы і цёмных акулярах з акуратнай бародкай і крыху падкручанымі дагары вусамі. Мінуў Рышэльеўскую гімназію і пошту, агледзеўся, задумаўся, зьвярнуў на Дзерыбасаўскую — там было лягчэй згубіцца ў натоўпе. Нават неспрактыкаваны назіральнік мог здагадацца, што чалавек гэты ад некага хаваецца. Даўшы круга дзеля пэўнасьці, ён праз чорны двор увайшоў у кватэрку, якую апошнія два месяцы здымаў у мадам Розы. Мадам Роза сустрэла яго ў дзьвярах:

— Господин консул, уже снимите с глаз ваши очки, они вам портят фигуру. Большевики ушли. У нас, кажется, обратно новая власть.

* * *

І сапраўды, у горадзе відавочна паспакайнела, бальшавіцкія патрулі зьніклі, а неўзабаве зьявіліся новыя гаспадары — вайскоўцы Добраахвотніцкай арміі Дзянікіна. За няпоўны год, што беларускі консул Сьцяпан Некрашэвіч правёў у Адэсе, гэта была ўжо шостая ўлада. Частыя зьмены не спрыялі пашырэньню грамадзка-палітычнай дзейнасьці такой сумнеўнай з гледзішча ўсіх гэтых уладаў установы, як Консулят Беларускай Народнай Рэспублікі.

Лёс занёс Некрашэвіча ў Адэсу ў верасьні 1918-га — калі Ўрад БНР адкрыў новы дыпляматычны фронт ва Ўкраіне. У Кіеве працавала Надзвычайная Дэлегацыя ўраду пад кіраўніцтвам Антона Луцкевіча. У Адэсе дзейнічаў консулят, які займаўся пераважна справамі вайскоўцаў колішніх беларускіх часьцей Румынскага фронту ды шматлікіх уцекачоў. Першыя два месяцы працы консул Некрашэвіч займаўся рэгістрацыяй беларускіх жыхароў Адэсы і выдаваў пропускі тым, хто меў жаданьне выехаць на Бацькаўшчыну.

Аднак ужо ў лістападзе нетрывалае зацішша, якое панавала ў гетманскай Украіне пад нямецкай акупацыяй, было парушанае паўстаньнем украінскіх сацыялістаў. Яно дакацілася і да Адэсы. 12 сьнежня яе заняло войска Дырэкторыі атамана Грэкава. Беларускі консул сам браў непасрэдны ўдзел у адэскіх падзеях. Украінскі аддзел, які заняў Адэсу, на чвэрць быў укамплектаваны зь беларусаў, таемна дасыланых зь ведама Некрашэвіча ва ўкраінскі штаб.

* * *

Аднак сілы ў Дырэкторыі Ўкраінскай Народнай Рэспублікі былі заслабыя. Небясьпечную канкурэнцыю ў барацьбе за ўладу ёй складалі бальшавікі, добраахвотнікі Дзянікіна і інтэрвэнцыйныя войскі саюзьнікаў, якія ад канца лістапада пачалі прыбываць у Адэсу для барацьбы з бальшавізмам. Не прайшло і тыдня, як горад перайшоў пад кантроль войскаў добраахвотніцкага генэрала Грышына-Алмазава і французаў пад кіраўніцтвам генэрала Борыюса. Войска Дырэкторыі склала зброю і пакінула Адэсу. Бальшавікі сышлі ў падпольле.

У гэтым часе ў Адэсу і прыехаў французкі консул Энно. Дзеючы паводле наказу прэм'ера Луцкевіча, Некрашэвіч дамогся аўдыенцыі ды ў сваёй прамове прывітаў яго як прадстаўніка дзяржаваў Антанты і пекнай Францыі, выклаў яму нарыс беларускага нацыянальна-дзяржаўнага адраджэньня і запэўніў, што беларусы маюць моцнае жаданьне як найхутчэй скінуць зь сябе ярмо бальшавізму. На сваё вялікае зьдзіўленьне, Некрашэвіч заўважыў, што консул Энно быў абсалютна не паінфармаваны ў беларускім пытаньні.

* * *

З пачаткам зімы ў Адэсу пачалі прыязджаць удзельнікі гэтак званай Кіеўскай нарады беларускіх грамадзка-палітычных дзеячоў — створанай увосень 1918-га арганізацыі расейскіх афіцэраў манархічнага кірунку. Гэтыя дзеячы, рэй сярод якіх вёў генэрал Аляксандар Бахановіч, прэтэндавалі на галоўную ролю ў беларускім пытаньні. Беларуская Нацыянальная Рада Адэсы, каб пазьбегнуць лішніх канфрантацыяў, утварыла супольны «Беларускі Нацыянальны Цэнтар», куды ўвайшлі прадстаўнікі ўсіх суперных сілаў.

Спачатку праца ў Цэнтры йшла згодна. Была выпрацаваная дэклярацыя на Парыскую мірную канфэрэнцыю, яшчэ адна дэклярацыя была пасланая Дзянікіну. Праблемы пачаліся, калі Некрашэвіч, Бахановіч і былы консул БНР у Кіеве Рыгор Базарэвіч выпраўляліся дэлегатамі на канфэрэнцыю ў Парыж. Бахановіч выступіў з ідэяй: ехаць ад нейкага Цэнтру несалідна. Пакуль Беларусь занятая бальшавікамі і палякамі, а пра законную ўладу нічога не чуваць — трэба арганізаваць свой Беларускі Краёвы Ўрад, з паўнамоцтвамі якога ня сорамна будзе паказацца і ў Парыжы.

* * *

Сьцяпан Некрашэвіч, верны законнаму ўраду БНР, рашуча запярэчыў. З падтрымкай большасьці Цэнтру дэлегацыя ў Парыж была перабраная, а Бахановіч «за неблаговидные поступки» — выключаны з усіх беларускіх арганізацыяў. Дэлегацыя ад Цэнтру тут жа наведала камандзіра французскіх інтэрвэнцыйных аддзелаў генэрала Д'Ансэльма. Той прыняў яе вельмі прыязна і заявіў, што ва ўсіх беларускіх пытаньнях будзе лічыцца толькі з Цэнтрам. Дарэчы, беларусы мелі ў французскіх калідорах і сваё лобі: у складзе французскай вайсковай місіі на той час працаваў Аўген Ладноў, якому яшчэ будзе наканавана адыграць сваю ролю ў беларускай палітычнай драме.

Тым часам Бахановіч не сядзеў склаўшы рукі. У канцы студзеня 1919-га ён нечакана наведаў Беларускі Цэнтар і зачытаў нейкую паперчыну, у якой казалася, што ў Слоніме зьезд прадстаўнікоў усіх губэрняў Беларусі даручыў Гарадзенскаму камітэту аб'яднаных грамадзянскіх арганізацыяў (Бахановіч быў яго старшынём) сфармаваць Урад і Камітэт утварыў дырэкторыю зь пяці асобаў на чале з Бахановічам.

Консул Некрашэвіч даслаў рэзкі ліст у адэскія газэты, дзе заявіў, што адзінай законнай уладай у Беларусі застаецца ўлада Беларускае Рады, абранай Усебеларускім зьездам у 1917 г. Падобныя заявы былі пададзеныя французам, украінскай місіі, кубанскай дэлегацыі, грузінскаму консулу ды іншым, у выніку чаго перад Бахановічам паступова зачыняліся ўсе дзьверы. Тым часам у Адэсу прыехаў сябра Рады БНР Яўхім Бялевіч і прывёз доўгачаканыя весткі пра Раду і ўрад. Правакацыя Бахановіча правалілася.

* * *

Спакойнае існаваньне працягнулася нядоўга. 20 лютага 1919 г. баевікі адэскага аддзелу «чорнай сотні» разграмілі за «нярускасьць» сядзібу беларускай культурнай арганізацыі «Гай», бежанскі камітэт і беларускі каапэратыў. Маёмасьць каапэратыву была падзеленая паміж салдатамі, бібліятэка спаленая, а супрацоўнікі Камітэту арыштаваныя й перапраўленыя ў дзянікінскую контрвыведку на падставе падазрэньня ў бальшавізьме. Аднак неўзабаве ўлады навялі парадак: расфармавалі чарнасоценскі аддзел, арыштаваўшы галоўных завадатараў.

Гэты інцыдэнт навёў беларускага консула на думку пра сваю вайсковую сілу. Было пастаноўлена зьвярнуцца ў гэтай справе да французаў. Галоўны камандзір французскіх войскаў на Ўсходзе генэрал Бэртэлё прыняў Некрашэвіча і палкоўніка Паўла Вэнта, тыя прасьвяцілі яго ў беларускім пытаньні, падаравалі карту Беларусі, за якую ён шчыра дзякаваў. Дэлегаты прасілі дазволу на фармаваньне беларускіх часьцей. Бэртэлё, насуперак пратэстам дзянікінскага камандаваньня, даў згоду і прызначыў галоўным інспэктарам у гэтай справе ўкраінскага генэрала Сакіра-Яхантава. Непасрэдна фармаваньнем першай беларускай дывізіі займаўся Вэнт, які зьнекуль меў ад Ураду паперу, што ён — начальнік штабу арміі БНР.

* * *

Калі ў дывізіі набралася каля тысячы чалавек, французы і добраахвотнікі пачалі пакідаць Адэсу перад наступам чырвоных. Мелася адступіць і беларуская дывізія, але палкоўнік Вэнт, скарыстаўшы момант, перайшоў на бок бальшавікоў і застаўся ў Адэсе. З дапамогай беларускай камуністычнай партыі Вэнт легалізаваў сваё войска і пачаў фармаваньне 1-й беларускай савецкай брыгады. За брыгадаю зацьвердзілася слава прыхавана контррэвалюцыйнай часьці, і туды паваліла белае афіцэрства. Неўзабаве брыгада налічвала да 10 тыс. байцоў. Ідэйныя беларусы надумалі скарыстаць гэтую сілу, каб вызваліць Менск ад маскоўскіх камісараў. Дзеля гэтае патрэбы ў бальшавіцкі Менск быў адмыслова пасланы Антон Баліцкі. Аднак менскія ўлады на перавод войска ў Беларусь не наважыліся. Тым часам у брыгадзе адбыўся прыкры інцыдэнт: Вэнт бяз суду застрэліў чырвонаармейца, за што трыбунал пастанавіў адправіць палкоўніка на фронт. Але ў Адэсе якраз пачалося паўстаньне атамана Грыгор'ева. Вэнт далучыўся да яго. Паўстаньне скончылася пагромам і стралянінай у горадзе. Галоўных завадатараў арыштавалі і расстралялі, беларускую брыгаду пераназвалі ў брыгаду імя таварыша Леніна і выправілі на фронт, а палкоўнік Вэнт зьнік немаведама куды.

* * *

Вайсковы трыбунал дакапаўся да Некрашэвіча — галоўнага арганізатара антысавецкай дывізіі. Давялося доўгі час хавацца. Калі справа брыгады трохі прыціхла, ён пачаў паўлегальна працаваць у беларускіх культурна-прасьветных арганізацыях. Насіў цёмныя акуляры, асьцярожна азіраўся на вуліцах, хаваючыся ад бальшавіцкіх патрулёў. З адыходам бальшавікоў непасрэдная пагроза жыцьцю мінула, аднак новая ўлада — добраахвотніцкая армія Дзянікіна — вырашыла скончыць гульню ў дэмакратыю і самавызначэньне народаў. Галоўнакамандуючы генэрал Шылінг зачыніў грузінскі консулят, прадстаўніцтвы іншых краінаў, а Дзянікін нават не прыняў дэлегацыі ад Латвіі, сказаўшы, што такой краіны ня ведае. Болей беларускаму консулу ў Адэсе не было чаго рабіць.

* * *

Сьцяпан Некрашэвіч замкнуў памяшканьне консуляту, сабраў свае сьціплыя валізкі і выправіўся ў дарогу — напачатку ў Кіеў, а адтуль у Камянец, дзе пры ўрадзе Ўкраінскай Народнай Рэспублікі знаходзілася беларускае пасольства. Ад Кіева да Камянца давялося ісьці і ехаць 19 дзён у нялюдзкіх умовах, прабіраючыся праз бальшавіцкі фронт па сьнезе і марозе. Прыехаўшы 13 лістапада ў Камянец, ён захварэў на тыф. Вылечыўся ўжо ў Варшаве, куды й сам ня памятаў, як трапіў. Так скончыўся сон даўжынёю ў год. Займаўся новы, золкі і неспатольны дзень.

**Сяргей Шупа,**
**радыё «Свабода»**

# Ад «бураціны» да «званочка»

## Мужчынскія тыпы на жаночым слэнгу

Пра розьніцу паміж жаночым і мужчынскім маўленьнем загаварылі яшчэ ў XVII ст., калі эўрапейцам стала вядомае вэстіндыйскае племя караібаў, у якім прадстаўнікі супрацьлеглых полаў карысталіся рознымі мовамі. У 1970-я да справы падключыліся фэміністкі ад мовазнаўства, якія рашуча змагаліся з «патрыярхальнай карцінай сьвету» і стэрэатыпам жаночага маўленьня як «алягічнага буянства памяншальна-ласкальных суфіксаў». Мода на гендэрную тэматыку пакрысе сыходзіць, а народная сьвядомасьць як дзяліла, так і дзеліць моўныя акты на «мужчынскія размовы» і «бабскую балбатню». Да таго ж, стоячы ў чарзе да таксафона, не адзін хлопец можа адчуць сябе караібам, пачуўшы, што на *Нямізе выкінулі файнюткія шкорыкі* і там былі нішто сабе *басаны*, што *Марынчын новы лапушка і немагчымы душка*, што *паехаць* можа ня толькі дах, але і *калготкі*, што няма больш важных справаў, чым адсутнасьць *дзялоў,* а *падводка* — гэта ня К-19, а сродак, які вымагае вышэйшага пілятажу ў майстэрстве *тынкаваньня*.

Каб даць шаноўнаму чытачу ўяўленьне пра мысьленчыя катэгорыі шаноўных чытачак, аўтарка склала невялічкі слоўнічак мужчынскіх тыпажоў — самую аўтарытэтную клясыфікацыю, прынятую ў буфэтах дзявочых факультэтаў, кабінэтах манікюрніцаў і дамскіх залях цырульных салёнаў.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Акучваць** каго-н. — тонка, неназойліва фліртаваць. Жаночы спосаб заляцаньня. Г.зн. не ісьці ў атаку самой, а правакаваць на залёты *Яго*. Ня лезьці ў суседзкі сад па клубніцы, а старанна апрацоўваць сваю дзялку. Мо нешта і вырасьце.

**Ахамутаць** (альбо **акальцаваць**) галубочка — выйсьці за яго замуж.

**Бураціна** — часта апроч сваіх чатырох сольда ён мае нетутэйшы акцэнт у расейскай мове і замежны пашпарт. Некаторыя з нашых дзяўчатак, што *зажыгаюць* з *бурацінамі*, лічаць дружбу народаў сродкам бесьперашкоднага *буцікаваньня* і *шопінгу*, але нашае ім фе і ганьба!

**Бык** — юнак з накачанымі вазэлінам цягліцамі й зьвілінай, што праступае на задумлівым ілбе. Яго ўнутраны сьвет вызначаецца культам уласных першасных полавых прыкметаў. Як усе прадстаўнікі віду, **быкі** вядуцца на чырвоную памаду і мільгаценьне кароткай спадніцы. Прынцыпова нерамантычныя. Іхныя «цёлкі» час ад часу пазіраюць на іх сумнымі каровінымі вачыма, у якіх стаіць нямое пытаньне: «А пацалаваць?»

**Герой-любоўнік** — такі сабе савецкі *мача* a la Карачанцаў, Баярскі і іншыя матуліны куміры. Сказаўшы пра кагосьці так, у думках звычайна дадаюць: «Не майго раману».

**Ён** — сынонімам гэтага кароткага, але ёмістага слоўка можа быць хіба «той-без-каго-я-немагу-жыць-у-дадзены-адцінакчасу». Пішацца зь вялікай літары. Вымаўляецца са значэннай інтанацыяй. Sms-ка зьместу YON PATELEFANAVAU не выклікае ніякіх пытаньняў — *хто* — і зьяўляецца прычынай непадробнай радасьці ўсіх тваіх блізкіх сябровак.

**Жанацік** — з іроніі лёсу *ахамутаны* кімсьці іншым. Гэтае азначэньне становіцца паміж вамі сваёй разгалістай літарай «ж» і заўсёды азначае сяброўскія стасункі. Ну, амаль заўсёды…

**Зажыгаць** — прыемна бавіць час, на гэты самы час забываючыся.

**Лыцар** — абраўшы цябе сваёй Прыўкраснай Паннай, ён дзеліць свой час паміж узьвядзеньнем вашага замку і дасыланьнем даўгіх мілосных мэйлаў на тваю скрыню. Прадавачкі кветак ведаюць яго па імені. У твой гонар ён зьдзяйсьняе перамогі ў сваёй прафэсійнай сфэры і мужна трывае град суседзкіх памідораў, пеючы сэрэнады пад вокнамі тваёй хрушчоўкі. Такіх мала, адзін на пяць мільёнаў. Таму, паводле жаночай лёгікі, імавернасьць спаткаць *лыцара*, як у анэкдоце пра дыназаўраў, — 50%: альбо спаткаеш, альбо не.

**М-м-м-м, macho** — ён вабіць да сябе нават не таму, што падобны на Антоніё Бандэраса, — проста побач зь ім пачуваешся Джэніфэр Лопэз. Але перад тым як пачаць *акучваньне*, варта празандаваць глебу: у рэальнасьці *мача* можа аказацца сваім амографам, калі ня чым яшчэ горшым.

**Папік** — дасьведчаны і бывалы мужчынка, які апякуецца маладзенькімі дзяўчаткамі як духоўна, так і матэрыяльна. Дзевачкі *папіка* шануюць, любяць і часам пытаюцца ў яго: «Як жыць?» *Папік* у гадох почасту атрымлівае сакрэтную мянушку *Старыкевіч.*

**Прынц** — незалежна ад таго, якую зь дзьвюх дзяржаўных моваў ужывае паненка, вымаўляецца зь цьвёрдым «р». Прынц зазвычай мае карону, што спаўзла на вушы, і мантыю ў плямах ад яечні, але лічыць, што ён на белым кані. Нашыя жанкі непапраўныя рэалісткі, таму пры зьяўленьні на даляглядзе *прынца* задуменна цытуюць: «Так, конь ужо ёсьць»…

**Хлопчык-званочак.** На выгляд ім 18—22. Падобныя да made in the UK плюшавых мядзьведзікаў, што выклікаюць неадольнае жаданьне паціскаць-палюляць іх і перад сном пасадзіць на тумбачку. Усё ў іх ахайнае і дагледжанае — нават зацёртыя швэдры і трохдзённая няголенасьць. Яны падабаюцца нашым матулям, а бабулі ад іх проста шалеюць. Часта *шыфруюцца* пад інтэлектуалаў. Арыентацыю маюць традыцыйную, але мажлівы варыянт бі-. Невыпраўныя піжоны.

**Шопіць і буцікаваць** — прыемна бавіць час, рацыянальна скарыстоўваючы сумленна нажытыя *бурацінам* грошы.

**Шыфравацца** — паводзіцца надзвычай хімэрна і няўцямна, хаваючы сваю сапраўдную сутнасьць. Чым больш аб'ект шыфруецца, тым мацнейшае жаданьне падабраць шыфр.

…Але ўсё гэта, зрэшты, ня вельмі істотна. З намі заўсёды можна паразумецца. Калі мы захочам.

**Марыйка Мартысевіч**

Аўтарка шчыра дзякуе сяброўкам Наталцы, Юльцы, Касі і Міле, а таксама пошукавай сыстэме «Google» за дапамогу ў падрыхтоўцы матэрыялу.

18 сакавіка, на Дзень сьвятога Патрыка, на гістфаку БДУ (вул.Кірава, 28) адбудзецца абмеркаваньне на тэму «Разуменьне вольнасьці ў мэнталітэце ірляндцаў і беларусаў». Запрашаем усіх ахвотных. Пачатак а 18-й.

## «ARCHE» ў новым дызайне




Штодвухмесячнік «ARCHE» адзначыў уласнае пяцігодзьдзе зьменай дызайну і структуры. Рэдактар часопісу Валер Булгакаў піша ў прадмове, што «гэта падкрэсьліць яго ўнутраную эвалюцыю ў кірунку грамадзка-палітычнага выданьня, нацэленага на прадукаваньне ідэй».

Гарачую дыскусію выкліча рэдакцыйны артыкул «Вузкія месцы дыяспары», прысьвечаны дасьледаваньням эміграцыі, эміграцыйнае літаратуры і, шырэй, мэтадалёгіі сучаснага беларускага літаратуразнаўства.

«Страшны сон расейскамоўных лібэралаў» — так завецца рэцэнзія Віталя Сіліцкага на кнігу Леаніда Злотнікава. «Пуцінская пастка» — гэта артыкул Робэрта Котрэла. Даніла Жукоўскі зьмяшчае культурную аналітыку «Ў лябірынце з постмадэрністам».

У падборцы падарожных і эміграцыйных нарысаў беларускія аўтары пішуць пра Іран, Фінляндыю і ЗША.

Літаратурную частку часопісу адкрывае Альгерд Бахарэвіч з новым апавяданьнем «З вышыні». Вольга Гурская ажыўляе фантом шырока папулярнага ў вузкім коле літаратурных гурманаў канца 90-х Прафэсара Каркарана. Тамсама — пераклады з Павіча, Курэйшы, проза Марыі Вайцяшонак і Тацяны Барысік, вершы Розы Аўсьлендэр.

## Новы «Дзеяслоў» зь дзёньнікамі Быкава




Восьмы нумар «Дзеяслова», што днямі пабачыў сьвет, працягвае друкаваць «невядомага Быкава». Пасьля аповесьці «Аўганец» часопіс друкуе дзёньнікавыя запісы пісьменьніка — «Парадоксы жыцьця», аздобленыя малюнкамі аўтара. Сьціслыя замалёўкі, у кожнай — сюжэт на апавяданьне ці аповесьць. Ёсьць тут і звыклы Быкаў з «акопнай праўдай», і Быкаў канца 90-х зь нечаканымі прыпавесьцямі: «Ён быў прарок і вёў за сабой іншых. За ім ішлі. Яму верылі. І ён вучыў боскаму. Бо і сам быў паўбогам. Аднак іншыя ня ведалі, што ён бесьсьмяротны, а яны сьмяротныя. Прыйшоў крызысны час, яны загінулі. А ён пайшоў вучыць іншых. Боскае праўдзе. Высокаму і добраму. Ён мог сабе тое дазволіць».

У «Дзеяслове» багата й іншай мастацкай літаратуры: Гілевіч, Дранько-Майсюк, Сільнова, Сьцяпан… Зь немастацкіх тэкстаў найцікавейшы — «Зорны кантэкст для «Пагоні», напісаны Пётрам Васілеўскім. Гербы клясычныя, гербы-гібрыды, гербы-мутанты, гербы-наватворы й нават геральдычны «гіт» канца XX ст. — кантэкст, у які памяшчаецца беларуская геральдычная традыцыя.


## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Віншую** сп.Алеся Пушкіна і яго жонку Яніну з нараджэньнем сыночка. Пані Людміла Л.

### КАНТАКТЫ

**Уладальніку паляўнічага сабакі**. А ці можна ў больш зручны час? У зручным месцы і без сабакі? Бо страшна…

**Беларусцы (не па пашпарце)** прапаную сумеснае сямейнае жыцьцё. Пачынаю гаспадарыць на зямлі. Уладзімер Хахлун (34 гады), в.Кавалі, 211926, Шаркаўшчынскі р-н

**Яснавяльможны пане!** На Ваш ліст чакае гожая ліцьвінка 26-ці гадоў. А/с 29, 220088, Менск

**21 сакавіка** запрашаем на Купалавы чытаньні да Дня БНР. Пачатак а 14-й каля помніка Паэту. Жыве Беларусь

**23 сакавіка** а 17-й у Скарынаўскім цэнтры вечарына памяці «З Каліноўскім у сэрцы» і выстава суполкі «Пагоня». Запрашаем паэтаў, песьняроў, мастакоў, публіку. Пагонічы

**Шукаю інфармацыю** пра менскія футбольныя фан-клюбы; шукаю заўзятараў! Bramnik. E-mail: goalkiper@tut.by

**Мой 25-гадовы юбілей** — нацыянальнае сьвята, бо я — нацыяналіст. Запрашаю ўсіх на вясковую п'янку ў красавіку. (029) 668-16-98, (029) 772-82-66 або SMS пераважна ўвечары, ноччу, а ў выходныя — кругласуткава. Сяржук

### КНІГІ, МУЗЫКА

**Беларускамоўную літаратуру** (творы сучасных беларускіх аўтараў, сусьветную і расейскую літаратуру) набуду. 229-58-19, Каця

**Набуду тлумачальны слоўнік** беларускай мовы ў 5 тамах, Менск, 1977—84 г. Ганна. Койданава (01716) 5-78-83

**Беларускія часопісы**, кнігі, а таксама музыка і відэа ў Берасьці. Т.: (029) 727-44-83

**Новыя ды рэдкія кнігі**, відэа, аўдыё, CD, шаўроны, значкі, часопісы, кашулі, календары на Румянцава, 13 (ТБМ) ля Лінгвістычнага ўнівэрсытэту. Штодня, акрамя выходных, з 13.30 да 19-й

### НАБУДУ

**Узнагароды БНР**, БЦР, БКА, ген.Булак-Балаховіча, манэты ВКЛ, Рэчы Паспалітай. (029) 722-46-04

**Набуду (абмяняю) часопісы** «За рулём» 70—80 г. 234-79-17, twoserge@mail.ru, Сяргей

### ПРАЦА

**Шукаю працу** сярод беларусаў (ці ляяльных). Радыёінжынэр. Уладзімер. Т.: 279-67-14 (пасьля 19-й)

**Шукаю працу**, маю юрыдычную адукацыю, валодаю кампутарам. (029) 657-54-63. Калінін Мікалай

**Продаж, наладка** кампутараў. Установка праграмаў. Саша. Т.: (029) 615-04-30

**Сур'ёзны бізнэс** альбо дадатковы заробак. Без грашовае рызыкі. Тэлефануйце! (029) 766-12-79. Зьміцер

Наша Ніва КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

**Тэкст** ____________________

____________________

**Імя і прозьвішча** ____________________

**Адрас, тэлефон** ____________________


## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Уладзімеру Л. зь Менску.** Мы ня мелі падставаў не давяраць вядомым асобам Беларусі, якія знаілі Яндарбіева асабіста. У любым разе, гэта была значная постаць і чалавек, пэўным чынам зьвязаны з нашай краінай. Вашага водгуку друкаваць ня будзем, бо, як бачым зь яго, Вы не да канца ведаеце цяперашнюю сытуацыю ў Чачэніі і яе передгісторыю, а таксама некрытычна пакладаецеся на расейскія інфармацыйныя крыніцы. Пытаньне салідарнасьці з чачэнскім народам, які змагаецца за нацыянальную незалежнасьць, важнае для «НН».

**Уладзімеру М. з Чэрцаў.** Апавяданьне сапраўды часопіснае. Перадамо яго ў «Дзеяслоў».

**Ігару Х. зь Менску.** Газэтны фармат не дазваляе ў поўным аб'ёме друкаваць падрабязныя грунтоўныя дасьледаваньні. Аднак гэта ня значыць, што патрэбы імі займацца няма. Скантактуйцеся з часопісам «Arche»: а/с 3, 220018, Менск-18; e-mail: arche@arche.org.by. Там Ваша аналітыка можа быць запатрабавана.

**Н.К. зь Менску.** У артыкуле пра канцэрт А.Шадзька за кампліментамі артыст слаба відаць. Матэрыял разьлічаны перадусім на тых, хто ведае і слухае гурт «Сястра». Пісаць у «НН» у якасьці журналіста магчыма, але тады трэба рабіць гэта на прафэсійнай, г.зн. рэгулярнай аснове, зьвязаўшыся з Рэдакцыяй.

**Сержуку Г. з Магілёва.** У артыкуле было багата рэчаў, якія ня тычыліся непасрэдна абранай Вамі праблемы. Скажам, магчымасьць шантажу з дапамогай дакумэнтаў з праблемамі пашпартызацыі ня зьвязаная. Пішэце яшчэ.

**Сержуку Г. зь Менску.** Фэльетон ня ўдаўся. Чытаеш — і цяжка зразумець, калі гэта пісалася і пра які час. Фэльетон мусіць ускрываць праблему і рабіць гэта яскрава. Спрабуйце яшчэ.

**Андрэю Дз. з tut.by.** Камэнтары ў «НН» звычайна пішуцца або штатнымі супрацоўнікамі, або на замову Рэдакцыі. Пісаць у «НН» у якасьці журналіста магчыма, але тады трэба рабіць гэта на прафэсійнай, г.зн. рэгулярнай аснове, зьвязаўшыся з Рэдакцыяй.


Наша Ніва
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фота-рэдактар | Арцём Лява |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 3529. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 22.00 18.03.2004.

Замова № 1633.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а